ЗБОРНІК ПРАЦ
ВЫПУСКНІКОЎ-ПАЛІТОЛАГАЎ ЕГУ

# ПАЛІТЫКА І ГРАМАДСТВА Ў БЕЛАРУСІ

ГОД 2018
(ВЫПУСК 3)

ЕHU
Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт

KONRAD ADENAUER STIFTUNG

УДК 32(476)(082)
П 14
**Палітыка і грамадства ў Беларусі. Зборнік прац выпускнікоў-палітолагаў ЕГУ. Год 2018, выпуск 3.**

**Навуковая рада:** Андрэй Сцяпанаў, PhD; Таццяна Чуліцкая, PhD; Уладзіслаў Іваноў, PhD
**Рэдактура, карэктура і пераклад:** Алена Лянкевіч, Канстанцін Ткачоў, Кевін Рэйлінг
**Дызайн і вёрстка:** Ігар Назаранка
**Адказная за выпуск:** Дар’я Трус

П 14
Палітыка і грамадства ў Беларусі. Зборнік прац выпускнікоў -палітолагаў ЕГУ. Год 2018, выпуск 3.
Год 2018, выпуск 3./ Пад рэд. Іванова У., Сцяпанава А., Чуліцкай Т.– Вільня: ЕГУ, 2018. – 82 с.

Дадзеная публікацыя з’яўляецца сумесным праектам паліталагічных праграмаў Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта і Беларускага офіса Фонда Конрада Адэнаўэра. Публікацыя ажыцяўляецца пры фінансавай падтрымцы Фонда Конрада Адэнаўэра. Поўную адказнасць за факты і погляды, прадстаўленыя ў публікацыі, нясуць аўтары тэкстаў. Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт і Фонд Конрада Адэнаўэра не нясуць адказнасці ні за інфармацыю, што змяшчаецца ў гэтай публікацыі, ні за яе далейшае выкарыстанне.
УДК 32(476)(082)

ISBN 978-609-8220-06-3 (электронная версія)
ISBN 978-609-8220-08-7 (друкаваная версія)

ПРАДМОВА..........4

**Барышнікаў Георгій**
КАРЭЛЯЦЫЯ ПАМІЖ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМІ ЗМЕННЫМІ І КОЛЬКАСЦЮ ПРАТЭСТАЎ НА БЕЛАРУСІ..........5

**Гайдук Вольга**
РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЛІТЫКІ ПАМЯЦІ ПРАЗ СІСТЭМУ АДУКАЦЫІ Ў ПЕРАХОДНЫ ПЕРЫЯД У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ (1991 – 2001)..........22

**Кацупалава Марыя**
РЭПРАДУКАВАННЕ ПРАСТОРЫ ГВАЛТУ Ў ДЫСКУРСЕ РАСЕЙСКІХ МЕДЫЯЎ ПРА ЗНЕШНЮЮ ПАЛІТЫКУ АДНОСНА УКРАІНЫ (2014-2017)..........41

**Прыходзька Вераніка**
АНАЛІЗ СІСТЭМЫ АБАВЯЗКОВАГА ПРАФЕСІЙНАГА РАЗМЕРКАВАННЯ ЯК ІНСТРУМЕНТ РЭГУЛЯВАННЯ РЫНКУ ПРАЦЫ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ..........53

**Шапуцька Тацляна**
АНАЛІЗ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ІНСТЫТУТАЎ НА ПРЫКЛАДЗЕ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У 2006-2016 ГГ..........65

ПАЛІТАЛАГІЧНЫЯ ПРАГРАМЫ ЕГУ..........78

ФОНД КОНРАДА АДЭНАЎЭРА, ПРАДСТАЎНІЦТВА ПА БЕЛАРУСІ..........80

# ПРАДМОВА

Палітолагі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (ЕГУ) сумесна з Беларускім прадстаўніцтвам Фонда імя Конрада Адэнаўэра рады прадставіць вам сумесны зборнік прац выпускнікоў і студэнтаў паліталагічных праграм ЕГУ. Гэта ўжо трэцці выпуск такога кшталту, у якім мы імкнемся пазнаёміць зацікаўленую аўдыторыю з аналізам палітычных падзей, інстытутаў, публічнай палітыкі і, у больш шырокім сэнсе, палітычнай сферы Беларусі.

Разам з тым дадзены зборнік атрымаўся даволі разнастайным па тэматыцы. Аўтары і аўтаркі разглядаюць шырокі спектр тэмаў, сярод якіх: пратэстная актыўнасць і палітычныя партыі ў Беларусі, а таксама дзве тэмы, якія па-рознаму звязаны з сістэмай вышэйшай адукацыі – палітыка памяці і прафесійнае размеркаванне беларускіх выпускнікоў. Таксама не гледзячы на тое, што мэтай нашага зборніку з'яўляецца папулярызацыя ведаў пра Беларусь, з улікам актуальнасці для нашай краіны тэмы мы палічылі магчымым уключыць адзін артыкул, прысвечаны аналізу расейскіх медыя ў адносінах да ўкраінскіх падзей.

Зборнік прызначаны перадусім для еўрапейскіх і беларускіх палітыкаў, актывістаў, палітолагаў, а таксама для ўсіх тых, хто цікавіцца альтэрнатыўнай ведай аб Беларусі.

Мы спадзяемся, што прапанаваныя артыкулы будуць цікавымі для вас і дазволяць больш даведацца пра нашу краіну і яе сучасную палітычную сітуацыю.

# КАРЭЛЯЦЫЯ ПАМІЖ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМІ ПЕРАМЕННЫМІ І КОЛЬКАСЦЮ ПРАТЭСТАЎ НА БЕЛАРУСІ

Аўтар[1]: **Барышнікаў Георгій**, студэнт 4-га курсу сумеснай праграмы Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта і ўніверсітэта Вітаўта Вялікага “Сусветная палітыка і эканоміка”

## АНАТАЦЫЯ

Артыкул апісвае даследаванне, галоўнай мэтай якога з’яўляецца вызначэнне карэляцыі паміж некалькімі сацыяльна-эканамічнымі паказчыкамі Беларусі (курс валют, сярэдні заробак, індэкс спажывецкіх цэн) і пратэстнай актыўнасцю беларускіх грамадзян. Пераменныя для аналізу адабраныя адмыслова – яны разглядаюцца ў якасці найбольш важных для насельніцтва Беларусі. Метадамі даследавання з’яўляюцца статыстычны аналіз і мадэляванне. Згодна з праведзеным даследаваннем, карэляцыя паміж пераменнымі існуе, як мінімум, у рамках двух з трох фактараў, аднак моцна залежыць ад затрымкі ў часе і такой дадатковай пераменнай як выбары, якія ва ўмовах Беларусі з’яўляюцца галоўнай палітычнай падзеяй.

Выяўленне карэляцыі паміж курсам валют, сярэднім заробкам і індэксам спажывецкіх цэн, а таксама ўмовамі пратэстнай актыўнасці грамадзян Беларусі можа стаць падмуркам для будучага даследавання на тэму пратэстнага патэнцыялу беларусаў у розных сацыяльна-эканамічных умовах, прымаючы за гіпотэзу тое, што сацыяльныя і палітычныя хваляванні на Беларусі не з’яўляюцца стыхійнымі. Таксама яно дае глебу для прагнозу палітычных падзей на Беларусі. Але паколькі карэляцыя не азначае прычыннай сувязі, гэты артыкул прадстаўляе толькі папярэднія высновы.

## КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ:

Беларусь, пратэсты, эканоміка, масавыя сходы, грамадскае непадпарадкаванне, статыстыка.

1 - Падзяка за збор дадзеных і іх першасны аналіз:
Дзядку Мікалаю, студэнту 4-га курсу сумеснай праграмы Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта і ўніверсітэта Вітаўта Вялікага “Сусветная палітыка і эканоміка”

## УВОДЗІНЫ

Згодна са звесткамі арганізацыі “Freedom House” (Freedom House 2018), Рэспубліка Беларусь з’яўляецца кансалідаваным аўтарытарным рэжымам. Беларуская канстытуцыя гарантуе свабоду сходаў, але на практыцы існуюць абмежаванні адносна пратэстаў і палітычнай актыўнасці (Freedom House 2018). У выніку, палітычная актыўнасць і, сярод іншага, палітычныя пратэсты ў Беларусі займелі нечаканыя формы і вынікі. Шмат якія пратэсты розных тыпаў і інтэнсіўнасці па ўсёй краіне праводзіліся апошнія некалькі гадоў адносна асобных палітычных падзей, такіх як выбары, падаткі на “сацыяльных утрыманцаў” і г. д. (Makhovsky 2017; Чыжова 2016). Тыповым спосабам для недэмакратычных рэжымаў дзяржаўныя медыі асвятлялі пратэстныя дзеянні такім чынам, што гэта нагадвала прапаганду, вынікам чаго стала зніжэнне даверу да медыяў (Freedom House 2018). У той жа час, даследаванні ў сферы палітычных пратэстаў маюць абмежаваны характар. Адным з выключэнняў з’яўляюцца штогадовыя справаздачы нацыянальнага аналітычнага цэнтра “Палітычная сфера”, якія ўключаюць усе тыпы палітычнай актыўнасці з якаснага і колькаснага пунктаў гледжання (Чыжова 2014; Чыжова 2015; Чыжова 2016). Гэты артыкул ставіць сабе за мэту зрабіць унёсак у даследаванні ў гэтай сферы, хоць артыкул і прадстаўляе эмпірычнае даследаванне толькі аднаго выпадку.

Згодна з шырока распаўсюджаным лагічным дапушчэннем, сацыяльная пратэстная актыўнасць звязаная з незадаволенасцю людзей сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі. Здаецца трывіяльным сцвярджаць, што, калі ў людзей менш грошай і матэрыяльных каштоўнасцей, яны больш імаверна паўстануць супраць улад і будуць пратэставаць, таму што ўлады прымаюць рашэнні і яны адказныя за канструяванне сацыяльнай, палітычнай і эканамічнай рэальнасці. Аднак рэальная карэляцыя паміж гэтымі двума фактарамі не такая дакладная і павінна вывучацца ў кожным асобным выпадку. Мэтай артыкула з’яўляецца вывучэнне карэляцыі паміж сацыяльнай, эканамічнай і палітычнай пратэстнай актыўнасцю ў Беларусі ў перыяд 2013–2015 гг. і асноўнымі эканамічнымі параметрамі, што вызначаюць узровень дабрабыту: а) сярэдні заробак; b) курс абмену беларускага рубля; і с) індэкс спажывецкіх цэн.

Артыкул мае наступную структуру: па-першае, аўтар апісвае тэарэтычныя асновы даследавання і тлумачыць такія канцэпцыі як палітычны ўдзел і тыпы палітычнай актыўнасці; па-другое, аўтар прэзентуе тыповыя характарыстыкі беларускай пратэстнай актыўнасці, вызначаючы абмежаванні і альтэрнатыўныя

шляхі правядзення даследаванняў. Затым аўтар прапануе гіпотэзу, прэзентуе магчымыя вынікі эмпірычнай часткі аналізу і абмяркоўвае метадалогію даследавання са звесткамі для мадэлявання і тлумачэннем працэсу збору звестак і выніковай статыстычнай мадэлі. У апошніх двух раздзелах разглядаюцца вынікі эмпірычнага даследавання і падаецца заключэнне.

## ПАЛІТЫЧНЫ ЎДЗЕЛ І ПАЛІТЫЧНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ

Пытанні палітычнага ўдзелу ў недэмакратычных краінах разглядаюцца ў якасці важных для кантэксту даследавання. Маклоскі (McClosky 2008) і Мерола (Merrola 2008) апісваюць розныя тыпы палітычнага ўдзелу ўвогуле. Аднак адносна гэтага артыкула асаблівую важнасць маюць даследаванні Махоўскага (Makhovsky 2017) і Чыжовай (Чыжова 2014, Чыжова 2015, Чыжова 2016), якія вывучаюць праблему палітычнага ўдзелу і пратэстнай актыўнасці ў Беларусі.

Аднак да абмеркавання гэтага даследавання трэба даць азначэнне палітычнага ўдзелу. Маклоскі сцвярджае, што палітычны ўдзел звязаны з добраахвотнай дзейнасцю, праз якую члены грамадства ўдзельнічаюць у выбары кіраўнікоў і наўпрост ці ўскосна ў фармаванні публічнай палітыкі (McClosky 2008). Мерола (Merolla 2008) цытуе азначэнні Вербы і Ная, у якіх палітычны ўдзел уключае дзейнасць прыватных асоб, якая больш ці менш накіраваная на выбар дзяржаўных кадраў і/ці іх дзеянняў. Абодва гэтыя азначэнні карысныя для гэтага даследавання. Тым не менш, Мерола і Маклоскі азначаюць розныя формы палітычнага ўдзелу ўвогуле. Паводле гэтых аўтараў, палітычны ўдзел мае розныя формы, такія як непасрэдны і ўскосны палітычны ўдзел, і іх падвіды (McClosky 2008; Merolla 2008). Згодна з Керэнам, "палітычны пратэст уключае спробы асоб ці груп вырашыць пытанне суб'ектыўнай несправядлівасці ці спыніць яе ў межах палітычнай сістэмы, не пераварочваючы сістэму як такую" (Keren 2006). У гэтай сувязі, пратэстная дзейнасць можа быць азначаная ў межах форм непасрэднага і ўскоснага палітычнага ўдзелу і такіх жа падвідаў адпаведна.

Згодна з некаторымі тэарэтычнымі падыходамі, можна акрэсліць пратэстную актыўнасць як частку непасрэднага палітычнага ўдзелу, як шырокі набор відаў дзейнасці: масавыя сходы (санкцыянаваныя і не санкцыянаваныя дзяржавай); пратэстныя мітынгі (санкцыянаваныя і не санкцыянаваныя дзяржавай); публічныя захады; страйкі; масавае грамадзянскае непадпарадкаванне; іншыя формы публічнага выказвання незадаволенасці дзяржаўнай

палітыкай ці сацыяльным парадкам і г. д. Грамадзянскім пратэстам, такім чынам, можа быць любое калектыўнае дзеянне, накіраванае на выказванне пэўнай незадаволенасці, злосці або нянавісці адносна палітыкі вышэйшых класаў або на прыцягненне ўвагі да праблемы пэўнай групы людзей (Carothers 2015; Youngs 2015). Такія дакладныя падзелы ў межах падыходу да непасрэднага палітычнага ўдзелу важныя для выбрання падчас першапачатковага аналізу звестак і перад правядзеннем асноўнага этапу даследавання – апраксімацыі статыстычнай мадэлі адносна верагоднай карэляцыі.

Зробленыя ў даследаванні дапушчэнні блізкія да тэорыі пачуцця несправядлівасці, якая сцвярджае, што эканамічная няроўнасць як такая будзе пытаннем, якое стымулюе пратэстны ўдзел і супярэчыць тэорыі адноснай моцы. У гэтым выпадку з павышэннем няроўнасці бедныя з большай імавернасцю будуць выключацца з палітычнага парадку дня (Solt 2015).

Аднак прычынамі пратэсту з’яўляюцца не проста народны гнеў і незадаволенасць. Яшчэ адной відавочнай тэндэнцыяй ёсць тое, што апазіцыйныя групы, якія арганізуюць пратэст, таксама павышаюць актыўнасць і запал падчас пагаршэння эканамічных умоў, спрабуюць павялічыць падтрымку з боку незадаволеных людзей і пашырыць сацыяльную базу і прасунуцца наперад у асрэчванні дзеянняў улад. Таму мусіць існаваць яшчэ адзін фактар негатыўнай карэляцыі паміж эканамічнымі паказчыкамі і колькасцю пратэстных дзеянняў у Беларусі.

Даследчыкі пратэстнай актыўнасці ў недэмакратычных рэжымах (Pramen 2017; Makhovsky 2017) сцвярджаюць, што адной з тыповых характарыстык аўтарытарнай сістэмы з’яўляецца тое, што любы пратэст, непадпарадкаванне або відавочная незадаволенасць становяцца звышпалітызаванымі, нават калі першапачаткова яны не былі звязаныя з дзяржаўнай палітыкай. У выніку можна сцвярджаць, што ў выпадку Беларусі любы пратэст – страйк, мастацкі перформанс адносна легалізацыі марыхуаны або мясцовы пратэст супраць рэнавацыі гарадскога асяроддзя – звычайна ўспрымаецца медыямі, дзяржаўнымі структурамі і грамадскай думкай як палітычны пратэст супраць улад.

Як адзначалася вышэй, эканамічныя ўмовы могуць быць крытычнай прычынай для грамадзянскага пратэсту. У Беларусі можна знайсці прыклады гэтай тэндэнцыі прынамсі ў двух выпадках – у 2011 г. падчас “маўклівых пратэстаў”, якія праходзілі ў час эканамічнага крызісу на Беларусі[2] і ў 2017 г. падчас так званых

"пратэстаў супраць падатку на дармаедаў[3]".

У сувязі з гэтым, вызначаючы карэляцыю колькасці пратэстных акцый з сацыяльна-эканамічнымі паказнікамі і ўзроўнем дабрабыту, можна ацаніць "адчувальнасць" беларусаў да зніжэння дабрабыту і іх здольнасць абараніць свае правы праз грамадзянскі пратэст.



## ХАРАКТАРЫСТЫКІ ПРАТЭСТНАЙ АКТЫЎНАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ АБМЕЖАВАННІ ДАСЛЕДАВАННЯ

Перад апісаннем метадалогіі неабходна прадставіць абмежаванні даследавання. Некаторыя пераменныя ў мадэляванні могуць узаемадзейнічаць паміж сабой і прыводзіць да недакладнасці заключэння. Таксама, дадаванне значнай колькасці пераменных да мадэлі падаецца праблематычным. Тым не менш, каб пазбегнуць магчымых памылак і недакладнасці, даследаванне мае наступныя абмежаванні:

1. Рэальныя прычыны пратэсту могуць уключаць вялікую колькасць пераменных, шмат якія з іх немагчыма прадказаць і якія патрабуюць збору вялікай колькасці звестак.

2. Немагчыма дакладна адрозніць эканамічныя, сацыяльныя і палітычная пратэсты. Гэта значыць, што невядома, ці пратэстуюць людзі супраць нізкіх заробкаў, зніжэння сацыяльных выплат ці дзяржаўнай улады як такой. Нават калі можа існаваць карэляцыя, дакладная прычынная сувязь застаецца няяснай.

3. Афіцыйная беларуская статыстыка падступная, таму што часам хавае ці скажае рэальныя звесткі адносна сацыяльна-эканамічных паказчыкаў з палітычных прычын (Наша Ніва 2017; AFN 2009). Праз такія прэцэдэнты нельга разлічваць на афіцыйную статыстыку. Каб забяспечыць дакладнасць даследавання, выкарыстаныя звесткі будуць паходзіць не з афіцыйных дзяржаўных крыніц, а з незалежных баз звестак.

4. Як прыгадвалася раней, палітычны ўдзел мае розныя формы і падвіды. У цэнтры ўвагі даследавання палітычныя акцыі на вуліцах і тыя акцыі, што маюць дакладны пратэстны пасыл, таму што іх адносна лёгка колькасна вымераць. Не ўключаюцца акцыі ўскоснага палітычнага ўдзелу, такія як байкот выбараў, праз складанасць вымярэння.

2 - Boldyrev, Oleg (2011), "Belarus: Silent protests frighten regime", BBC Russia. Рэжым доступу: https://www.bbc.com/news/world-europe-13975788

3 - Makhovsky, Andrei (2017) Thousands of Belarusians take to the streets to protest the "Parasite law". Reuters. Рэжым доступу: https://www.reuters.com/article/us-belarus-protests/thousands-of-belarussians-take-to-the-streets-to-protest-parasite-law-idUSKBN15W1Y0.

## ФАКТАРЫ, ЯКІЯ ЎПЛЫВАЮЦЬ НА ПРАТЭСТНУЮ АКТЫЎНАСЦЬ

Фактараў, якія ўплываюць на пратэстную актыўнасць у Беларусі (якія будуць тлумачыцца з выкарыстаннем эканамічных індыкатараў), насамрэч, шмат, а ў некаторых выпадках іх складана прагназаваць. Больш ці менш заўважныя ўключаюць: рэпрэсіўную палітыку беларускай дзяржавы; цяперашнія адносіны паміж Беларуссю і ЕС; ступень энтузіязму і храбрасці сярод апазіцыйных груп; колькасць сацыяльна-эканамічных пытанняў, узнятых медыямі і адлюстраваных апазіцыйнымі групамі; мясцовыя падзеі і злоўжыванне ўладай.

Некаторыя з фактараў вельмі складана ці нават немагчыма прагназаваць. Паколькі Беларусь з'яўляецца аўтарытарнай краінай, у якой шмат якія, калі не ўсе, палітычныя рашэнні прымаюцца непразрыста, усе дзеянні ўлад, якія выклікаюць пратэстную актыўнасць, звычайна залежаць ад волі адной асобы (кіраўнік дзяржавы Лукашэнка).

## АЛЬТЭРНАТЫЎНЫЯ ШЛЯХІ КОЛЬКАСНАГА ВЫМЯРЭННЯ ПРАТЭСТНАЙ АКТЫЎНАСЦІ

Існуюць некалькі альтэрнатыўных шляхоў вымярэння карэляцыі паміж пратэстамі і эканамічнымі індыкатарамі, уключаючы наступнае:

а) выбар іншага эканамічнага індыкатара. Замест сярэдняга заробку, курса абмену валюты і індэксу спажывецкіх цэн можна выбраць узровень беспрацоўя, медыянны заробак і рэальны заробак.

b) Яшчэ некалькі пераменных могуць быць уключаныя ў мадэль, такія як колькасць адміністратыўных затрыманняў, штрафы і крымінальныя справы па палітычных матывах.

c) Таксама можна скараціць колькасць падзей, якія вызначаюцца як пратэст, і абмежаваць іх толькі масавымі вулічнымі акцыямі (аднак у гэтым выпадку таксама патрэбна вызначыць, што такое “масавая” акцыя).

Адны і тыя звесткі можна таксама рэарганізаваць і аналізаваць як звесткі працяглага назірання. Можна абраць адну катэгорыю (напрыклад, пратэстныя мітынгі) і прасачыць яе з 2013 да 2015 г., назіраючы за тым, як дакладна гэты тып пратэсту развіваўся з пункту гледжання колькасці ўдзельнікаў у назіраны перыяд.

## ГІПОТЭЗА

Наша гіпотэза палягае ў тым, што існуе пазітыўная і негатыўная карэляцыя паміж эканамічнымі паказчыкамі і пратэстнай актыўнасцю ў Беларусі. Чакаецца негатыўная карэляцыя са пераменнай "Заробак", што значыць, што павелічэнне незалежных пераменных на адну адзінку прывядзе да паніжэння залежнай пераменнай. Інакш кажучы, зніжэнне эканамічнай няроўнасці праз павышэнне заробкаў можа прывесці да зніжэння колькасці пратэстаў. Таксама чакаецца супрацьлеглая сітуацыя ці пазітыўная карэляцыя з пераменнай "Выбары", што значыць, што павелічэнне на адну адзінку гэтай пераменнай таксама павялічыць каэфіцыент пераменнай "Колькасць пратэстаў". З гістарычнай перспектывы можна бачыць, што пасля выбараў у Беларусі адбываецца павелічэнне колькасці пратэстаў.

## МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ І ЗВЕСТКІ

Мы выкарыстоўвалі мадэляванне і статыстычны аналіз у якасці асноўных метадаў даследавання. Статыстычны аналіз выкарыстоўваецца падчас збору і тлумачэння звестак, а звесткі як такія атрымліваюцца на аснове пратэстаў у Беларусі і эканамічных паказчыкаў у перыяд 2013–2015 гг.

З прычыны абмежаванняў у зборы звестак мы пазбягалі афіцыйных крыніц статыстычных звестак. Замест гэтага, звесткі адносна пераменнай "Сярэдні заробак" (гл. Дадатак 3) і "ІСЦ" (гл. Дадатак 1) збіраліся з адкрытай базы звестак (Trading Economics, "Belarus Core Consumer Price"; "Belarus Average Monthly Wages"). Аднак з прычыны дэнамінацыі беларускага рубля ў 2016 г[4]. мы вырашылі перавесці сярэдні заробак у еўра, каб прытрымлівацца падобнай структуры ў нашых звестках. Праз ваганні курса абмену мы выкарыстоўвалі канвертар валют[5]. Для пераменнай "Курс еўра да беларускага рубля" (гл. Дадатак 2) мы выкарыстоўвалі падобныя звесткі. Мы таксама выкарыстоўвалі колькасныя звесткі пра колькасць пратэстаў са справаздач "Палітычнай сферы", толькі такія мы разглядаем у якасці непасрэдных акцый пратэсту (Чыжова 2014; Чыжова 2015; Чыжова 2016).

4 - MyFin.by, "Деноминация будет проведена с 1 июля 2016 в Беларуси". Рэжым доступу: https://myfin.by/stati/view/5461-denominaciya-budet-provedena-s-1-iyulya-2016-v-belarusi

5 - Tut.by, "Конвертер валют". Рэжым доступу: https://finance.tut.by/calcs/konv_val/

## ПЕРАМЕННЫЯ

Звесткі для пераменнай “Колькасць пратэстаў” былі ўзятыя ў “Палітычнай сферы”. Мы выкарыстоўваем толькі тыя акцыі, якія маюць дакладны пратэстны пасыл і праводзяцца не ў закрытых памяшканнях, а ў публічнай прасторы. Мы выключаем з мадэлі так званыя “сацыяльныя” пратэсты, якія можна разглядаць як непасрэдны і ўскосны палітычны ўдзел. Аўтары “Палітычнай сферы” ўключалі такія акцыі як петыцыі і заявы да чыноўнікаў ці калектыўныя петыцыі да масавых медыяў. Улічваючы гэта, “сацыяльныя” пратэсты не ўключаныя ў нашу тэарэтычную схему.

## 2013 Г. (ГЛ. ДАДАТАК 4)

У 2013 г. колькасць пратэстаў, як падавалася, значна не павялічвалася, акрамя лістапада і снежня, калі назіраліся 10 і 17 пратэстных акцый адпаведна. Агульная колькасць публічных пратэстаў за год – 64 (Чыжова 2014).

## 2014 Г. (ГЛ. ДАДАТАК 5)

2014 г. быў адзначаны істотным павелічэннем пратэстнай актыўнасці ў перыяд са студзеня да сакавіка. Гэтае падвышэнне можна растлумачыць мясцовымі выбарамі, якія праводзіліся 23 сакавіка, што падвышае публічны інтарэс да палітыкі і мабілізуе палітычныя партыі і арганізацыі. Агульная колькасць пратэстаў за гэты год – 81 (Чыжова 2015).

## 2015 Г. (ГЛ. ДАДАТАК 6)

2015 г. – гэта год прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі – найбольш значная палітычная падзея і адзін з фактараў, якія найбольш часта з’яўляюцца штуршком для пратэстаў. Гэта можа як найменей часткова растлумачыць невялікае і стабільнае павелічэнне колькасці пратэстных акцый з ліпеня да лістапада 2015 г., максімум прыходзіўся на кастрычнік (16 акцый) – месяц выбараў. Агульная колькасць пратэстаў за гэты год – 96 (Чыжова 2016).

Папярэдняе параўнанне паказчыкаў залежных і незалежных пераменных дапускае, што адсутнічае карэляцыя паміж пратэстамі на Беларусі, з аднаго боку, і сярэднімі заработкамі, ІСЦ і курсам абмену, з другога. Такія фактары як прэзідэнцкія выбары ці іншыя палітычныя падзеі маюць значна большы ўплыў.

## ВЫБАРЫ

Для далейшай ацэнкі мы стварылі “ўяўную” або бінарную пераменную “Выбары”, дзе “1” рэпрэзентуе наяўнасць выбараў любога роду на Беларусі, а “0” рэпрэзентуе іх адсутнасць. У сувязі з

гэтым у перыяд 2013–2015 гг. ёсць дзве падзеі выбараў (Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў).

## МАДЭЛЯВАННЕ

Спачатку неабходна праверыць характарыстыкі наяўных звестак. Падчас даследавання мы маем справу са звесткамі дынамічных радоў, якія трэба пратэсціраваць на нязменнасць у часе, што азначае нязменнасць статыстычных індыкатараў на працягу пэўнага перыяду. Нашы мноствы звестак маюць бінарныя ці так званыя "ўяўныя звесткі", а таксама колькасныя пераменныя. Адсутнічаюць прычыны каб тэставаць бінарныя пераменныя на нязменнасць у часе з прычыны характару гэтых звестак. У нашым выпадку тэставанне можа выкарыстоўвацца адносна ўсіх пераменных, акрамя пераменнай "Выбары".

Затым мы праводзім пашыраны тэст Дыкі-Фулера, каб высветліць наяўнасць адзінкавых каранёў, з выкарыстаннем наступнага ўраўнення:

$$\Delta Yt=\alpha+\beta Yt\text{-}1+\gamma T+\varphi i\Sigma\Delta Yt\text{-}i+ut$$

Мы высветлілі, што мноства звестак патрабуе карэктавання. У сувязі з гэтым мы выкарысталі дыферэнцыяцыю для пераменных "Сярэдні заробак у еўра" і "Курс еўра да беларускага рубля", якія будуць мець дадатковую літару "d" пасля назвы пераменнай.

**Мадэль 16: прынцып найменшых квадратаў, выкарыстоўваючыназіранне 2013:04-2015:12 (T = 33)**

| | **Каэфіцыент** | **Станд. памылка** | **Каэф. t** | **Значэнне верагоднасці** | |
|---|---|---|---|---|---|
| **const** | −184,825 | 172,772 | −1,070 | 0,2963 | |
| **d_ Сярэдні заробак у еўра** | −0,0234972 | 0,0251591 | −0,9339 | 0,3605 | |
| **d_ Сярэдні заробак у еўра_1** | −0,0506658 | 0,0498651 | −1,016 | 0,3206 | |
| **d_ Сярэдні заробак у еўра_2** | −0,147528 | 0,0469992 | −3,139 | 0,0048 | *** |
| **d_ Курс еўра да бел. рубля** | −2,89051 | 15,3057 | −0,1889 | 0,8519 | |
| **d_ Курс еўра да бел. рубля_1** | −27,9461 | 11,8541 | −2,358 | 0,0277 | ** |
| **d_ Курс еўра да бел. рубля_2** | 12,5476 | 7,45827 | 1,682 | 0,1066 | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ІСЦ адсотак** | 1,46995 | 1,50206 | 0,9786 | 0,3384 | |
| **ІСЦ адсотак_1** | −1,46604 | 1,88034 | −0,7797 | 0,4439 | |
| **ІСЦ адсотак_2** | 1,88884 | 1,66490 | 1,135 | 0,2688 | |
| **Выбары** | 11,8416 | 3,48688 | 3,396 | 0,0026 | *** |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Сярэдняя залежная пераменная** | 6,818182 | **Стандарт. адхіленне залежнай пераменнай** | 5,670398 |
| **Сума квадратаў астаткаў** | 308,9363 | **Стандарт. памылка рэгрэсіі** | 3,747340 |
| **R-квадрат** | 0,699744 | **Скарэктаваны R-квадрат** | 0,563264 |
| **F(10, 22)** | 5,127076 | **Значэнне верагоднасці (F)** | 0,000678 |
| **Лагарфым. праўдападобнасць** | −83,72933 | **Крытэрый Акаіке** | 189,4587 |
| **Крытэрый Шварца** | 205,9202 | **Хенан-Куін** | 194,9975 |
| **Каэф. карэляцыі для сукупнасці** | 0,262495 | **Дурбін-Уотсан** | 1,372071 |

Пасля ацэнкі звычайным метадам найменшых квадратаў магчыма бачыць, што значны эфект узнікае толькі з часавым лагам 2 месяцы. Тым не менш, згодна з разлікамі, можна назіраць, што значэнне імавернасці дэманструе статыстычную значнасць (пры значэнні імавернасці ніжэйшае за 0,05 з узроўнем значнасці 95%) адносна пераменных d_ Сярэдні заробак у еўра _2 і d_ Курс еўра да бел. рубля _1.

ІСЦ адсотак_2 не дэманструе значнага эфекту нават з часавым лагам 2 месяцы (значэнне імавернасці ніжэйшае за 0,05).
Для ўяўнай пераменнай Выбары магчыма назіраць вельмі значны эфект з пазітыўнай карэляцыяй.

## ПРАТЭСТНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ: ЭМПІРЫЧНЫЯ ВЫНІКІ

Характарыстыкі непасрэднага і ўскоснага палітычнага ўдзелу з даследаванымі тыпамі палітычных акцый і сацыяльна-палітычных пераменных дазваляюць зрабіць некалькі высноў. Па-першае, аналіз першапачатковых звестак дэманструе, што палітычны ўдзел мае некалькі падвідаў. Тым не менш, не ўся пратэстная актыўнасць можа быць колькасна вымераная, што прыводзіць да абмежаванняў даследавання. Па-другое, з прычыны складанай палітычнай сітуацыі ў Беларусі афіцыйныя статыстычныя звесткі падаюцца сумнеўнымі. Таму для гэтага даследавання мы збіралі звесткі з не-

залежных баз звестак, карэктуючы іх, каб забяспечыць падобную структуру звестак.

Аналізуючы прапанаваную мадэль, можна прыйсці да высновы, што такія эканамічныя паказчыкі як сярэдні заробак (разлічаны ў еўра) маюць карэляцыю з залежнай пераменнай колькасці пратэстаў з часавым лагам два месяцы, а курс абмену беларускага рубля (да еўра) карэлюе з часавым лагам адзін месяц.

Статыстычныя доказы дэманструюць, што падвышэнне на адну адзінку пераменнай, якая рэпрэзентуе сярэдні заробак і курс еўра, карэлюе са змяншэннем колькасці пратэстных акцый з часавым лагам два месяцы для “сярэдняга заробку” і адзін месяц для курса абмену валюты (статыстычна значная негатыўная карэляцыя). Тым не менш, адсутнічаюць статыстычныя доказы, каб дапусціць, што пераменная, якая рэпрэзентуе індэкс спажывецкіх цэн, мае любы тып карэляцыі з колькасцю пратэстаў на Беларусі ў пэўнай выбарцы.

У той жа час адсутнічаюць статыстычныя доказы пазітыўнай карэляцыі з бінарнай пераменнай выбараў. У гэтым выпадку павелічэнне на адну адзінку пераменнай (адбываюцца выбары) карэлюе з падвышэннем колькасці пратэстных акцый.
Падсумоўваючы, згодна з папярэдняй мадэллю, у пэўнай выбарцы звестак можна бачыць па разліках, што існуюць доказы таго, што палітычныя фактары, такія як выбары, маюць больш значны статыстычны карэляцыйны ўплыў на беларускую пратэстную актыўнасць, чым эканамічныя фактары.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Улічваючы наяўную палітычную сітуацыю і звесткі пра палітычную актыўнасць у Беларусі, можна адзначыць некалькі важных момантаў. Падчас даследавання і збору звестак пра пратэсты на Беларусі трэба ўлічваць наяўныя абмежаванні, такія як цяперашняя палітычная сітуацыя, праблематычны характар нацыянальных статыстычных звестак і адрозненне тыпаў палітычнага ўдзелу.

Згодна з разлікамі, можна бачыць, што ў пэўнай выбарцы палітычныя фактары маюць мацнейшую і статыстычна больш значную карэляцыю, чым эканамічныя фактары. Аднак трэба памятаць, што такая карэляцыя ўзнікае ў пэўнай выбарцы 2013–2015 гг. і можа змяняцца з павелічэннем выбаркі ці праз уключэнне дадатковых пераменных у мадэль.

Гэтае даследаванне пратэстнай актыўнасці незавершанае. Аднак наяўныя звесткі і эмпірычныя вынікі гэтага даследавання могуць выкарыстоўвацца ў якасці пачатковага пункта далейшых даследаванняў праз пашырэнне колькасці пераменных з фактычнымі звесткамі. Даследаванне ў гэтай сферы можна праводзіць з выкарыстаннем падобнай метадалогіі ў іншых краінах з падобнымі палітычнымі сістэмамі. Параўнальны аналіз можна праводзіць, каб знайсці магчымае падабенства і прагназаваць патэнцыяльныя вынікі.

## ЦЫТАВАНЫЯ ПРАЦЫ

1. Наша Ніва (Nasha Niva) (2017) «Няма патрэбы»: Белстат схаваў аператыўныя лічбы медыянных заробкаў. Рэжым доступу: https://nn.by/?c=ar&i=188146 (дата звароту: 16.05.2018).

2. AFN (2009) Белстат засекретил данные о складских запасах, ради всеобщего блага и спокойствия. Рэжым доступу: http://afn.by/news/i/123080 (дата звароту: 13.05.2018).

3. Pramen (2017) Hundreds of protesters detained after a massive wave of repressions in Belarus. Рэжым доступу: https://pramen.io/en/2017/03/hundreds-of-protesters-detained-after-massive-wave-of-repressions-in-belarus/ (дата звароту: 13.04.2018).

4. Carothers, Thomas., Youngs, Richard (2015), “The Complexities of Global Protests”, Carnegie Endowment for International Peace. Рэжым доступу: https://carnegieendowment.org/2015/10/08/complexities-of-global-protests-pub-61537 (дата звароту: 13.04.2018).

5. Makhovsky, Andrei (2017) Thousands of Belarusians take to the streets to protest the “Parasite law”. Reuters. Рэжым доступу: https://www.reuters.com/article/us-belarus-protests/thousands-of-belarussians-take-to-the-streets-to-protest-parasite-law-idUSKBN15W1Y0 (дата звароту: 14.04.2018).

6. Solt, Frederick (2015). Economic inequality and nonviolent protest. University of Iowa, 2015. Рэжым доступу: http://myweb.uiowa.edu/fsolt/papers/Solt2015a_pre.pdf (дата звароту: 14.04.2018).

7. Freedom House (2018). “Nations in Transit: Belarus”. Рэжым доступу: https://freedomhouse.org/report/nations-transit/2018/belarus (дата звароту: 24.10.2018).

8.McClosky, Herbert (2008). «Political Participation», International Encyclopedia of the Social Sciences, Encyclopedia.com. Рэжым доступу: http://www.encyclopedia.com/social-sciences-and-law/sociology-and-social-reform/sociology-general-terms-and-concepts-138#D (дата звароту: 19.09.2018).

9. Merrola, Jenifer (2008). “Participation, Political”, International Encyclopedia of the Social Sciences, Encyclopedia.com. Рэжым доступу: http://www.encyclopedia.com/social-sciences-and-law/sociology-

and-social-reform/sociology-general-terms-and-concepts-138#D (дата звароту: 19.09.2018).

10. Keren, Michael (2006). «Political Protest”. Governments of the World: A Global Guide to Citizens’ Rights and Responsibilities. Encyclopedia.com. Рэжым доступу: https://www.encyclopedia.com/international/legal-and-political-magazines/political-protest (дата звароту: 15.10.2018).

11. Trading Economics, “Belarus Core Consumer Price”. Рэжым доступу: https://tradingeconomics.com/belarus/core-consumer-prices (дата звароту: 1.05.2018).

12. Trading Economics, “Belarus Average Monthly Wages”. Рэжым доступу: https://tradingeconomics.com/belarus/wages?embed (дата звароту: 1.05.2018).

13. Tut.by, “Архив курсов валют НБРБ”. Рэжым доступу: https://finance.tut.by/arhiv/ (дата звароту: 1.05.2018).

14. Центральная комиссия Республики Беларусь по выборам и проведению республиканских референдумов (Tsentral’naya komissiya Respubliki Belarus’ po vyboram i provedeniyu respublikanskikh referendumov). Календарь выборов и референдумов. Рэжым доступу: http://www.rec.gov.by/ru/kalendar-vyborov-i-referendumov (дата звароту: 14.05.2018).

15. Чыжова, Таццяна (Chyzhova, Tattyana) (2014) Пратэстная актыўнасць у Беларусі ў 2013 годзе: масавыя акцыі, палітычныя перформансы, сацыяльныя канфлікты. Палітычная сфера, 2014. Рэжым доступу: http://palityka.org/wp-content/uploads/2015/03/Chyzhova_Pratesty-2104.pdf (дата звароту: 2.05.2018).

16. Чыжова, Таццяна (Chyzhova, Tattyana) (2015) Пратэстная актыўнасць у Беларусі ў 2014 годзе: масавыя акцыі, палітычныя перформансы, сацыяльныя канфлікты. Палітычная сфера, 2015. Рэжым доступу: http://palityka.org/wp-content/uploads/2014/02/Pratesty_u-Belarusi-2013.pdf (дата звароту: 2.05.2018).

17. Чыжова, Таццяна (Chyzhova, Tattyana) (2016) Пратэсты і выбары. Вынікі маніторынгу пратэстнай актыўнасці у Беларусі за 2015 год: масавыя акцыі, палітычныя перформансы, сацыяльныя канфлікты. Палітычная сфера, 2016. Рэжым доступу: http://palityka.org/wp-content/uploads/2016/03/Chyzhova_Pratesty_2015.pdf (дата звароту: 2.05.2018).

# ДАТАТАК 1
# ШТОМЕСЯЧНЫ ІСЦ: 2013–2015 ГГ.

| Месяц/год | ІСК, адсотак |
|---|---|
| Студзень 2013 | 102,8 |
| Люты 2013 | 100,6 |
| Сакавік 2013 | 100,6 |
| Красавік 2013 | 100,4 |
| Травень 2013 | 100,6 |
| Чэрвень 2013 | 100,5 |
| Ліпень 2013 | 101 |
| Жнівень 2013 | 100,8 |
| Верасень 2013 | 100,6 |
| Кастрычнік 2013 | 101 |
| Лістапад 2013 | 101,3 |
| Снежань 2013 | 102,39 |
| Студзень 2014 | 101,2 |
| Люты 2014 | 101 |
| Сакавік 2014 | 101,2 |
| Красавік 2014 | 101,4 |
| Травень 2014 | 102,9 |
| Чэрвень 2014 | 101,7 |
| Ліпень 2014 | 101 |
| Жнівень 2014 | 100,8 |
| Верасень 2014 | 100,8 |
| Кастрычнік 2014 | 100,7 |
| Лістапад 2014 | 100,6 |
| Снежань 2014 | 100,6 |
| Студзень 2015 | 101,8 |
| Люты 2015 | 101 |
| Сакавік 2015 | 100,9 |
| Красавік 2015 | 100,7 |
| Травень 2015 | 100,8 |
| Чэрвень 2015 | 100,9 |
| Ліпень 2015 | 100,5 |
| Жнівень 2015 | 100,8 |
| Верасень 2015 | 100,8 |
| Кастрычнік 2015 | 100,7 |
| Лістапад 2015 | 101,2 |
| Снежань 2015 | 101,2 |

# ДАДАТАК 2
# КУРС АБМЕНУ БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ, 2013–2015 ГГ.

| Месяц/год | EUR за BYR |
|---|---|
| Студзень 2013 | 0,86 |
| Люты 2013 | 0,87 |
| Сакавік 2013 | 0,86 |
| Красавік 2013 | 0,87 |
| Травень 2013 | 0,87 |
| Чэрвень 2013 | 0,87 |
| Ліпень 2013 | 0,88 |
| Жнівень 2013 | 0,89 |
| Верасень 2013 | 0,9 |
| Кастрычнік 2013 | 0,91 |
| Лістапад 2013 | 0,93 |
| Снежань 2013 | 0,94 |
| Студзень 2014 | 0,96 |
| Люты 2014 | 0,96 |
| Сакавік 2014 | 0,98 |
| Красавік 2014 | 0,99 |
| Травень 2014 | 1 |
| Чэрвень 2014 | 1,02 |
| Ліпень 2014 | 1,02 |
| Жнівень 2014 | 1,03 |
| Верасень 2014 | 1,04 |
| Кастрычнік 2014 | 1,06 |
| Лістапад 2014 | 1,07 |
| Снежань 2014 | 1,08 |
| Студзень 2015 | 1,1 |
| Люты 2015 | 1,6 |
| Сакавік 2015 | 1,5 |
| Красавік 2015 | 1,4 |
| Травень 2015 | 1,4 |
| Чэрвень 2015 | 1,5 |
| Ліпень 2015 | 1,6 |
| Жнівень 2015 | 1,5 |
| Верасень 2015 | 1,8 |
| Кастрычнік 2015 | 1,8 |
| Лістапад 2015 | 1,7 |
| Снежань 2015 | 1,8 |

## ДАДАТАК 3
## СЯРЭДНІ ЗАРОБАК: 2013–2015 ГГ.

| Месяц/год | Сярэдні заробак BYR | Сярэдні заробак EUR |
|---|---|---|
| Студзень 2013 | 4368023 | 372,06 |
| Люты 2013 | 4504840 | 398,23 |
| Сакавік 2013 | 4692789 | 422,32 |
| Красавік 2013 | 4888296 | 431,42 |
| Травень 2013 | 4988338 | 443,4 |
| Чэрвень 2013 | 5159884 | 450,24 |
| Ліпень 2013 | 5450175 | 462,65 |
| Жнівень 2013 | 5547075 | 466,13 |
| Верасень 2013 | 5374793 | 438,69 |
| Кастрычнік 2013 | 5477569 | 447,14 |
| Лістапад 2013 | 5348781 | 420,83 |
| Снежань 2013 | 5854664 | 447,6 |
| Студзень 2014 | 5322441 | 405,05 |
| Люты 2014 | 5389193 | 403,38 |
| Сакавік 2014 | 5753101 | 423,95 |
| Красавік 2014 | 5860652 | 423,45 |
| Травень 2014 | 6055941 | 441,07 |
| Чэрвень 2014 | 6198540 | 446,25 |
| Ліпень 2014 | 6455276 | 467,09 |
| Жнівень 2014 | 6364471 | 463,2 |
| Верасень 2014 | 6335320 | 472,08 |
| Кастрычнік 2014 | 6377912 | 473,13 |
| Лістапад 2014 | 6194398 | 459,86 |
| Снежань 2014 | 6805978 | 473,29 |
| Студзень 2015 | 6023213 | 345,36 |
| Люты 2015 | 6129105 | 411,62 |
| Сакавік 2015 | 6483703 | 405,99 |
| Красавік 2015 | 6536111 | 410,81 |
| Травень 2015 | 6687564 | 410,28 |
| Чэрвень 2015 | 6883744 | 405,54 |
| Ліпень 2015 | 7008649 | 419,72 |
| Жнівень 2015 | 6970521 | 352,24 |
| Верасень 2015 | 6862950 | 344,73 |
| Кастрычнік 2015 | 6837568 | 356,77 |
| Лістапад 2015 | 6748775 | 350 |
| Снежань 2015 | 7424092 | 365,71 |

## ДАДАТАК 4
## ШТОМЕСЯЧНЫЯ ПРАТЭСТНЫЯ АКЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ, 2013




## ДАДАТАК 5
## ШТОМЕСЯЧНЫЯ ПРАТЭСТНЫЯ АКЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ, 2014




## ДАДАТАК 6
## ШТОМЕСЯЧНЫЯ ПРАТЭСТНЫЯ АКЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ, 2015



# РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЛІТЫКІ ПАМЯЦІ ПРАЗ СІСТЭМУ АДУКАЦЫІ Ў ПЕРАХОДНЫ ПЕРЫЯД У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ (1991 – 2001)

**Вольга Гайдук** атрымала ступень магістра палітычных навук Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (Літва). Зараз працягвае вывучаць метады і спосабы рэалізацыі палітыкі памяці ў сістэме адукацыі, як механізма падпарадкавання ва ўладнай вертыкалі.

## АНАТАЦЫЯ

Нацыянальная гісторыя з’яўляецца важным інструментам рэалізацыі палітыкі памяці праз адукацыйную сістэму нацыянальнай дзяржавы. Гісторыя дзяржавы ляжыць у аснове «вынайдзеных» традыцый, якія фарміруюць палітычныя эліты пры выкарыстанні адукацыйных стратэгій рэканструкцыі, забыцця, табуяванасці, камемарацыі мінулага нацыі. Асаблівасцю фармавання версій беларускай гісторыі і наратываў, на якія яны абапіраюцца, сталі асіметрыі памяці, якія прывялі да супрацьстаяння паміж афіцыйнай і нацыянальнай версіямі гісторыі.

Гэтае даследаванне факусуецца на пераходным для Рэспублікі Беларусь перыядзе 1991 – 2001 у рэалізацыі палітыкі памяці. Даследаванне паказвае на прыкладзе адукацыйных практык, якім чынам адбывалася фарміраванне нацыянальнай гістарычнай памяці беларускага народа; вызначаюцца шляхі рэалізацыі палітыкі памяці; пазначаецца перыяд, які стаў траўматычным у беларускай гістарычнай палітыцы і прывёў да фармавання безальтэрнатыўнай версіі афіцыйнай памяці.

Выкарыстоўваючы такія метады як тэарэтычны аналіз канцэпцый нацый, памяці, аналіз архіўных дадзеных Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусі (фонд 498 Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь), паўструктураванага інтэрв’ю з экспертамі, якасны дыскурс-аналіз была зроблена выснова аб тым, што адукацыя робіць палітыку памяці публічнай, нават тады, калі яна не прызнаецца ў якасці афіцыйнай дзяржаўнай палітыкі памяці. Традыцыйная камандна-адміністрацыйная сістэма кіраваннем адукацыяй, рэалізуючы моўную палітыку і распрацоўваючы нацыя-

нальную гісторыю ў пераходны перыяд сярэдзіны 1990-х гадоў, спрыяла нарастанню «анамалій», зон напружання ў дачыненні да нацыянальнай гісторыі, беларускай і рускай моў, памяці пра вайну, якія фрагментуюць камунікатыўную памяць нацыі. Узніклыя асіметрыі памяці прывялі да змены парадыгмаў палітыкі памяці: ад нацыянальнай парадыгмы да афіцыйнай. Фармаванне афіцыйнай палітыкі ажыццяўлялася ў сітуацыі безальтэрнатыўнага выбару, калі вяртанне да «савецкай» гісторыі было ўжо немагчымым, а адзіна падзеленая калектыўная памяць пра мінулае – гэта памяць пра вайну. Рэтушаванне нацыянальнай гісторыі дазволіла стварыць адрозную версію гісторыі нацыі.

## КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ:

Палітыка памяці; гістарычная палітыка; гістарычная памяць; моўная палітыка; сістэма адукацыі; афіцыйная гісторыя; афіцыйная памяць; асіметрыі памяці.

## АСАБЛІВАСЦІ СТВАРЭННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Гістарычная памяць з'яўляецца неад'емным элементам фармавання і развіцця нацыі. Нацыянальная памяць з'яўляецца не толькі калектыўнай памяццю нацыі, але і ўбірае ў сябе ўсе альтэрнатыўныя версіі камунікатыўнай памяці сацыяльных груп. Пры гэтым ва ўмовах недэмакратычнага рэжыму нацыянальная памяць перажывае шэраг трансфармацый і адлюстроўвае афіцыйнае бачанне гісторыі, на падтрыманне якой накіроўваюцца значныя інстытуцыйныя рэсурсы, якія рэалізуюцца ў адукацыйных практыках. Афіцыйная памяць значна збядняе прастору нацыянальнай памяці, што прыводзіць да выцяснення і забыцця значнага гістарычнага наратыву, губляецца сувязь гістарычнага мінулага і нацыі.

У дадзеным артыкуле паняцці «гістарычная палітыка» і «палітыка памяці» цесна звязаныя паміж сабой. Палітыка памяці разглядаецца як шырокае паняцце, якое ўключае ў сябе гістарычную палітыку, якая праводзіцца дзяржавай праз адукацыю (навучальныя курсы па гісторыі Беларусі на розных узроўнях сістэмы адукацыі), ставарае адзінае бачанне нацыянальнай сістэмы адукацыі (Канцэпцыі нацыянальнай школы, Канцэпцыя гісторыі і гістарычнай адукацыі Рэспублікі Беларусь). Аперыраванне паняццямі «нацыянальная памяць» і «афіцыйная памяць» дазваляе размежаваць змест паняцця «гістарычная памяць беларускай нацыі» ў якасці відаў калектыўнай памяці нацыі. Паняцце «нацыянальная памяць» уключае магчымыя альтэрнатыўныя парадыгмы гісторыі. Паняцце «афіцыйная памяць» адлюстроўвае дзяржаўны заказ на

інтэрпрэтацыю гістарычных падзей і звязана з усталяваннем недэмакратычнага рэжыму ў Рэспубліцы Беларусь і асобай прэзідэнта А. Лукашэнкі.

Паняцце «нацыя» непарыўна звязана з дзяржавай, палітыкай, гісторыяй і адукацыяй, якія адыгрываюць ключавую ролю ў яе фармаванні-«прадстаўленні» (Андерсон 2001). Нацыя, з'яўляючыся прадуктам чалавечых перакананняў, прыхільнасцяў і схільнасцяў (Геллнер 1991), у працэсе нацыянальнага будаўніцтва праз практыкі рытуальнага і сімвалічнага характару «вынаходзяць традыцыі» (Hobsbawm 1983), якія маюць фіктыўную сувязь з гістарычным мінулым. Фіктыўнасць сувязі заключаецца ў наўмысным укараненні новых успамінаў, падзей, фактаў, памятных дат. Новая гістарычная праўда выцясняе папярэднюю гістарычную версію, тлумачачы яе памылковасць. Пры гэтым для кансалідацыі ўспамінаў і вырашэння канфлікту памяці знаходзяцца агульныя кропкі сутыкнення паміж афіцыйнымі і альтэрнатыўнымі традыцыямі. Памяць не толькі ўзнаўляе мінулае, але і рэканструюе яго, абапіраючыся на пэўныя сацыяльныя рамкі (Хальбвакс 2007, 2005): час, прастору, успамін, якія існуюць непарыўна з пэўнай сацыяльнай групай. Ян і Алейда Ассман вылучылі камунікатыўную памяць (успаміны, якія людзі падзяляюць унутры групы) і культурную памяць (сімвалічныя фігуры мінулага, да якіх прымацоўваюцца ўспаміны). Памяць і гісторыя не тоесныя. Існуе столькі відаў памяці пра мінулае, колькі існуе сацыяльных груп (Нора 2009). Неабходнасць перагляду нацыянальнай гісторыі пашырае прастору калектыўнай памяці.

Спецыфічнай асаблівасцю фармавання гістарычнай памяці ў Беларусі з'яўляецца, па-першае, падыход да вывучэння гісторыі Беларусі (значны ўплыў на гістарычную навуку аказалі “вялікапольская канцэпцыя”, у меншай меры, і “вялікаруская канцэпцыя” ў спалучэнні з камуністычнай ідэалогіяй у 30–80-я гг. ХХ ст. (Біч 1993); па-другое, супрацьстаянне найбольш вядомых праектаў нацыянальнай памяці – памяці, заснаванай на станоўчай інтэрпрэтацыі савецкага мінулага, якая шмат у чым адлюстроўвае афіцыйнае бачанне гісторыі, якое ўкаранялася савецкай уладай і памяці, заснаванай на нацыянальнай перспектыве, якая дыстанцыюецца ад савецкага мінулага і настойвае на важнасці дасавецкага перыяду як падмурка самавызначэння беларусаў (Ластоўскі 2010). Як адзначае А. Братачкін у інтэрв'ю (Валынец 2016), асаблівасцю афіцыйнай версіі гістарычнай памяці з'яўляецца забыццё і перабольшанне, пазбяганне траўматычных падзей у гісторыі беларускага грамадства, якія не адлюстроўваюцца ў гістарычнай памяці: аварыя на

Чарнобыльскай АС, гісторыя Курапатаў, палітычныя рэпрэсіі 1920–1950 гг. у Беларусі. Дадзеная сітуацыя прывяла да значных скажэнняў гістарычнай памяці і страты нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа.

Асноўныя высновы артыкула абапіраюцца на аналіз архіўных дадзеных загадаў, указанняў, перапіскі з Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, Саветам Міністраў і Міністэрства адукацыі (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, фонд 498), што дазваляе разгледзець рэалізацыю адукацыйнай палітыкі ў галіне гісторыі і нацыянальнага будаўніцтва, якая ажыццяўляецца праз сістэму адукацыйных устаноў і кантроль за іх выкананнем. Дадзеныя дапаўняюцца інтэрв'ю з экспертамі, якія адлюстроўваюць індывідуальнае ўспрыманне значных гістарычных падзей мінулага, што дазваляе звязаць індывідуальныя ўспаміны з нарматыўнымі дакументамі, стварыўшы дыскурсіўнае апісанне падзей.

## РЭАЛІЗАЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ ПАМЯЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ У 1991–2000 ГГ.

Рэалізацыя нацыянальнай палітыкі памяці ў Беларусі пачалася пасля распаду Савецкага Саюза і ажыццяўлялася ў асноўным за кошт нацыяналізацыі сістэмы адукацыі ў трох кірунках: праведзенне моўнай палітыкі (“беларусізацыя”), перагляд зместу і падыходаў у нацыянальнай адукацыі (Канцэпцыя нацыянальнай школы Беларусі), стварэнне Канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі.

У 1991–1992 гг. ішла перадача асноўных функцый кіравання адукацыяй з саюзнага ўзроўню на нацыянальны ўзровень. У гэты перыяд Міністэрства адукацыі стала, па сутнасці, адзіным кіраўнічым органам, які каардынуе дзейнасць усіх устаноў адукацыі. У гэты ж час ствараецца сітуацыя недахопу падручнікаў для беларускамоўных класаў, а таксама востра стаіць пытанне недахопу паліграфічнай базы. Гэта звязана пераважна з тым, што ў час існавання саюзнай дзяржавы дзейнічаў дзяржаўны план закупкі і выдання вучэбных дапаможнікаў. Увядзенне і выкананне «Закона аб мовах» патрабавала планамернага стварэння беларускамоўных класаў, але пралічыць наперад іх колькасць кіраўнікі сярэдняга звяна ў пастаянна зменлівых умовах не маглі, выдавецтвы таксама прывыклі прымаць заказ на некалькі гадоў наперад. У паліграфіі, як і ў дакументазвароце, адсутнічала адна асаблівасць – гэта традыцыйныя беларускія літары «і» і «ў». У дакументазвароце замест беларускага «і» друкавалі альбо «1», альбо англійскі варыянт «I». Для адраджэння культурных традыцый не хапала навуковых кадраў у галіне музыкі, жывапісу, дойлідства.

Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, згодна з архіўнымі дакументамі за 1991–1995 год, якія ўключаюць загады міністра адукацыі і ўказанні намеснікаў міністра, пратаколы калегій Міністэрства адукацыі, перапіску з Вярхоўным Саветам, Адміністрацыяй Прэзідэнта ажыццяўляла нацыянальную палітыку памяці па наступных напрамках :

1. Пераклад зместу адукацыі на нацыянальную мову – беларускую.
2. Стварэнне аўтарскіх нацыянальных падручнікаў па гісторыі Беларусі.
3. Стварэнне гістарычнай канцэпцыі, у рамках якой будзе ажыццёўлены пераход на новы змест адукацыі.
4. Правядзенне навуковых, навукова-метадычных семінараў па пытаннях абноўленага гістарычнага зместу.
5. Увядзенне на ўсіх узроўнях сістэмы адукацыі ў праграму адукацыі вучэбнага прадмета "Гісторыя Беларусі".
6. Правядзенне нацыянальных свят, конкурсаў, стварэнне нацыянальных музеяў ва ўстановах адукацыі, арганізацыя турыстычных паходаў па культурна-гістарычных мясцінах.
7. Увядзенне дзяржаўнай сімволікі.
8. Прыцягненне сродкаў масавай інфармацыі для асвятлення праблем і перспектыў адукацыі.

Як бачна са зместу мерапрыемстваў, што праводзяцца ў межах фармавання гістарычнай памяці нацыі, былі задзейнічаныя наступныя спосабы:

**Прыгадванне і забыванне гісторыі.** Прыгадванне, адраджэнне нацыянальнага гістарычнага дыскурсу адбываецца ва ўмовах адсутнасці неабходнага досведу работы і падрыхтоўкі настаўнікаў гісторыі, нацыянальнай гістарычнай літаратуры: гэта адбываецца як ва ўстановах сярэдняй адукацыі («... што я выкарыстоўвала: Ластоўскага В., «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» Ігнатоўскага У., Міколу Ермаловіча «Старажытная Беларусь» (гэта той перыяд, якім я займалася), і яшчэ дапамагала тое, што я жыла ў Полацку. Горад гістарычны, уласна кажучы, калыска гісторыі нацыяналізму», – адзначае настаўніца гісторыі), так і ў вышэйшых навучальных установах (адсутнасць літаратуры, якая адпавядае патрабаванням сённяшняга дня, пацвярджае эксперт І. Раманава). Аднак «інфармацыйны голад» аказвае станоўчы ўплыў на фармаванне гістарычнай памяці, успамінаў і патрабуе захавання інфармацыі. Кнігі, якія выходзілі ў пачатку 90-х гг., знікалі як «гарачыя піражкі» (І. Раманава), абмяркоўваліся і выкарыстоўваліся на ўроках

і лекцыях. Настаўнікі пад дыктоўку запісвалі тэмы на семінарах па вывучэнні вучэбнага прадмета "Гісторыя Беларусі". У гэты перыяд у баку застаецца дыскурс вайны, які займаў значнае месца ў савецкай гісторыі ў вобразе воіна-вызваліцеля. Галоўным становіцца ўсведамленне ўласнай гісторыі ў кантэксце гісторыі Еўропы як раўнапраўнай нацыі-дзяржавы.

**Пераўтварэнне месцаў памяці** ажыццяўлялася ў сувязі са спробай адраджэння нацыянальных культурных традыцый – правядзення Першага Усебеларускага Купалля на гары Радагошча, недалёка ад возера Свіцязь, правядзенне першай турыстычна-краязнаўчай экспедыцыі школьнікаў «Наш край».

**Змена адчування часу** была важным кампанентам стварэння нацыянальнай памяці: неабходна было адысці ад лінейнага ўспрымання гісторыі, традыцыйнай для савецкай гістарыяграфіі, выкладзенай у падручніках Л. Абэцэдарскага, Э. Загарульскага. Гісторыя Беларусі павінна была актывізаваць нацыянальную годнасць, нацыянальную свядомасць, стаць цэнтрам разумення беларускага лёсу, аднавіць і звязаць вымытае мінулае з сучаснасцю.

**Выкарыстанне сімвалічнага шэрагу.** На першых папяровых вокладках падручнікаў па гісторыі Беларусі, быў бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня», якія так і засталіся ў свядомасці настаўнікаў і вучняў, якія па іх вучыліся, як першыя кнігі са сцягам. Першая дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Беларусь так і замацавалася ў калектыўнай памяці як нацыянальная сімволіка «Пагоні».

**Актыўнае выкарыстанне сродкаў масавай інфармацыі.** У пачатку 90-х гг. быў створаны шэраг перыядычных выданняў, у асноўную задачу якіх уваходзіла публічнае абмеркаванне працэсаў, якія адбываюцца ў адукацыі, метадычная дапамога настаўнікам, давядзенне да ведама нарматыўных дакументаў, друкаванне новых матэрыялаў па гісторыі Беларусі, яе гісторыі і традыцыях. У гэты перыяд пачынаюць выходзіць часопісы: «Беларускі гістарычны часопіс», «Пачатковая школа», «Пралеска», «Адукацыя і выхаванне», «Беларуская мова і літаратура» і інш. Актыўна выкарыстоўваецца «Настаўніцкая газета», у якой праходзіла адкрытае публічнае абмеркаванне гістарычнай канцэпцыі.

## РЭАЛІЗАЦЫЯ МОЎНАЙ ПАЛІТЫКІ

«Закон аб мовах» заклаў падмурак моўнай нацыянальнай палітыкі. Разам з тым, камандна-адміністратыўная сістэма ўвядзення беларускай мовы ва ўстановах адукацыі Рэспублікі з жор-

сткім адміністрацыйным кантролем «не магла скончыцца нічым добрым» (такую ацэнку дае П.В. Церашковіч, член часовага навукова-даследчага калектыву “Нацыянальная школа Беларусі”). На падставе разгляду дадзеных архіўных дакументаў быў зроблены аналіз ходу выканання «Закона аб мовах», які ўмоўна можна падзяліць на два перыяды: першы перыяд ахоплівае 1991–1993 гг., падчас якога адбываецца інтэнсіўнае ўкараненне беларускай мовы ва ўсіх тыпах адукацыйных устаноў; другі перыяд – 1994–1995 гг., калі адбываецца крытыка працэсу беларусізацыі адукацыі, прыніжэнне значэння дасягнутых поспехаў.

Першы перыяд 1991–1993 гг. можна ахарактарызаваць як перыяд адміністрацыйнага кантролю на ўсіх узроўнях адукацыйнай сістэмы. На першы план аналізу работы ўстаноў выходзілі дасягнутыя поспехі ў пытаннях адраджэння мовы, выхаванні любові да гісторыі роднага краю, правядзенню тэматычных вечароў, пастановак на беларускай мове і г.д. Але выявіліся і наступныя праблемныя зоны правядзення моўнай палітыкі, якія адзначаюцца ў аналітычнай частцы загадаў Міністэрства адукацыі таго часу:

1. Нягледзячы на паступовае павелічэнне беларускамоўных класаў і дашкольных груп, Міністэрства адукацыі адзначала, што тэмпы не дастаткова высокія для пераходу ўсіх агульнаадукацыйных школ і дзіцячых дашкольных устаноў на беларускамоўны рэжым працы ў вызначаны законам тэрмін.

2. Не хапае прыхільных да беларускай мовы настаўнікаў-прадметнікаў, нават для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, настаўнікаў пачатковых класаў частка лекцый чытаецца на рускай мове, не кажучы ўжо пра настаўнікаў-прадметнікаў.

3. Не наладжана дыферэнцыраваная курсавая перападрыхтоўка настаўніцкіх кадраў.

4. Не хапае падручнікаў для беларускамоўных класаў. Эканамічны крызіс і планавая эканоміка не ў стане хутка падладжвацца пад зменлівыя ўмовы, пад тэмпы адкрыцця беларускамоўных дашкольных груп і класаў.

5. Адбываецца працэс дыскрымінацыі ў сістэме адукацыі, толькі агульнаадукацыйныя школы пераўтвараюцца ў ліцэі і гімназіі.

6. Адсутнасць вузкапрофільных, тэхнічных слоўнікаў і інш. Разуменне Міністэрствам адукацыі таго, што хуткае ўвядзенне беларускай мовы ў адукацыі немагчымае, прывяло да другога перыяду – крытыкі ўвядзення беларускай мовы, падтрымкі актыўных нападак на беларускую мову, у якасці апраўдання немагчымасці раптоўнай беларусізацыі.

1994 год становіцца крытычным годам у фармаванні моўнай палітыкі. Ствараюцца перадумовы для ўвядзення двухмоўя на дзяржаўным узроўні. Міністэрства адукацыі ініцыіруе вялікую колькасць праверак выканання “Закона аб мовах”, што ў значнай ступені спрыяе так званым асіметрыям (у далейшым – асіметрыям памяці) паміж выканаўцамі і кіраўнікамі, выклікае траўматычныя перажыванні і непрыманне мовы сярод часткі насельніцтва, прыводзіць да адмовы і пазбягання не толькі яе камунікатыўнага складніка, але і моўнай гісторыі, нацыянальных традыцый, выклікае супраціў пры ўвядзенні беларускамоўнага курсу гісторыі Беларусі. Калектыўная памяць актыўна выкарыстоўвае механізмы выцяснення іншароднага, чужога, непрынятага, навязанага.

Рэферэндум 1995 года па пытанні моўнай палітыкі быў неабходны для афармлення ўжо прынятага палітычнага рашэння. Уплыў на калектыўную памяць беларускага народа адбываўся ў выніку адкрытых дэбатаў на сесіях Вярхоўнага Савета. Пры гэтым выбар народа на рэферэндуме быў наканаваны: эмацыйная настальгія па нядаўнім мінулым, якая падаграваецца сродкамі масавай інфармацыяй, індывідуальным супрацівам у прыняцці беларускай мовы як часткі нацыянальнай памяці, і адсутнасцю дыстанцыі паміж нацыянальнай памяццю як асновай суверэнітэту і калектыўнай памяццю савецкага мінулага.

Увядзенне беларускай мовы выклікала канфлікт памяці на ўзроўні камунікацыі, калі звыклыя рамкі не ў стане змяніцца пад дзеяннем аўтарытарнага ціску і выклікаюць значны супраціў паміж пакаленнямі: бацька глядзіць на сваё беларускамоўнае дзіця як на дзіця, дрэнна адукаванае па-руску. Такая сітуацыя становіцца траўматычнай для большасці насельніцтва краіны. Калектыўная памяць, якая склалася на аснове ладу савецкага чалавека, які выкарыстоўвае рускую мову як адзіна магчымы сродак камунікацыі, выявілася не гатовай перабудоўвацца пад уплывам зверху спушчанага Закона.

Беларуская мова стала часткай камунікатыўнай памяці групы інтэлектуалаў, актывістаў, студэнтаў беларускамоўных патокаў, што падзялілі і прынялі культурнае адраджэнне як частку ўласнай культурнай і сацыяльнай памяці, заснаваных на ўспамінах аб дасавецкім перыядзе, этнічных традыцыях і пераасэнсаванні гістарычных фактаў.

## РЭАЛІЗАЦЫЯ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ШКОЛЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь стварыла досыць дэмакратычныя ўмовы для аўтараў Канцэпцыі нацыянальнай школы, аўтараў падручнікаў па гісторыі Беларусі і гістарычнай канцэпцыі. Гістарычную палітыку нельга разглядаць у адрыве ад моўнай палітыкі, бо памяць нацыі непарыўна звязана з мовай камунікатыўных зносін.

Нацыянальная Канцэпцыя гісторыі і гістарычнай адукацыі Рэспублікі Беларусь, стала прагрэсіўным дакументам у галіне нацыянальнай гістарычнай палітыкі, бо імкнулася цалкам адысці ад савецкага ўспрымання гісторыі – яе дэнацыяналізацыі. Паралельна з Канцэпцыяй ішла распрацоўка навучальных праграм па гісторыі Беларусі, увядзенне курса гісторыі ў навучальны план устаноў адукацыі і вылучэнне гадзін у рамках вучэбнага плана для дадзенага прадмета. Канцэпцыя была напісаная на беларускай мове, утрымлівала ў сабе базавыя пастулаты праграм і зместу гістарычнай адукацыі.

У аснову Канцэпцыі была пакладзеная ідэя паслядоўнага і супярэчлівага развіцця беларускага грамадства. Адзначалася, што вывучэнне гісторыі ў 5–11 класах будзе спрыяць нацыянальна-культурнаму адраджэнню беларускага этнасу, разуменню непаўторнасці гістарычнага шляху і разумення нацыянальных адрозненняў і каштоўнасцяў ад іншых еўрапейскіх этнасаў і культур.

Аўтары Канцэпцыі адышлі ад лінейнага прынцыпу пабудовы гісторыі, прынятай у савецкай гістарыяграфіі, і перайшлі да канцэнтрычнага метаду вывучэння гісторыі, які дазваляе асвятліць заканамернасці палітычнага, сацыяльнага, культурнага, эканамічнага ладу жыцця беларусаў.

У выніку працы над канцэпцыяй было асэнсавана месца сярэдняй школы ў сістэме адукацыі як галоўнага звяна ў развіцці светаўспрымальнай пазіцыі навучэнцаў, якая фарміруецца настаўнікамі на аснове паважлівага стаўлення да асобы. Зменлівыя палітычныя ўмовы не спрыялі рэалізацыі і разуменню канцэпцыі нацыянальнай школы на ўзроўні Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь. Канцэпцыя патрабавала змены падыходаў да навучання, у выніку якога фармуецца светапоглядны плюралізм, разнастайнасць ідэалаў грамадска-палітычнага жыцця, якое выяўляецца ў прызнанні суб’ектыўнасці свету рэчаў, якія патрабавалі, у тым ліку і ўнутранай, асобаснай пабудовы «савецкага чалавека» з трывалымі рамкамі памяці пра тое , што існуе адзіна дакладнае, аб’ектыўна-лагічнае тлумачэнне, у якім няма месца асабістым думкам. Канцэпцыя не надавала ўвагі канфлікту паміж

гістарычнымі наратывамі савецкага і нацыянальнага.

Канцэпцыя гісторыі і гістарычнай адукацыі ў большай меры аказала ўплыў на нацыянальную палітыку Рэспублікі Беларусь, бо была падтрыманая на ўсіх узроўнях улады. Перагляд зместу гістарычнай адукацыі, выкліканы нацыянальным адраджэннем, прывёў да змены разумення месца беларускай нацыі ў еўрапейскай гісторыі, разумення таго, адкуль пайшлі беларусы і які іх шлях. Стварэнне канцэпцыі разглядаліся як важны палітычны крок да адраджэння гістарычнага мінулага. Аўтары гістарычнай канцэпцыі імкнуліся сфармаваць сувязь паміж абноўленым зместам мінулага і сучаснасці, якая аформілася ў ідэю аб суверэннасці Беларусі. Унікальны гістарычны шлях беларусаў дазваляе разглядаць будучыню нацыі незалежна ад моцных дзяржаў.

Адсутнасць дзяржаўнай цэнзуры спрыяла змене «рамак памяці», іх трансфармацыі ў выглядзе адраджэння беларускай культуры, мовы, дзяржаўных сімвалаў (сцяг і герб «Пагоня»), якія становяцца галоўнымі складнікамі нацыянальнай палітыкі памяці. Калі 1993 год быў годам актыўнага фармавання нацыянальнага дыскурсу вядучымі гісторыкамі-інтэлігентамі, то 1994 стаў годам, пераломным для нацыянальнай палітыкі памяці і годам станаўлення новай афіцыйнай палітыкі. Умоўна яго можна падзяліць на два перыяды: да выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і пасля выбараў, што адбілася на змене міністра адукацыі напярэдадні пачатку навучальнага года. Палітычная рэальнасць аднаўлення сяброўства з «братэрскім народам», 50-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне – гэта абноўлены падмурак калектыўных памятных успамінаў.

1995 год становіцца годам крызісу гістарычнай навукі, вяртання палітыкі замоўчвання і рэтушавання гісторыі. 6 чэрвеня 1995 года выдаецца загад № 276 міністэрства адукацыі, за подпісам У. Стражава «Аб стварэнні экспертных груп па перагляду зместу вучэбных праграм і падручнікаў па курсах гісторыі і гуманітарных дысцыплін агульнаадукацыйнай школы»: «У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі ад 06.09.1995г. № 07-304-336 зацвердзіць склад экспертных груп па перагляду зместу вучэбных праграм і падручнікаў па гуманітарных дысцыплінах агульнаадукацыйнай школы». У сваім інтэрв’ю Г. Сагановіч згадваў пра ўказ Прэзідэнта аб выключэнні новых нацыянальных падручнікаў гісторыі, на партале Human Rights Watch таксама згадваецца дырэктыва аб канфіскацыі школьных падручнікаў і вяртанні да савецкіх падручнікаў, якая ў далейшым была адкліка-

ная і выкрасленая са справаводства. Тым не менш, выконваючы даручэнне Прэзідэнта, ствараецца камісія пад кіраўніцтвам У. Заматаліна, у склад якой уключаецца аўтар былых савецкіх падручнікаў па гісторыі БССР Э. Загарульскі. Гэта прыводзіць да перагляду зместу навучальных праграм па гісторыі і падручнікаў. У той жа час, некаторыя аўтарскія калектывы, у прыватнасці «Гісторыя Беларусі старажытных часоў» для 5 класа агульнаадукацыйных школ аўтараў Г. Штыхава, У. Пляшэвіча, В. Фядуты, атрымліваюць грыф «Дапушчана Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь» у якасці навучальнага матэрыялу. У снежні 1995 года ствараецца дзяржаўная камісія па падрыхтоўцы новых падручнікаў у гуманітарна-грамадзянскай сферы.

Наступныя гады сталі гадамі барацьбы з беларускімі гісторыкамі ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі і Гродзенскім дзяржаўным універсітэце. Паступовае выцясненне нацыянальнай гістарычнай палітыкі на перыферыю стварае, з аднаго боку, цэнтр камунікатыўнай памяці, зоны альтэрнатыўнай нацыянальнай памяці, з другога боку, адбываецца мэтанакіраваная палітыка фармавання афіцыйнай памяці, вычышчанай ад альтэрнатыў.

На фоне маштабных падрыхтовак да святкавання 50-годдзя Вялікай Перамогі, актывізацыі калектыўнай памяці нядаўняга мінулага трагедыя нацыянальнай гісторыі застаецца фактычна незаўважанай.

Такім чынам, пацвярджаючы словы Э. Хабсбаўма (Hobsbawm 1983), адных намаганняў інтэлектуалаў па фармаванні новых традыцый недастаткова. Недэмакратычны рэжым з каманднa-адміністрацыйнымі традыцыямі прыняцця і выканання загадаў, пры страце ідэалагічнага складніка, адметнай рысы гістарычнай палітыкі ў Савецкім Саюзе, выявіўся не здольным стварыць прастору, здольную змясціць у сябе адраджэнне культурных традыцый, зрабіць мову нацыянальным здабыткам Рэспублікі, прыняць гістарычную праўду пра ўнікальнасць беларускага шляху. Кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь, у прыватнасці Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, аказалася не гатовым да пераадолення мнеманічнай цэнзуры, сфармаванай у савецкія гады, а менавіта: замоўчванне пра існаванне беларускамоўнага сельскага насельніцтва, пра траўматычныя падзеі нацыянальнай гісторыі савецкага перыяду, «накладанне» табу на ўжыванне беларускай мовы ў паўсядзённай камунікацыі, рэтушаванне беларускай гісторыі, мэтанакіраванай стратэгіі забыцця нацыянальнай культуры і выцяснення яе ў галіну сацыяльнай культурнай памяці. Неабходна было

афіцыйнае, дзяржаўнае, публічнае прызнанне траўматычнага мінулага, спадчыны Савецкага Саюза, які абязлічыў нацыянальную самасвядомасць беларускага народа.

## ТРАЎМАТЫЧНЫ ЗЛОМ І АФІЦЫЙНАЕ АФАРМЛЕННЕ ПАЛІТЫКІ ПАМЯЦІ

Афіцыйная палітыка памяці, якая прыйшла на змену нацыянальнай гістарычнай палітыцы памяці і савецкай гісторыі, не магла абраць цалкам «вычышчаны нацыянальны варыянт» гісторыі. Нацыянальнае «адраджэнне» актыўна ўключаецца ў калектыўную памяць у якасці нядаўняга мінулага. Мінулага, якое нясе ў сабе беларускі нацыяналізм і з’яўляецца апазіцыйным для дзейнай улады, і выкарыстоўваецца ў рознай меры ў якасці альтэрнатыўнай гістарычнай памяці. Для афіцыйнай палітыкі памяці, выкарыстоўваючы забарону на нацыянальную гісторыю, заставалася адна магчымасць – гэта мяккае рэтушаванне, закрытасць, інтэрнацыяналізацыя памяці, аднабаковасць у бачанні супраціву беларускага народа супраць улады, інклюзіўнасць у якасці ўключэння абраных, найбольш бяспечных тым сярэднявечнай Беларусі. Вялікая Айчынная вайна стала адзіна магчымым варыянтам, якая выклікала няхай не столькі нацыянальныя, колькі патрыятычныя пачуцці ў нацыі. У сваім падручніку па гісторыі Беларусі 1917–1992 гг. ва ўступным слове В. Сідарцоў напісаў: «...Таму пачэснае месца ў нашай гісторыі вернута тым, хто быў выкраслены з яе старонак бальшавіцкай таталітарнай уладай і залічаны ў лік ворагаў». Афіцыйная, прымусовая палітыка памяці прывяла да трансфармацыі і згладжвання сказа, але ён носіць глыбокі інклюзіўны сэнс: «... Таму звяртайце ўвагу на тых, хто непасрэдна ўдзельнічаў у гістарычным працэсе, спрабуйце зразумець матывы іх паводзін альбо паставіць сябе на іх месца». Як адзначае ў інтэрв’ю І. Раманава, ёсць гісторыкі ў Беларусі, якія сумленна вераць у тое, што калі на фатаграфіі намаляваны радасныя людзі, якія сустракаюць 7 лістапада, то гэта адпавядае радасці ўсёй беларускай нацыі, што кожны беларус ішоў сустракаць 7 лістапада ў самым лепшым (нават у басаножках). У гэты ж самы час І. Раманава бачыць на фатаграфіі зусім іншае: людзей прымусілі сфатаграфавацца для гісторыі. «Можа іх (гісторыкаў) доўга «білі па галаве», каб бачыць тое, што трэба? – кажа І. Раманава. – Але тады няхай выпускаюць метадычкі, якія б раскрывалі змест работы з ілюстрацыйным матэрыялам у тым ліку».

Пераход ад нацыянальнай палітыкі памяці да афармлення афіцыйнай палітыкі памяці ў Беларусі адбыўся ў кароткі палітычны перыяд сапраўднай незалежнасці Беларусі. Гэты перыяд можна

ўмоўна падзяліць на тры этапы, падчас якіх адбылася змена парадыгмаў.

На пачатковым этапе 1991-1993 гг. адбывалася хуткая змена этапаў парадыгмаў палітыкі памяці: ад перабудовы «савецкай спадчыны памяці» да нацыянальнай палітыкі памяці. Гэтаму спрыяла наданне беларускай мове статусу дзяржаўнай і прызнанне нацыянальнага суверэнітэту. Зоны напружання, «анамаліі»назапашваліся ў адказ на каманднае ўкараненне беларускай мовы ў сістэму адукацыі, што, у сваю чаргу, адбівалася на напружаным успрыманні гісторыі Беларусі: недахоп навуковай і вучэбнай літаратуры, неабходнасць пераасэнсавання новага гістарычнага зместу на беларускай мове. Пры гэтым адбываўся канфлікт памяці паміж «савецкай» калектыўнай памяццю, традыцыямі, гісторыяй, моўнай камунікацыяй, культурай, спосабамі навучання і камунікатыўнай памяццю «нацыянальнага адраджэння», якая імкнецца падзяліць агульную калектыўную прастору праз абноўленую інтэрпрэтацыю мінулага.
«Анамаліі» ўзніклі ў адказ на хуткі пяцігадовы тэмп увядзення беларускай мовы, закладзены каманднa-адміністрацыйнай палітыкай, без стварэння фундамента: бюджэта, навучання, падрыхтоўкі і перепадрыхтоўкі кадраў, паступовага ўвядзення беларускай мовы ва ўсіх сферах жыццядзейнасці, стварэння прафесійных слоўнікаў і г. д. Разуменне кіраўніцтвам немагчымасці перайсці на беларускую мову цалкам, на працягу меркаванага дзесяцігадовага тэрміна, спрыяла павелічэнню асіметрыі памяці паміж рускамоўным насельніцтвам і беларускамоўным. Асіметрыя памяці стварыла ўмовы для маніпулявання палітыкай памяці, крытыкі адукацыйнага працэсу і нападаў на палітыку адраджэння нацыянальнай гісторыі. Паступовае пераўтварэнне палітыкі. Адбываецца не «крок наперад», а «крок назад» да мінулай сацыяльнай памяці і спосабу кіравання адукацыяй. Абарона моўнай і гістарычнай палітыкі праз сістэму адукацыі ў выглядзе аналітычных даведак правяраючых не прыносіць дзейснага выніку, таму эксперымент выражаецца не ў новых формах паляпшэння палітыкі праз адкрытую публічную дыскусію прызнання адказнасці за змяненні, якія адбываюцца, а да рэцэнзавання, утойвання праблем, канфліктаў у адукацыі. Магчыма, унутраная барацьба за ўплыў, пра якую казаў Г. Сагановіч у інтэрв'ю, і прыводзіць да вяртання памяці, настальгіі па савецкім мінулым. Змены, якія адбываліся на дадзеным этапе, паказваюць няздольнасць беларускай камандна-адміністрацыйнай сістэмы прызнаць траўматычнасць новаўвядзенняў. Беларуская сістэма адукацыі выявілася не гатовай самастойна распрацаваць паэтапную праграму рэарганізацыі зместу нацыянальнай сістэмы адука-

цыі, для якой ужо быў створаны падмурак у выглядзе Канцэпцыі нацыянальнай школы і Канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі. Традыцыя залежнасці кіравання адукацыяй ад маскоўскага цэнтра пазбаўляла беларускую сістэму незалежнасці ў выглядзе навукова-метадычных баз адукацыі, якія функцыянуюць самастойна. Наяўныя нацыянальныя інстытуты развіцця адукацыі былі не гатовыя да выпуску неабходнага навуковага і вучэбнага інструментарыю. Апрабацыі навучальных дапаможнікаў, рэцэнзаванне падручнікаў насіла фармальна-асобасны характар, што прыводзіла да допуску/нядопуску навучальнага дапаможніка да друку пад грыфам Міністэрства адукацыі, альбо падручнік з рэкамендацыямі аб дапрацоўцы пад новыя палітычныя ўмовы, якія вымушаны былі выпраўляць аўтары.

Нацыянальная палітыка памяці патрабавала не толькі перабудовы адукацыйнай сістэмы, але і вырашэння канфлікту пакаленняў, калі «савецкія бацькі» не разумеюць і не прымаюць іншасць сваіх «беларускіх дзяцей». Узнікае канфлікт памяці на ўзроўні пакаленняў, які вядзе да шматлікіх калектыўных «анамалій» і зон павышанага напружання. Прапанаваныя формы зняцця напружання ў выглядзе тлумачэнняў патрэбнасці палітыкі ўладаў, аналізу сітуацыі з пазіцыі пасляховасці фармавання моўнай палітыкі не з’яўляюцца эфектыўнымі. Пачынаецца актыўны працэс змены парадыгмы палітыкі памяці, які выяўляецца ў зняцці з нацыянальнага акцэнту незалежнасці на традыцыйна патрыятычную парадыгму перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Памяць аб перамозе беларускага народа ў вайне, пасля замацаваная ў афіцыйнай палітыцы памяці, якая эмацыйна падзялялася пакаленнямі і забяспечвала прывязку сённяшняга (абароны новага пакалення) і мінулага (гонар за подзвіг старэйшага пакалення). Выбары першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і змяненні ў правядзенні палітыкі спрыялі фрагментаванасці палітыкі памяці: прызнанне рускай мовы ў якасці другой дзяржаўнай стварае апазіцыйнасць беларускай мове, перагляд зместу нацыянальных падручнікаў гісторыі павялічвае асіметрыю памяці за кошт настальгічнага вяртання да мінулага.

Крызісны этап 1994–1995 гг. На дзяржаўным узроўні адбываецца адмова ад нацыянальнай палітыкі памяці і прынящце адзіна магчымай патрыятычнай парадыгмы перамогі. Вялікая Айчынная вайна ў якасці гістарычнай памяці нацыі праходзіць рэтушаванне, адбываецца зрушэнне акцэнту з савецкага вобразу воіна-пераможцы на вобраз пераможцы беларускага народа ў нялёгкай барацьбе з фашызмам на акупаваных тэрыторыях. Іншых альтэрнатыўных версій, здольных пераўтварыць нацыянальную

палітыку памяці, не агучвалася. Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь вымушана было прызнаць неабходнасць у змене моўнай палітыкі ў залежнасці ад прынятага рашэння на найвышэйшым узроўні.

Публічнае аспрэчванне рэалізаванай афіцыйнай палітыкі памяці характарызуецца супрацівам бацькоўскай грамадскасці скарачэнню беларускамоўных класаў і пераводу навучэнцаў на рускую мову навучання. Меркаванні тых, хто хоча захаваць мову навучання, фактычна не ўлічвалася і прапаноўвалася знайсці школу, дзе класы ахвочых могуць быць укамплектаваныя. Міністэрства адукацыі на дадзеным этапе вымушана было вырашаць канфлікты з нагоды беларускамоўных класаў на карысць рускамоўных. Таксама міністэрства адукацыі мела патрэбу ў тлумачэнні вызначэння на дзяржаўным узроўні моўнай палітыкі, якая рэалізоўваецца, якая не стыкуецца з усталяванай на заканадаўчым узроўні. Змены, якія закранулі гістарычную палітыку, падручнікі, накіраваныя на дэнацыяналізацыю, дэпартызацыю і дэідэалагізацыю, былі бачныя гісторыкам, якія супрацьўляліся ў Інстытуце гісторыі НАН, на гістарычных факультэтах да таго часу, пакуль не былі праведзеныя кадравыя перастаноўкі і звальненні. Для калектыўнай грамадскасці змены адбываліся незаўважна.

Этап афармлення афіцыйнай палітыкі памяці 1995–2001 гг. У 1997 г. перавыдадзеныя рэцэнзаваныя падручнікі гісторыі Беларусі, зменены змест курсаў беларускай мовы і літаратуры. Змененая сетка навучальных устаноў: адбылося вяртанне да рускамоўных школ і патокаў у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

«Адраджэнню» нацыянальнай гісторыі і культурных традыцый у значнай меры спрыяла палітыка беларусізацыі, распачатая ў 1990 годзе пасля падпісання «Закона аб мовах у Беларускай ССР».

Распрацаваныя ў сістэме адукацыі дакументы – Канцэпцыя нацыянальнай школы, Канцэпцыя гісторыі і гістарычнай адукацыі – у 1991–1993 гг. насілі наватарскі, творча асэнсаваны характар, тэкст якіх быў напісаны без адміністрацыйнага і дзяржаўнага кантролю, што стварала магчымасці для пашырэння рамак нацыянальнай памяці. Перадавыя ідэі нацыянальнага будаўніцтва не заўсёды знаходзілі разуменне ў рамках навуковага падыходу ў Міністэрстве адукацыі, што выклікала зоны напружання ў галіне правядзення нацыянальна-гістарычнай палітыкі памяці.

Камандна-адміністрацыйнае ўвядзенне беларускай мовы выклікала зону напружання і адчужэнне рускамоўнага насельніцтва краіны, што прывяло да канфлікту памяці на ўзроўні камунікацыі.
Змена парадыгмы палітыкі памяці з нацыянальнай на афіцыйную стала адбывацца да выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у першым паўгоддзі 1994 года. Можна меркаваць, што змена парадыгмы гістарычнай палітыкі памяці была падрыхтаваная загадзя для ўзмацнення канфлікту памяці беларускага народа і стварэння зон павышанага напружання ў галіне адраджэння нацыянальнай палітыкі памяці.

Недэмакратычны рэжым, а менавіта камандна-адміністрацыйная сістэма ціску, спрыяюць фрагментацыі нацыянальнай памяці на ўзроўні камунікатыўнай памяці ў тым выпадку, калі гаворка ідзе пра пераходныя перыяды змены палітычнага ладу і палітычнай адлігі. Фрагментацыя камунікатыўнай памяці ў сістэме адукацыі выяўляецца ў змене інтэрпрэтацый «савецкай» і нацыянальнай гісторыі, неабходнасці атрымання новых гістарычных ведаў усімі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу, у правядзенні моўнай палітыкі, неабходнасці пераходу на беларускую мову навучання на працягу пяці гадоў ва ўстановах адукацыі.

Фрагментацыя камунікатыўнай памяці на ўзроўні міжасобасных і межпакаленчых зносін выклікала «анамаліі», канфлікты памяці, якія прывялі да розных асіметрый калектыўнай памяці:
1992–1993 гг. – асіметрыя нацыяналізму. Перыяд, калі ішло актыўнае фармаванне нацыянальнай гістарычнай палітыкі, беларусізацыі і адраджэння культурных традыцый. Адбывалася трансфармацыя савецкай памяці нацыі ў нацыянальную калектыўную памяць нацыі, якая ўключае ў сябе абноўлены змест гісторыі пра мінулае.

1994–1995 гг. – асіметрыя афіцыйнай памяці. Узнікненне супраціву працэсам нацыянальнага будаўніцтва. Падтрымка ідэй двухмоўя, памяці пра вайну, апазіцыйнасці нацыянальнай гісторыі. Узніклы канфлікт памяці ў далейшым стаў выяўляцца ў палітычна негатыўным успрыманні нацыянальнай гісторыі, якая пачала маркіравацца як апазіцыйная і забароненая.

Калектыўная памяць нацыі сутыкнулася з неабходнасцю пераасэнсавання альтэрнатыўных версій гістарычнага мінулага – нацыянальнай і савецкай гісторыі. Нацыянальная версія гісторыі

напоўнілася ўтрыманнем табуяваных і замоўчаных тэм: аб «залатым стагоддзі» Вялікага Княства Літоўскага, рэпрэсіях 20-30-х гадоў XX стагоддзя, аб гвалтоўнай русіфікацыі і калектывізацыі і г. д. Адкрытасць дыскусій дазволіла прыняць траўматычныя падзеі найбліжэйшага мінулага, але не было публічна афармлена прызнанне адказнасці і віны нацыі за людскія трагедыі. Нацыянальная гісторыя недаацаніла значнасць калектыўнай памяці пра вайну, якая перажывалася як траўматычная, стварыўшы дадатковую сітуацыю траўмы і магчымасць маніпулявання памяццю пра Вялікую Айчынную вайну.

Такім чынам, нацыянальная гісторыя не змагла стаць падзеленай калектыўнай памяццю нацыі, не прызнаўшы права «савецкай» інтэрпрэтацыі траўматычнай памяці пра вайну як значнага факта ў жыцці беларускай нацыі.

Афіцыйная гістарычная палітыка, якая ўзнікла ў выніку змены парадыгмы палітыкі памяці з нацыянальнай на афіцыйную, адкрыта падвергла крытыцы нацыянальныя ідэі і ўключыла памяць аб вайне ў кантэкст гісторыі Беларусі як значны здабытак беларускага народа.

У выніку змены парадыгмаў палітыкі памяці нацыянальная гістарычная палітыка падверглася рэзкай крытыцы і набыла палітычна негатыўную афарбоўку, што прывяло да неабходнасці трансфармавання гістарычнай палітыкі. Вяртанне да савецкай гісторыі было ўжо немагчымым, бо нават праз супраціў нацыянальная гісторыя прымалася ў якасці значнага памятнага мінулага і звязвалася з палітычнымі падзеямі сучаснасці. Уплыў знешняй палітыкі і ціск з расійскага боку ў галіне гістарычнага супрацоўніцтва вялі да змякчэння фармулёвак, палітыцы недагляду значных падзей XX стагоддзя, але патрабавала захавання нацыянальнага суверэнітэту беларускай дзяржавы. У такой сітуацыі патрабавалася стварэнне памятных падзей мінулага нацыі. Памяць пра Вялікую Айчынную вайну была значнай, падзеленай калектыўна, траўмавальнай памятнай падзеяй нацыі. Сітуацыя, якая склалася, спрыяла камемарацыі вайны: 1994–1995 гг. – гэта гады святкавання 50-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, а значыць перыяду, цесным чынам звязанага з нядаўнім мінулым нацыі. У гэты перыяд памяць аб савецкай перамозе ў вайне раздзялялася значнай часткай беларусаў. Памяць пра вайну звязала мінулае з сучаснасцю нацыі, выклікаючы ў той момант пачуцці патрыятызму, любові да радзімы, павагу да ветэранаў і спрыяла раздзяленню індывідуальных і

калектыўных перажыванняў.

Такім чынам, афіцыйная палітыка памяці не можа мець альтэрнатыўных версій інтэрпрэтацыі гістарычных падзей. Нацыянальная гісторыя «прайграла» публічную крытыку таму, што стратэгіі замоўчвання і табуяванасці ў адукацыі з'яўляюцца традыцыйнымі працэсамі і падзяляюцца калектыўнай памяццю нацыі. Працэс траўматызацыі калектыўнай памяці мае патрэбу ў публічным прызнанні віны нацыі за выкладзеныя вышэй стратэгіі. Гэта дазваляе падзяліць адказнасць і ўключыць траўмавальнае мінулае ў якасці складовых альтэрнатыў нацыі. Нацыянальная палітыка памяці, якая пачынаецца як «адраджэнне» нацыянальнай гісторыі і беларускай мовы, культуры, традыцый і рэалізуецца праз сістэму адукацыі, не магла змяняць толькі нацыю, яна патрабавала змен і з боку членаў дзяржаўнага кіравання, якія не спяшаліся перабудоўваць сістэму пад зоны напружання, што ўзнікалі ў той час. Рэалізацыя палітыкі памяці праз сістэму адукацыі ў пераходны перыяд 1991–2001 гг. паказала асіметрыю памяці кіраўнічага апарата камандна-адміністрацыйнай сістэмы і беларускага народа. Кіраўнічы апарат выкарыстоўвае афіцыйную палітыку памяці ў якасці кіруючай палітыкі падпарадкавання і стварае ўласны варыянт асобай камунікатыўнай памяці ўлады, не падзеленай большасцю нацыі.

## СПІС КРЫНІЦ І ЛІТАРАТУРЫ

1. Ассман А. (2014) Длинная тень прошлого. Мемориальная культура и историческая политика. Пер. с нем. Хлебников Б. М.: Новое литературное обозрение.

2. Ассман Я. (2004) Культурная память. Письмо, память о прошлом и политическая идентичность в высоких культурах древности. М.: Языки славянской культуры.

3. Андерсон Б. (2001) Воображаемые сообщества. Размышления об истоках и распространении национализма. Даступна па спасылцы: http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Sociolog/anders/index.php (дата звароту: 21 лістапада 2016).

4. Біч М. (1993) Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Беларускі гістарычны часопіс, 1(1993): 15–24.

5. Волынец А. (2016) Как стирается историческая память белорусов. Даступна па спасылцы: https://thinktanks.by/publication/2016/06/14/kak-stiraetsya-istoricheskaya-pamyat-belorusov.html (дата звароту: 10 снежня 2017).

6. Геллнер Э. (1991) Нации и национализм. Даступна па

спасылцы: http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Polit/gelln/index.php (дата звароту: 25 снежня 2016).

7. Геллнер Э. (1992) Пришествие национализма. Мифы нации и класса. Путь: международный философский журнал, 1: 9 – 61.

8. Ластовский А. (2010) Историческая память как фактор укрепления белорусской национальной идентичности. Социологический альманах, 1: 187-195.

9. Ластовский А. (2010) Роль исторической памяти в формировании национальной идентичности. Информационно-образовательные стратегии в современном обществе: национальный и глобальный контекст. Мн.: Право и экономика.

10. Ластовский А. (2011) Русский национализм как идеологический проект белорусской идентичности. Форум новейшей восточноевропейской истории и культуры, 2: 187-209.

11. Ластовский А. (2009) Специфика исторической памяти в Беларуси: между советским прошлым и национальной перспективой. Вестник общественного мнения, 4.

12. Ластоўскі А. (2014) Улада і стварэнне гісторыі ў Беларусі: нататкі да канцэптуалізацыі. В: Беларусь в европейском контексте: актуальные дискуссии о нациостроительстве. Под ред. О. Шпрага, А. Смоленчука. Вильнюс: ЕГУ.

13. Нора П. (2009) Франция-память. Санкт-Петербург: Издательство С.-Петербургского университета.

14. Сідарцоў У., Фамін В. (1993) Гісторыя Беларусі: 1917 – 1996. Вучэб. дапам. для 9-га кл. сярэд. шк. Мн.: Народная асвета.

15. Хальбвакс М. (2005) Коллективная и историческая память. Неприкосновенный запас, 2 – 3.

16. Хальбвакс М. (2007) Социальные рамки памяти. Москва: Новое издательство.

17. Assman A. (2008) Canon and Archive. In: Erll A. Cultural Memory Studies. Berlin. New York: Walter de Gruyter: Sage: 97 – 108.

18. Assman J. (2008) Memory: Individual, Social, and Cultural. In: Erll A. Cultural Memory Studies. Berlin. New York: Walter de Gruyter: Sage: 109 – 118.

19. Hobsbawm E. (1983) The Invention of Tradition. Introduction: Inventing Traditions. London, New York: Cambridge University Press.

20. Hobsbawm E. (1983) The Invention of Tradition. Mass-Producing Traditions: Europe, 1870-1914. London, New York: Cambridge University Press.

# РЭПРАДУКАВАННЕ ПРАСТОРЫ ГВАЛТУ Ў ДЫСКУРСЕ РАСІЙСКІХ МЕДЫЯЎ ПРА ЗНЕШНЮЮ ПАЛІТЫКУ АДНОСНА УКРАІНЫ (2014-2017)

**Марыя Кацупалава, магістр палітычных навук (ЕГУ)**


## АНАТАЦЫЯ

Мэтай працы ёсць выяўленне спецыфікі інструментаў для легітымізацыі гвалту на пэўных тэрыторыях у рамках медыядыскурсу аб расійскай вонкавай палітыцы ў адносінах да Украіны ў 2014-2017 гг. У выніку аналізу дадзеных (расійскага навінавага медыядыскурсу) з дапамогай інструментаў крытычнага аналізу дыскурсу было выяўлена, што стратэгіі легітымізацыі гвалту на тэрыторыі Украіны ў сувязі з яе ўключэннем у нацыянальны наратыў Расіі могуць карыстаць або рацыянальны, або афектыўны прынцып легітымнасці ў якасці асновы ў залежнасці ад кантэксту (мясцовага або міжнароднага). Расійская знешняя палітыка і дыскурс пра яе супрацьстаяць (неа)ліберальным устаноўкам заходняга Іншага, які знаходзіцца ў цэнтры расійскага нацыянальнага наратыву і наратыву пра дзяржаўнасць праз канцэпцыю суверэннай дэмакратыі. Гэта дазваляе ўжываць і камбінаваць дзве розныя стратэгіі легітымацыі на ўкраінскіх тэрыторыях і іх прасторах гвалту.



## КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ:

Прастора гвалту, медыі, Расія, Украіна.


Цягам некалькіх апошніх дзесяцігоддзяў з прасоўваннем канструктывісцкага разумення прасторы (Springer, Le Billon 2016: 1–3) узрос даследніцкі інтарэс да сувязяў паміж прасторай і гвалтам у сацыяльных навуках. У цэнтры ўвагі гэтага даследавання, на якое натхнілі працы Янаша Прынца і Конрада Шэтэра (Prinz, Schetter 2017), Дэрэка Грэгары і Алана Прэда (Gregory, Pred 2006), знаходзіцца пытанне стварэння прасторы гвалту праз выкарыстанне інструментаў дыскурсу. Мэтаю працы з'яўляецца выяўленне інструментаў легітымізацыі гвалту з выкарыстаннем аналізу медыядыскурсаў пра расійскую замежную палітыку адносна Украіны ў 2014–2017 гг.

## НАРАТЫВЫ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ: СТВАРЭННЕ ПРАСТОРЫ, МЕЖАЎ І ГВАЛТУ

У той час, як Лефеўр (Лефевр 2015) піша пра прастору рэпрэзентацыі, а Харві (Харви 2011) адзначае асаблівасці вывучэння адноснай прасторы, абодва аўтары адзначаюць рэзка ўзрослую папулярнасць вывучэння прасторы і яе безумоўна важную недаацэненую кагнітыўную функцыю. Прастора і яе рэпрэзентацыі ўбудаваныя ўва ўяўленні – яны спараджаюцца з ментальных і культурных структур. З фармаваннем "тэрыторый дзяржаў" звязаная сацыяльная практыка (бюракратыя на межах, падаткаабкладанне, дарогі, паліцэйскія юрысдыкцыі і г. д.), створаная дзяржаваю, каб захоўваць тэрытарыяльнасць. Адначасова мясцовыя практыкі сацыяльнага ўзаемадзеяння і абменаў, досвед і мабільнасць характарызуюць іх з дапамогаю наратываў і вобразаў, якія праз дыскурс рэпрадукуюць тэрыторыю незалежна ад месца і прычыны стварэння. У гэтым артыкуле разглядаюцца глабальныя сацыяльныя змены і прычыны таго, чаму прастора, створаная наратывамі пра дзяржаву і нацыю, асабліва гнуткая.

Разуменне тэрытарыяльнасці дзяржавы выходзіць прыкладна да часоў Вестфальскай дамовы – яна ў значнай ступені разглядаецца як канцэнтрацыя права на легітымны гвалт (Бурдьё 2007: 226) суверэннай дзяржавы на яе тэрыторыях і неабходны нацыянальны кампанент дзяржаўнасці і суверэнітэту (Murphy 1996: 92). Яна была ў далейшым пацверджаная Ялцінска-Патсдамскай сістэмай міжнародных адносін. Канец XX стагоддзя стаў паваротным момантам для парадыгм міжнародных адносін, асабліва для тэарэтычнай інтэрпрэтацыі прасторы, тэрыторыі і суверэнітэту. Значныя змены ў звычайным светапарадку адбываюцца з адначасовым падвышэннем уплыву неаліберальнага разумення ўлады з манаполіяй на гвалт і тэрыторыю. Згодна з прынцыпамі вольнага рынку, электаральнай дэмакратыі і правоў чалавека як універсальных каштоўнасцей дзяржавы пераўтварыліся ў "моцныя дзяржавы з вольным рынкам" і моцным вайсковым апаратам (Bonefeld 2010: 15–24). У гэтым кантэксце нязменнасць межаў, вызначаных манаполіяй на гвалт, як аспект дзяржаўнасці слабне.

Глабалізацыя, як паказана рознымі даследаваннямі нацыяналізму, мае дваісты ўплыў на культурнае жыццё і ідэнтычнасць: чым мацнейшы ўплыў глабалізацыі на культурную і сацыяльную дыфузію, тым большы шанец узнікнення імкненняў да самавызначэння на мясцовым узроўні. Джон Уры (Urry 2000) лічыць марфалогію плыняў і сацыяльных сетак структурай улады, што змяняе сацыяльнае жыццё і робіць мяжу і тэрыторыю надзвычай неста-

більнымі. Гэта таксама значыць, што суверэнная нацыянальная дзяржава больш не можа адольваць выклікі глабальных праблем і тэндэнцый. Заходнія ідэі пра дзяржаўнасць, пазітывісцкае міжнароднае права і "публічныя" азначэнні ўлады не могуць уключыць узрослую важнасць недзяржаўных актараў у палітыцы і эканоміцы, нефармальных рэгулятыўных структур і прыватнай эканамічнай улады. Хэлд і Макгру (Held, Mcgrew 2003) падкрэсліваюць, што гэтая праблема з'яўляецца пагрозаю для суверэнітэту дзяржавы, межы якой цяпер пранікальныя. Менавіта гэты кантэкст "аслаблення" бачання межаў нацыянальнай дзяржавы з манаполіяй на гвалт на ўласнай тэрыторыі забяспечвае суіснаванне розных стратэгій легітымізацыі гвалту ўва ўзаемасувязі з прастораю, нават калі гэтыя стратэгіі ёсць спрэчнымі.

Постнеакласічны падыход разглядае працэсы стварэння нацыянальнай ідэнтычнасці і яе рэпрадукавання ў якасці наратыву ці дзейнасці калектыўных актараў адносна сябе і Іншага (Bhabha, 1993). Нацыянальная ідэнтычнасць ці сцвярджэнне "кім мы ёсць" і "чаго мы жадаем" выяўляецца праз гісторыі, алегорыі, метафары. Такім чынам, для вывучэння нацыянальнай ідэнтычнасці найбольш каштоўнымі аб'ектамі з'яўляюцца культурныя тэксты (мастацтва, літаратура, архітэктура, медыі і г.д.), а таксама камунікатыўная прастора, у якой гэтыя тэксты рэпрадукуюцца. Паколькі калектыўная ідэнтычнасць ствараецца з розных сацыяльных дзеянняў і наратываў, яна ёсць і мусіць быць рухомаю, адаптыўнаю з'яваю, што лёгка стварае новую кантэкстуалізацыю. Адказы на пытанні "кім мы ёсць?" і "чаго мы жадаем?" перафармулююцца залежна ад знешніх выклікаў. Як адзначае Анкерсміт у працы "Логіка наратыву" (2003), наратыўная рэпрэзентацыя ідэнтычнасці нацыі звязаная з уласцівасцямі і інструментамі мовы, што не дае магчымасці дыскрэтна апісваць унікальныя атрыбуты і маркеры суб'ектаў. Ідэнтычнасць можа рэпрэзентавацца толькі ў форме наратыву. Гелнер кажа пра фармаванне і рэпрадукаванне нацыянальнай ідэнтычнасці як адносна аўтаномны працэс у дачыненні да індывідуальнай гісторыі. Ён тлумачыць стратыфікацыю нацыянальнай ідэнтычнасці згодна з мэтамі і намерамі, якія пераследуюцца апісаннямі і рэпрэзентацыяй: апісанне мясцовых анталогій і досведу, з аднаго боку, і палітычна скіраваныя, нацыянальныя палітычныя наратывы, створаныя палітычнымі элітамі, з іншага (Gellner, 2008: 152).

Ансі Паасі (1998) і іншыя сучасныя палітычныя географы аб'ядноўваюць вышэйпаказаныя тэндэнцыі разумення прасторы і тэрытарыяльнасці дзяржавы, каб сфармаваць наратыў "нас" і "ін-

шых". Стварэнне каштоўнасцей грамад і іх межаў адбываецца праз гісторыі, якія надаюць людзям агульны досвед, гісторыю і ўспаміны і такім чынам звязваюць гэтых людзей праз важныя наратывы, якія маюць дачыненне да інстытутаў нацыі, дзяржавы і тэрыторыі. Яны звычайна звязаныя з анталагічнымі нарматывамі – гісторыямі, якія выкарыстоўваюць актары, каб зразумець уласнае жыццё ў якасці часткі грамад і вызначыць, кім мы ёсць. Больш за тое, аўтар адзначае, што не толькі наратывы пра нацыю канструююць рэпрэзентацыі адносна межаў і тэрытарыяльнасці, але што прасторавае ўяўленне дапамагае рэпрадукаваць ідэнтычнасць: "Межы паміж "намі" і "іншымі" ёсць важным элементам вызначэння "нас" і выключэння "іншых" (Paasi, 1998). Узрослая гнуткасць наратываў пра дзяржаву і нацыю, якія ствараюць ідэнтычнасць, маюць вынікам падвышаную дэстабілізацыю прасторы і межаў.

## СУВЯЗЬ ТЭРЫТОРЫІ І ЛЕГІТЫМНАГА ГВАЛТУ ПРАЗ АЗНАЧЭННЕ "НЕКАНТРАЛЯВАНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ", "РУСКАГА СВЕТУ" І "СУВЕРЭННАЙ ДЭМАКРАТЫІ"

Камбінацыя суверэнітэту з тэрытарыяльнасцю і манаполіяй на гвалт і нацыянальныя наратывы ўсё яшчэ з'яўляецца дамінантным прынцыпам сусветнага палітычнага парадку, нягледзячы на сучасныя глабальныя выклікі. Як гэтыя адносіны выкарыстоўваюцца і змяняюцца ў выпадках, калі тэрытарыяльная суцэльнасць дзяржавы парушаецца праз вайсковую інтэрвенцыю? Аўтар спрабуе знайсці адказ на гэтае пытанне, разглядаючы тэорыі прасторы гвалту і дыскурсную легітымізацыю ўзброеных інтэрвенцый з увагай да расійскай вайсковай прысутнасці ва Украіне.

Прынц і Шэтэр (2017) выкрываюць гвалтоўную логіку канцэпцый "уразлівых" і "недзеяздольных" дзяржаў, што закладае падмурак для легітымізацыі гвалту на "некіраваных тэрыторыях" Блізкага Усходу. Гэты тэрмін паходзіць ад супярэчлівага расколу канцэпцыі суверэнітэту. З аднаго боку, ідэя суверэнітэту неабходная, каб захаваць сталы светапарадак нацыянальных дзяржаў і іх тэрытарыяльнасці, калі манаполія дзяржавы на гвалт на ўласнай тэрыторыі залежыць ад прызнання факта суверэнітэту і аўтаноміі міжнароднымі актарамі. "Некіраваныя тэрыторыі" ў амерыканскім нацыянальным наратыве і рыторыка "вайны супраць тэрарызму" выкарыстоўваюцца, каб пасеяць паніку і стварыць у людзей неспакой перад "тэрыторыямі Іншага".

Расійская замежная палітыка адлюстроўвала гэты тэрмін на аснове канфрантацыі з заходнімі палітычнымі актарамі ў 2004–2008 гг., што ўзрастала, асабліва падчас пашырэння блока

АПАД на прыбалтыйскія дзяржавы і хвалі "каляровых рэвалюцый" у Грузіі, Украіне і Кыргызстане. Новая канцэпцыя неўмяшання ўва ўнутраныя справы, названая "суверэннай дэмакратыяй", была артыкуляваная. Значэнне гэтай канцэпцыі ёсць такім, што любая дзяржава ў яе ўнутраных справах мае права на ўласнае асаблівае разуменне дэмакратычнага развіцця, кіравання і адносін да грамадзянскай супольнасці ў межах краіны (Krastev, 2006), што наўпрост супрацьстаўляецца "ўразлівай" дзяржаве, якая не адпавядае "ўніверсальным" дэмакратычным прынцыпам. Гэтая канцэпцыя выкарыстоўвалася, каб артыкуляваць несправядлівасць умяшання Захаду ва ўнутраныя палітычныя крызісы іншых дзяржаў. Ядром гэтай канцэпцыі з'яўляецца разуменне заходніх дэмакратый як "слабых дзяржаў" – празмерна лібералізаваных і таму не здольных прымаць незалежныя рашэнні. Далей аўтар прадэманструе, як гэтая адлюстраваная канцэпцыя "ўразлівай" дзяржавы дапамагла дыскурсу расейскай замежнай палітыцы растлумачыць і легітымізаваць гвалт ува Украіне.

Яшчэ адной важнай часткай гэтай легітымізацыі з'яўляецца тэрмін, звязаны не з наратывам пра дзяржаву, але з нацыянальным наратывам Расеі – паняцце "рускага свету". Гэта частка доўгатэрміновага і буйнамаштабнага праекта па стварэнні нацыянальнай ідэнтычнасці Расіі, які заняў значнае месца з пагаршэннем сітуацыі ва Украіне ў 2013–2014 гг. Хатчынгз і Шостэк (2015) адзначаюць, што нацыянальны наратыў асабліва значны для Расіі як краіны з імперскім мінулым, ад якога ў сучасным свеце яна змушаная адысці і шукаць нацыянальных меж нанова. Канцэпцыя "рускага свету" пацвярджае гэтае сцвярджэнне, звязваючы рускамоўнае насельніцтва, раскіданае па свеце, і робячы тэрытарыяльнае фармаванне нацыянальнай ідэнтычнасці больш гнуткім і лёгка трансфармавальным у залежнасці ад абставінаў, якія змяняюцца. Гэтая настальгія па імперскай уладзе таксама адлюстроўваецца ў геапалітычнай рэпрэзентацыі Расіі як рэгіянальнага і глабальнага геапалітычнага "магніту", якая лічыць сябе адказнай сусветнай дзяржавай у працэсе прыняцця міжнародных рашэнняў і асабліва адносна суседніх краін (Frear, Mazepus, 2017: 1–37). "Суайчыннікі", "рускамоўнае насельніцтва" і "этнічныя рускія", што жывуць у розных краінах пасля распаду Савецкага Саюза, з'яўляюцца неад'емнай часткаю "рускага свету" і патрабуюць "абароны" з боку расійскай дзяржавы. Гэта можа быць расійская юрыдычная абарона, як у выпадку масавай "пашпартызацыі" ў постсавецкіх краінах (наданне расійскага грамадзянства), або вайсковая абарона, як у выпадку анексіі Крыма. Дмітрава і інш. (2017) таксама адзначаюць другі "слой" наратыву "рускага свету" "на аснове інтэлектуальнай

традыцыі, якая разглядае Расію як асобную і самадастатковую цывілізацыю, убудаваную ў геапалітычны парадак традыцыйных каштоўнасцей, міфаў, духоўных патрэб і культурных звычаяў". (Dmitrova and others, 2017: 13). У гэтым кантэксце правы расійскіх улад на ўмяшанне ў справы краін, у якіх жывуць "суайчыннікі", кансалідаваныя і легітымізаваныя, таму што лічыцца, што рускі ў любым выпадку захавае ўласную "рускасць" незалежна ад месца знаходжання.

Агульным месцам у розных формах дыскурсу пра расійскую нацыянальную ідэнтычнасць з'яўляецца апазіцыя глабальнага "ворага" ў выглядзе Захаду. Хатчынгз і Шостэк вызначылі некалькі функцый гэтай дыскурснай апазіцыі. Па-першае, яна адначасова легітымізуе любыя дзеянні Расіі з пункту гледжання грамадства і дэвальвуе крытыку з Захаду. Па-другое, яна жывіць логіку, згодна якой Расія ёсць "вялікай сілай", з якой трэба лічыцца. І, нарэшце, наратыў пра "ворага" выяўляецца і прымаецца грамадствам і кіроўнай элітай, такім чынам уплываючы на рэпрадукаванне дзяржаўнай палітыкі ў гэтым рэжыме (Hitchings, Szostek, 2015).

## РАСІЙСКІ МЕДЫЯДЫСКУРС ПРА ЗАМЕЖНУЮ ПАЛІТЫКУ АДНОСНА УКРАІНЫ

Даследаванне аўтара факусуецца на ідэалагічным змесце расійскага знешнепалітычнага дыскурсу, а таксама на стратэгіях і дынаміцы легітымізацыі гвалту на некаторых тэрыторыях. Падчас эмпірычнага даследавання аўтар выбраў 40 найбольш папулярных (ад 50 да 500 тысяч праглядаў сайта) і абмеркаваных (да 200 каментарыяў у найбольш папулярнай расійскай сацыяльнай сетцы "ВКонтакте") навінавых артыкулаў пра падзеі на паўднёвым усходзе Украіны ад супольнасці "РІА Навіны" (vk.com/ria, 2,3 млн. падпісчыкаў) і 40 артыкулаў ад супольнасці "VESTI.ru | RUSSIA 24" (vk.com/vesti, амаль 300 тыс. падпісчыкаў), тэматычна звязаных з падзеямі на паўднёвым усходзе Украіны, за 2014 і 2017 гг.[6] Аналізуючы ўсе звесткі, аўтар выкарыстоўвае асноўныя прынцыпы, вызначаныя метадалогіяй крытычнага дыскурс-аналізу.

Большыня абраных артыкулаў, якія факусуюцца на легітымізацыі гвалту, апісваюць сутыкненні падчас пратэстаў і мітынгаў, а таксама баявыя дзеянні і ахвяр. Меншая доля матэрыялаў апісвае палітычныя рашэнні і рэакцыю палітычных актараў на ўзброены гвалт. РІА заканчвала кожны артыкул пра Украіну спецыяльнай заключнай часткаю незалежна ад мэты ці традыцыйнага жанру навіннага артыкула. У першай палове 2014 г. важна было адзначыць незаконнасць перавароту і негуманнасць яго ар-

ганізатараў, якія пагражалі жыццю "кіраўніка дзяржавы" і прывялі да смерцяў падчас пратэстаў. Аўтар адзначае, што толькі ў кантэксце падзей да і падчас "перавароту" напрыканцы 2013 г. міліцыя і іншыя часткі міністэрства ўнутраных спраў Украіны называюцца "праваахоўнымі органамі". У сітуацыі пасля "перавароту" такое азначэнне знікае цалкам і падмяняецца "сілавікамі" і "СБУ"[7] (без поўнага напісання, у якім узгадваецца "бяспека" як частка тэрміна). У суперструктурах навін пра масавыя хваляванні/навалы выразы "праваахоўныя" або "службы бяспекі" адыгрываюць спецыяльную ролю. Яны гарантуюць спакой і кантроль над сітуацыяй у законны спосаб. Гэты "супакойны" фрагмент структуры жанру навін пра незаконныя і небяспечныя падзеі наўмысна прыбіраецца расійскімі медыямі з навін пра масавыя хваляванні і ўзброеныя сутыкненні ўва Украіне. Гэта мяркуе нязмогу афіцыйных улад, якая ўзнікла пасля падзей Еўрамайдана ў вачах чытачоў, і такім чынам павялічвае адчуванне неспакою, небяспекі і бязладдзя, якое асацыюецца з усёй тэрыторыяй Украіны, кантраляванай новымі ўладамі.

У наступных паведамленнях Расія ўводзіцца ў якасці ўдзельніка падзей. Яна асуджае гвалт і дапамагае праводзіць перамовы. Узнікае культурны элемент – руская мова – у сувязі з прарасійскім стаўленнем. Калі ў першай палове года пратэстоўцы называліся прыхільнікамі федэралізацыі (мова наратываў пра дзяржаўнасць), а тэрыторыя пратэстаў пазначалася даволі дакладна, разважанні змяніліся ў другой палове года. Цяпер асноўным фактарам стала не форма дзяржаўнага ладу, а руская мова. Уведзены наратыў пра расійскую нацыю, адначасова тэрыторыі пазначаюцца больш шырока, чым раней, не прыгадваюцца асобныя гарады і гарачыя кропкі.

Заўважная розніца ў звестках пра месца ў тэкстах навін. У абедзвюх крыніцах навін існавала розніца ў апісанні гвалту апанентаў – "сілавікоў" і "рушэнцаў" – адносна тэрытарыяльнасці. Мапы з азначэннем месцаў баявых дзеянняў ці сутыкненняў вельмі рэдкія. Таму нават маленькія дэталі слоўных фармулёвак адносна месцаў баявых дзеянняў становяцца значнымі. У артыкулах пра страты "рушэнцаў", якія яны зазналі ад украінскіх сіл, месцы апісваюцца асаблівым чынам, каб чытач мог уявіць пазіцыі адносна сталых арыентыраў. У артыкулах непасрэдна называюцца тры

6 - Цяпер "РІА Навіны" належыць агенцтву "Russia Today". Другая крыніца, VESTI.ru, – гэта навінавае аддзяленне найбуйнейшай федэральнай медыясеткі, Расійскай дзяржаўнай тэле- і радыёкампаніі. Абедзве крыніцы шырока цытуюцца.

7 - Служба бяспекі Украіны.

асноўныя гарады – Данецк, Харкаў і Луганск, якія паўтараюцца ў паведамленнях і фіксуюцца ў прасторавым уяўленні. У артыкулах таксама пазначаюцца гарады, кірункі і адлегласці. Супрацьлеглая тэндэнцыя назіралася ў артыкулах пра поспехі "рушэнцаў" і ахвяры "сілавікоў". У кантэксце гвалту, які расейскія медыі спрабуюць легітымізаваць, адсутнічае дакладнасць ці дапамога для прасторавага ўяўлення чытача. Выразы або проста пазначаюць паўднёвы ўсход Украіны, або дадаюць назвы маленькіх населеных пунктаў, не пазначаючы іх месцазнаходжанне з выкарыстаннем пазначаных вышэй інструментаў. Расійскі медыядыскурс гвалту – гэта размыванне меж. Гэтая прастора наўмысна ствараецца проста праз "прыналежнасць да Украіны" без дакладнага прывязвання. Гэта адпавядае канструяванню нестабільнасці на ўсёй тэрыторыі Украіны і нязмогі ўнутраных сіл у барацьбе супраць хаосу.

Некаторыя элементы дыскурсу пра нацыю і тэрыторыю трэба разгледзець больш дакладна ў гэтым медыядыскурсе. Толькі "сілавікі" называюцца ўкраінскімі: сілы "самаабароны" ("рушэнцы") ДНР і ЛНР[8] наўмысна пазбаўляюцца "ўкраінскасці". Яны дадаюцца да раней прыгаданага "прарасійскага стаўлення", але толькі ў артыкулах за 2014 г. Акрамя "сілавікоў" і "Службы бяспекі Украіны", на баку нелегітымнага гвалту таксама прыгадваюцца такія азначэнні як "украінскія вайскоўцы", "байцы Правага сектару", а таксама дакладна адмоўныя "ўзброеныя радыкалы", "узброеныя экстрэмісты" і "крымінальнікі". Дзеянні гэтых актараў маюць відавочную негатыўную канатацыю. У аналізаваных тэкстах яны пагражаюць (суверэнітэту, жыццю людзей), выкарыстоўваюць агнявую зброю, вайсковае абсталяванне або "кактэйлі Молатава", адкрываюць агонь, выкрадаюць людзей, стаяць за нападамі, знішчаюць аб'екты і парушаюць дамовы. Усе гэтыя дзеянні з'яўляюцца актыўным гвалтам. Калі гэтыя суб'екты нешта заяўляюць, за гэтым фактам ідзе следам напісанне абвяржэння або сцвярджэнні, што заява не адпавядае рэчаіснасці (праз выкарыстанне словаў "быццам бы" або "нягледзячы на (некаторыя факты/абставіны)"). У супрацоўніцтве з суб'ектамі, звязанымі з Захадам (прадстаўнікамі ЗША, ЕС), украінцы ніколі не паводзяць сябе як актыўныя суб'екты – прадстаўнікі сустракаюцца з імі, дзеляцца звесткамі выведкі і дасылаюць дапамогу.

З іншага боку канфлікту "прыхільнікі федэралізацыі", "байцы самаабароны", "актывісты" і "пратэстоўцы". Варта адзначыць,

8 - Тут і далей ДНР – самаабвешчаная Данецкая Народная Рэспубліка, ЛНР – самаабвешчаная Луганская Народная Рэспубліка.

што ў кантэксце Еўрамайдана словы "актывіст" і "самаабарона" цытуюцца ў аналізаваных медыях як азнака недаверу да пэўнасці і дакладнасці абазначэнняў адносна "бунтоўных радыкалаў". Адносна суб'ектаў на баку легітымнага гвалту гэтыя цытаты не выкарыстоўваюцца. Ніводныя з пералічаных раней дзеянняў "сілавікоў" і "радыкалаў" не паўтарае суб'ект "рушэнцы". Нават у выпадку ахвяр сярод украінскіх сіл на пазначаюцца прамыя актыўныя дзеянні, каб забіць або ліквідаваць. "Рушэнцы" акружаныя, пападаюць у засаду ці пад агонь; ім удаецца знайсці танк, узяць кантроль над будынкам, заняць будынак, увайсці ў будынак – але не захапіць. Яны "вызначаюцца", здольныя заняць пазіцыю, дэманструюць здольнасці, абараняюць людзей і гарады, адбіваюцца і вяртаюць блокпасты. Прысутнічае дакладная канатацыя радасці за поспехі гэтага боку канфлікту. Спасылкі на рускую мову і "рускі свет" прысутнічаюць толькі ў тэкстах, у якіх адсутнічаюць заходнія актары. У адсутнасць прыгадвання заходніх актараў (у мясцовым кантэксце) "рускамоўны" культурны наратыў пачынае набываць прасторавы характар ("рускамоўная прастора"). Аднак як толькі міжнародныя актары ўзнікаюць у паведамленні (Еўрапейскі саюз, Злучаныя Штаты Амерыкі, АПАД і г.д.), дыскурс пераключаецца з нацыянальнага на дзяржаўны ўзровень. У артыкулах адразу ж пачынаецца абмеркаванне легітымнасці, легальнасці, дзяржаўных органаў і міжнародных дамоваў, захадаў, якія Расія гатовая зрабіць або дакладна асудзіць, а таксама паўтор рэфрэну адмаўлення любой вайсковай прысутнасці Расіі і яе вайсковай падтрымкі на паўднёва-ўсходніх тэрыторыях Украіны.

Зрух у бок наратыву пра дзяржаўнасць таксама дэманструе розніцу ў інструментах легітымізацыі гвалту ў Злучаных Штатах Амерыкі, што абмяркоўвалася раней у гэтым артыкуле ("некіраваная тэрыторыя"). Згодна з прынцыпамі "суверэннай дэмакратыі" заходнія дзяржавы (і, такім чынам, Украіна, якая паддалася іх уплыву пасля Еўрамайдана) "слабыя" праз залішнюю лібералізацыю, якая вядзе да бязладдзя. Расія легітымізуе дзеянні "рушэнцаў", прызнаючы органы ЛНР і ДНР у якасці здольных карыстацца манаполіяй гвалту на ўласных тэрыторыях. Хоць афіцыйнае прызнанне не ажыццяўляецца, паведамленні дакладна дэманструюць сталую спасылку на нелегітымнасць украінскіх улад і абсурднасць іх дзеянняў і заяў у той час, як дзеянні прадстаўнікоў уладаў ДНР і ЛНР апісваюцца больш нейтральна. Іх удзел у мінскіх перамовах у якасці незалежных актараў не бярэцца пад сумнеў.

Расійская замежная палітыка і дыскурс знаходзяцца ў апазіцыі да (неа)ліберальных падыходаў заходняга Іншага, што зна-

ходзіцца ў цэнтры расійскага нацыянальнага наратыву і наратыву дзяржаўнасці праз канцэпцыю суверэннай дэмакратыі. Аднак гэта не перашкаджае расійскаму дыскурсу пра легітымны гвалт і апраўданне вайсковых дзеянняў прымаць логіку рацыянальнай легітымнасці і прагматычных вайскова-палітычных рашэнняў адносна замежных тэрыторый у кантэксце падзелу зон уплыву з заходнімі краінамі. Гэтая логіка працуе як адносна вайсковай прысутнасці ў Сірыі ці Афганістане, якія не ўключаныя ў расійскі нацыянальны наратыў, так і адносна Украіны, уключанай у нацыянальны наратыў. Аднак калі міжнародныя палітычныя актары адсутнічаюць у заяве, можа ўзнікнуць іншая стратэгія апраўдання гвалту. Афектыўная легітымнасць займае месца рацыянальнай легітымнасці: непахіснае абвяргание расійскай вайсковай прысутнасці ў паўднёва-ўсходняй Украіне адыходзіць на другі план, а расійцы, як сцвярджаецца, абараняюць “брацкую” краіну насуперак уласным інтарэсам з-за брацкай любові. У гэтым кантэксце рацыянальнасць набывае негатыўнае значэнне і звязаная са сквапнасцю і прагматычнасцю.

Нарэшце, выяўлена, што не толькі нацыянальныя (міжнародныя) і (між)дзяржаўныя кампаненты, але таксама сувязь з канцэпцыямі “нас” і “Іншага” адыгрываюць ролю ў стварэнні прасторы гвалту. Тэрыторыі, на якіх адбываецца (нелегітымны) гвалт супраць “нас”, і тэрыторыі, на якіх “мы” выкарыстоўваем (легітымны) гвалт супраць Іншага, адрозніваюцца апісаннем, быццам бы яны з’яўляюцца апісаннем “нашых” тэрыторый і далёкіх тэрыторый, якія малююцца як “чорныя дзіркі” нацыянальнай ідэнтычнасці. Месцы нелегітымнага гвалту падрабязна апісваюцца ў аналізаваных матэрыялах, як быццам бы тэрыторыя належыць нацыянальнаму “мы” і таму падпадае пад манаполію легітымнага гвалту. З іншага боку, мова заяў пра ахвяры з боку “Іншага” невыразная і расплывістая адносна тэрыторый, што дазваляе легітымнаму гвалту адбыцца на тэрыторыі “Іншага” або ў “чорнай дзірцы”. Нават хоць гэта і тыя самыя тэрыторыі, пра іх можна казаць па-рознаму ў залежнасці ад таго, якія бакі прыгадваюцца (толькі мясцовыя актары ці глабальныя) ці які бок канфлікту перамог у асобных медыях. Гэта дэманструе тое, да якой ступені гнуткімі і супярэчлівымі могуць быць сёння наратывы пра тэрыторыю і межы, гвалт і легітымнасць.

## СПІС КРЫНІЦ І ЛІТАРАТУРЫ

1. Bhabha, L.K. Location of Culture. Даступна па спасылцы: https://archive.org/stream/TheLocationOfCultureBHABHA/the+location+of+culture+BHABHA_djvu.txt (дата звароту: 17.12.2017).

2. Bonefeld, W. Free Economy and the Strong State. Capital

and Class 2010, no. 1: 15–24.

3. Dimitrova, A. et al. The Elements of Russia's Soft Power: Channels, Tools, and Actors Promoting Russian Influence in the Eastern Partnership Countries. EU-STRAT Working Paper, 2017.

4. Frear, M., Mazepus, H. A New Turn or More of the Same? A Structured Analysis of Recent Developments in Russian Foreign Policy Discourse. EU-STRAT Working Paper, 2017, 3.

5. Gellner, E. Nations and Nationalism. Ithaca: Cornell University Press, 2008.

6. Gregory, D., Pred, A. Violent Geographies. Fear, Terror, and Political Violence. Routledge, 2006.

7. Held, D. Mcgrew, A. Political Power and Civil Society: A Reconfiguration? In: The Global Transformation Reader: An Introduction to the Globalization Debate. Ed. by D. Held, and A. McGrew. Cambridge, 2003.

8. Hutchings, S., Szostek, J. Dominant Narratives in Russian Political and Media Discourse during the Ukraine Crisis. Даступна па спасылцы: http://www.e-ir.info/2015/04/28/dominant-narratives-in-russian-political-and-media-discourse-during-the-crisis/ (дата звароту: 02.01.2018).

9. Krastev, I. 'Sovereign democracy', Russian-style. Даступна па спасылцы: https://www.opendemocracy.net/globalization-institutions_government/sovereign_democracy_4104.jsp (дата звароту 08.01.2018).

10. Lankina, T., Watanabe, K. 'Russian Spring' or 'Spring Betrayal'? The Media as a Mirror of Putin's Evolving Strategy in Ukraine. Europe-Asia Studies, 2017, 69: 1526–1556.

11. Murphy, A.B. The sovereign state system as political-territorial ideal: historical and contemporary considerations. In: State Sovereignty as Social Construct. Edited by by T. J. Biersteker, C. Weber. Cambridge University Press, 1996.

12. Paasi, A. Boundaries as social processes: Territoriality in the world of flows. Geopolitics, 1998, Vol. 3: 69–88.

13. Paasi, A. The role of identities and boundaries in the contemporary world. Рэжым доступу: http://www.geo.ut.ee/nbc/paper/paasi.htm (дата звароту: 22.12.2017).

14. Prinz, J., Schetter, C. Conditioned Sovereignty: The Creation and Legitimation of Spaces of Violence in Counterterrorism Operations of the 'War on Terror'. Alternatives, 2017, 41 (3): 119–136.

15. Springer, S., le Billon, P. Violence and Space: introduction to the Geographies of Violence. Political Geography, 2016, no. 52: 1–3.

16. Urry, J. Mobile Sociology. The British Journal of Sociology, 2000, Vol. 51: 185–203.

17. Анкерсмит, Ф. Нарративная логика. Семантический

анализ языка историков. Пер. с англ. О. Гавришиной, А. Олейникова. М.: Идея-Пресс, 2003.

18. Бурдье, П. Дух государства: генезис и структура бюрократического поля. Пер. Н. А. Шматко. В: Социология социального пространства, под ред. Н. Шматко, СПб: Алетейя, 2007: 220–254.

19. Лефевр, А. Производство пространства, Пер. с фр. И. Стаф. М.: Streike Press, 2015.

20. Харви, Д. Пространство как ключевое слово, Вильнюс: ЕГУ, Топос, №1, 2011: 10–38.

# АНАЛІЗ СІСТЭМЫ АБАВЯЗКОВАГА ПРАФЕСІЙНАГА РАЗМЕРКАВАННЯ ЯК ІНСТРУМЕНТ РЭГУЛЯВАННЯ РЫНКУ ПРАЦЫ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

**Вераніка Прыходзька** - магістрантка праграмы “Міжнародныя адносіны і еўрапейска-азіяцкія даследаванні” Школы бізнесу і кіравання Талінскага тэхналагічнага ўніверсітэту (Эстонія). Яна атрымала ступень магістра публічнай палітыкі ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце (ЕГУ) (Літва) і ступень бакалаўра педагагічнага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (Беларусь). Як валанцёрка супрацоўнічае з НДА «Правінцыя» (Беларусь) па абароне правоў жанчын супраць хатняга гвалту. Палітычныя інтарэсы: дэмакратызацыя беларускай адукацыі і гендэрная роўнасць.

## АНАТАЦЫЯ

У артыкуле разглядаецца праблема эфектыўнасці сістэмы абавязковага прафесійнага размеркавання як інструмента рэгулявання рынку працы маладых спецыялістаў у Рэспубліцы Беларусь. У межах праведзенага даследавання аналізаваліся думкі выпускнікоў аднаго з ВНУ Беларусі, а таксама вывучаліся экспертныя ацэнкі вышэйпаказанага інструмента. Мэта артыкула - даследаваць практыкі выкарыстання інструмента размеркавання ў Беларусі.

Вынікі даследавання паказалі, што, паводле думак і ацэнак як выпускнікоў ВНУ, так і экспертаў, інстытут размеркавання зьяўляецца не эфектыўным, паколькі насуперак пастаўленым мэтам не забяспечвае маладых спецыялістаў працоўнымі месцамі і годным узроўнем заработнай платы. Як следства агульнай незадаволенасці размеркаваннем, маладыя спецыялісты займаюцца сваім працаўладкаваннем самастойна, размяркоўваюцца не паводле атрыманай спецыяльнасці і адпрацоўваюць вызначаны час ва ўстановах не адпавядалых ўзроўню іх падрыхтоўкі і спецыялізацыі. Яшчэ адной стратэгіяй з’яўляецца змена маладымі спецыялістамі месцаў адпрацоўкі размеркавання ці адмову ад яго. Зрэшты, згодна з атрыманымі ацэнкамі, прафесійная кваліфікацыя выпускнікоў беларускіх ВНУ часта не адпавядае попыту рынку працы. Заработ-

ная плата маладых спецыялістаў характарызуецца як нізкая, што прымушае іх шукаць дадатковыя крыніцы даходу.

Рэкамендацыяй ў сферы публічнай палітыкі рэгулявання рынку занятасці маладых спецыялістаў у Беларусі з'яўляецца перагляд абавязковага прафесійнага размеркавання і замена яго іншымі інструментамі і практыкамі.

**КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ:**
Беларусь, малады спецыяліст, рынак працы, абавязковае прафесійнае размеркаванне, эфектыўнасць.

## УВОДЗІНЫ

Існуе шмат спосабаў рэгулявання рынку працы маладых спецыялістаў, аднак Беларусь захавала сістэму абавязковга размеркавання для выпускнікоў навучальных устаноў, якія навучаліся за сродкі дзяржаўнага бюджэту. Згодна з нацыянальным заканадаўствам: "размеркаванне – гэта працэдура вызначэння месца працы выпускніка, якая ажыццяўляецца дзяржаўнай установай адукацыі, альбо ў выпадках, устаноўленых Урадам Рэспублікі Беларусь, дзяржаўным органам з мэтай сацыяльнай абароны выпускнікоў, задавальнення патрэбаў галінаў эканомікі і сацыяльнай сферы ў спецыялістах, працоўных, службоўцах" (Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб Адукацыі, 2011). Беларуская сістэма прафесійнага размеркавання выпускнікоў знаходзіцца ў цэнтры акадэмічных, экспертных і грамадскіх дыскусій ужо здаўна. У звязку з тым, што размеркаванне па спэцыяльнасці мае абавязковы характар, яно ацэньваецца некаторымі экспертамі як прымусовае працаўладкаванне (Лаўрухін, 2016). Прыняцце Беларусі ў Еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі (ЕПВА) у 2015 годзе стала імпульсам для дадатковых абмеркаванняў гэтага інструмента. Як вядома, само прыняцце краіны ў ЕПВА было ўмоўным і падразумявала рэфармаванне сістэмы вышэйшай адукацыі паводле прынцыпаў Балонскай сістэмы (Грамадскі Балонскі камітэт, 2015 г.), што ў ідэале павінна было паўплываць і на змяненне заканадаўства аб размеркаванні, як не суадноснае з патрабаваннямі ЕПВА. Аднак на практыцы на сённяшні дзень гэта сістэма працягвае дзейнічаць. Дыскусійнасць пытання размеркавання і яго ацэнак, а таксама яго значнасць для маладых людзей у Беларусі робіць вывучэнне дадзенага інструмента асабліва актуальным.

У праведзеным даследаванні ўвага была сфакусавана на асноўнай мэтавай групе сістэмы размеркавання – выпускніках

ВНУ. Прадметам вывучэння сталі думкі маладых спецыялістаў і экспертныя ацэнкі абавязковага прафесійнага размеркавання. У сувязі з абмежаваннасцю рэсурсаў быў выбраны метад кейс-стадзі (вывучэнне выпадка), у межах якога былі прааналізаваныя думкі выпускнікоў аднаго з ВНУ Беларусі (філіяла Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі г. Магілёва 2015 г. выпуску). Разглядаліся розныя аспекты сістэмы размеркавання:

1) колькасць працоўных месцаў для маладых спецыялістаў;

2) суадносіны паміж атрыманай прафесійнай кваліфікацыяй і патрабаваннямі рынку працы;

3) суадносіны паміж заробкам выпускнікоў, чаканнямі і атрыманым узроўням падрыхтоўкі;

4) агульная задаволенасць інстытутам размеркавання.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ І ПАЛІТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ СІСТЭМЫ РАЗМЕРКАВАННЯ Ў БЕЛАРУСІ

Фармаванне і функцыянаванне сістэмы абавязковага прафесійнага размеркавання ў Беларусі абумоўлена гістарычным кантэкстам і практыкамі перыяда СССР. Сістэма размеркавання выкарыстоўвалася ў якасці інструмента рэгулявання рынку працы моладзі СССР і першапачаткова ўвасабляла інструмент абавязковага характару (Панчыщын, Сахарская, 2014). Пасля распаду СССР чыннікам, які спрыяў захаванню інстытута размеркавання ў Беларусі, з’явілася выкарыстанне мадэлі рэгулявання рынку працы з акцэнтам на якасны паказальнік працаўладкавання. Спачатку сістэма размеркавання мела дабравольны характар, улічваліся пажаданні выпускнікоў і іх бацькоў у выбары рэгіёна адпрацоўкі. Аднак паступова сістэма зноў набыла абавязковы (прымусовы) фармат.

У якасці мэтавай групы сістэмы абавязковага размеркавання выступаюць выпускнікі прафесійна-тэхнічных, сярэдніх, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў, якія атрымалі адукацыю за бюджэтныя сродкі. Стэйкхолдэрамі з’яўляюцца дзяржаўныя органы, працадаўцы, арганізацыі грамадзянскай супольнасці (уключаючы адукацыйныя, моладзевыя, экспертныя і іншыя), міжнародныя арганізацыі, а таксама непасрэдна прадстаўнікі мэтавай групы і іх бацькі.

У заканадаўстве Рэспублікі Беларусь працэдура размеркавання выпускнікоў жорстка рэгламентавана (Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб Адукацыі, 13.01.2011; Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 821, 22.06.2011). У рэчышчы публічнай палітыкі Беларусі працэдура размеркавання ўвасабляе закрыты працэс, які рэгулюецца дзяржавай, на які практычна ня могуць уплываць ін-

шыя стэйкхолдэры, уключаючы прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці.

## МЕТАДАЛОГІЯ

Практыкі выкарыстання сістэмы абавязковага прафесійнага размеркавання ў Беларусі разглядаліся на аснове вывучэння думак і ўяўленьняў маладых спецыялістаў, а таксама экспертаў у сферы вышэйшай адукацыі. Асноўнымі метадамі даследавання сталі анкетнае апытанне і інтэрвію.

Апытанне праводзілася ў фармаце фармалізаванага групавога анкетавання сярод выпускнікоў педагагічнага факультэта філіяла Акадэміі музыкі г. Магілёва выпуску 2015 г. Электронная анкета дасылася рэспандэнтам праз сацыяльныя сеткі («УКанткаце», «Одноклассники», Facebook) у перыяд з 15.12.2016 да 05.01.2017. Дадзены метад апытання ўжываўся таму, што сацыяльныя сеткі даюць магчымасць найхутчэй і найэканамічней устанавіць кантакт з рэспандэнтамі, якія адпрацоўвалі па размеркаванні ў розных населеных пунктах. Агульная колькасць рэспандэнтаў складала дваццаць адзін (21) чалавек. Пасля таго, як пачалося апытанне, некалькі рэспандэнтаў сталі недаступныя, а яшчэ некалькі адмовіліся ад удзелу. У якасці магчымых прычын адмовы можна назваць незацікаўленасць выпускнікоў тэмай апытання, а таксама, у прынцыпе, нізкую грамадзянска-палітычную актыўнасць дадзенай групы. Такім парадкам, агульная колькасць апытаных склала адзінаццаць (11) чалавек ва ўзросце ад 24 да 28 год, сярод якіх сем (7) жанчын і чатыры (4) мужчыны. З адзінаццаці (11) апытаных рэспандэнтаў сем (7) пабратыя шлюбам, два (2) маюць дзяцей.

Пад час даследавання экспертных ацэнак інструмента размеркавання ў працы выкарыстоўвалася напаўструктураванае экспертнае інтэрвію. Усяго былі праведзеныя чатыры (4) інтэрвію. Інтэрвію праводзіліся ў перыяд з 22.12.2016 па 03.01.2017 асабіста альбо ў фармаце скайп, і доўжыліся ад 30 да 75 хвілін. Пад час інтэрвію эксперты былі скіраваныя на дэталёвае абмеркаванне пытанняў адносна сістэмы абавязковага прафесійнага размеркавання, што дало магчымасць атрымаць багаты матэрыял для аналізу.

## ДАСТАТКОВАСЦЬ КОЛЬКАСЦІ ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ ДЛЯ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

У якасці аднаго з паказальнікаў ацэнкі эфектыўнасці інструмента размеркавання разглядаўся такі індыкатар, як колькасць працоўных месцаў для маладых спецыялістаў. Таксама былі сабрадзеныя ацэнкі здольнасці дзяржаўных структур забяспечыць

першым працоўным месцам маладых спецыялістаў.

На думку апытаных экспертаў, у Беларусі адбываецца нерацыянальнае размеркаванне маладых кадраў. У сувязі з тым, што на бясплатнае навучанне ва ўніверсітэты галоўным чынам трапляюць найлепшыя вучні, размяркоўвацца потым яны будуць у месцы першай неабходнасці, што, аднак, не гарантуе добрага месца адпрацоўкі. У выніку падрыхтаваныя маладыя спецыялісты могуць адпрацоўваць у месцах, якія не вымагаюць ад іх усіх атрыманых кампэтэнцый. Адзін з рэспандэнтаў апісаў сітуацыю наступным чынам: «Кадры размяркоўваюцца нерацыянальна. Калі пагглядзець на фактычна склалую сітуацыю, то спярша, пры адборы, ва ўніверсітэты трапляюць тэарэтычна найлепшыя студэнты...– яны паступаюць на бюджэт... Адпаведна, яны ж трапляюць на тыя вакансіі, якія не закрываюцца, улічваючы патрэбнасці рынку працы, то бок на самыя непрыстыжныя і неперспэктыўныя вакансіі ў самых непрыстыжных і неперспэктыўных месцах... Агулам кажучы, выдатнік з найлепшымі адзнакамі, прэзідэнцкімі стыпендыямі павінен ехаць на два гады ў самым пачатку сваёй працоўнай кар'еры ў вёску, дзе ягоны патэнцыял ня будзе задзейнічаны».

Адной з прычынаў падобнай сітуацыі называлася адсутнасць узгаднення паміж рынкам працы і рынкам адукацыйных паслуг. Пад “узгадненнем” пры гэтым падразумяваецца прывязанасць рынку адукацыі да рынку працы, дзе працадаўцы ствараюць попыт на пэўныя прафесійныя стандарты і кампетэнцыі, на якія ў далейшым павінны арыентавацца ўстановы адукацыі пад час фармавання адукацыйных стандартаў. Адно з выказванняў па гэтай тэме гучала наступным чынам: «На што арыентуецца вышэйшая школа – гэтак званыя адукацыйныя стандарты. Гэта тое, што распрацоўваецца самім ВНУ і Міністэрствам адукацыі. Рынак працы ў дадзенай сітуацыі вас цікавіць у апошнюю чаргу. У сваю чаргу прафесійныя стандарты – гэта калі працадаўца задае вам арыентыр... Галоўнае, дзяржаве неабходна забяспечыць попыт працадаўцы на пэўныя кампетенцыі. Калі гэтага не абываецца, то ніякія адміністрацыйныя меры не здатныя змяніць сітуацыю».

У выніку эксперты мяркуюць, што адмністрацыі беларускіх ВНУ здзяйсняюць ціск на выпускнікоў, а таксама ажыццяўляюць усялякія маніпуляцыі ў дачыненні да маладых спецыялістаў з мэтай мець добрыя статыстычныя паказальнікі адносна размеркавання: «У нас у дзяржаве ўсё пабудавана на лічбах, на статыстыцы. У адукацыі гэта працуе актыўна. Існуюць штогадовыя справаздачы па статыстыцы размеркавання. ВНУ імкнуцца да таго, каб падаць

добрыя лічбы». У прыватнасці, у якасці прыклада маніпуляцый называлася падтрымка з боку ўстаноў адукацыі адпрацоўкі не па спецыяльнасці: «Гэта паўсюдная практыка цяпер – размеркаванне не па спецыяльнасці. Гэта парушэнне заканадаўства. Самае цікавае, што за гэта парушэньне паплаціцца толькі малады спецыяліст... У нас у заканадаўстве няма адказнасці для ўстаноў адукацыі. ВНУ настойліва рэкамендуюць для падтрымкі статыстыкі, каб вы ўладкаваліся куды заўгодна».

Невысокую ацэнку інструмента размеркавання як сродка забяспечыць маладых спецыялістаў першым працоўным месцам прадэманстравалі і ўдзельнікі апытання. У прыватнасці, на пытанне: “Ці шукалі вы месца размеркавання самастойна?” бальшыня апытаных маладых спецыялістаў (81,8%) адказалі станоўча. У якасці паказальнага каментара па дадзеным пытанні можна прывесці наступную цытату з апытання: «Калі мы размяркоўваліся, наш дырэктар філіяла сказаў:“Шукайце сабе працоўныя месцы самі”... Мы ўсе самі шукалі сабе працоўныя месцы...».

Дадзеныя апытання дазваляюць таксама пабачыць ацэнкі таго, наколкі складаным для выпускнікоў быў пошук месца адпрацоўкі абавязковага размеркавання (гл. мал. 1). Адказваючы на пытанне: «Калі вы шукалі месца размеркавання самастойна, ці складана вам было знайсці месца адпрацоўкі?», больша за палова (60%) рэспандэнтаў адказалі адмоўна, аднак астатнія 40% указывалі на складанасці ў пошуку першага працоўнага месца. Такое размеркаванне адказаў можа быць звязана непасрэдна з музычнай спецыялізацыяй (выкладнік музыкі/інструментальнае выкананне) і сферай прафесійнай дзейнасці апытаных, аднак можа быць і паказальнікам больш агульных тэндэнцый складанасці знаходжання першага месца занятасці для маладых спецыялістаў.

**Мал.1. Размеркаванне адказаў на пытанне «Калі вы шукалі месца размеркавання самастойна, ці складана вам было знайсці месца адпрацоўкі?»**



Падсумоўваючы, можна сказаць, што беларуская дзяржава не заўсёды можа выконваць свае абавязкі перад маладымі спецыялістамі, у прыватнасці, забяспечыць першым працоўным месцам выпускнікоў дзяржаўных навучальных устаноў па прычыне дэфіцыту працоўны месцаў. А таму часта ўстановы адукацыі, разумеючы, што сістэма размеркавання не можа забяспечыць першым працоўным месцам, насупор дзейным нарматыўным патрабаванням прапапуе выпускнікам працаўладкоўвацца самастойна.

## АДПАВЯДАННЕ АТРЫМАНАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ ПАТРАБАВАННЯМ РЫНКУ ПРАЦЫ

Згодна з экспертнымі ацэнкамі, размеркаванне не па атрыманай кваліфікацыі актыўна задзейнічана ў сучаснай Беларусі. Выпускнікам “раюць” працаўладкоўвацца ў любыя месцы і “адпрацоўваць” не па атрыманай кваліфікацыі. Дадзеная сітуацыя адбіваецца ў камэнтары аднаго з экспертаў: «Вы ўладкоўваецеся па адной спецыяльнасці, а можаце там адпрацоўваць па іншай. Потым высвятляецца той факт, што вы праацуеце не па спецыяльнасці. Па заканадаўстве адказвае малады спецыяліст… Ён павінен выплаціць грошы, адпрацаваўшы не па спецыяльнасці. У ВНУ і наймацелся фінансавай адказнасці няма».

Апрача таго, паводле экспертаў, у звязку з тым, што ў Беларусі доўгі час існавала штучная сістэма задавальнення попыту на вышэйшую адукацыю, пагоршыліся і якасць адукацыі, і кампетенцыі студэнтаў. Адзін з рэспандэнтаў падкрэслівае, што здольнасць рынку працы ўмяшчаць усіх выпускнікоў з'яўляецца не толькі колькаснай, але і якаснай праблемай, бо толькі нязначная колькасць маладых спецыялістаў адпавядаюць кампетенцыям, якія неабходныя працадаўцам Беларусі: «Згодна з ацэнкай кадравых агенстваў, адпавядальнасць чаканняў працадаўцаў атрыманым кампетенцыям выпускнікоў складае прыблізу 8%… Можна выпускаць менш, можна выпускаць больш, залежыць ад таго, ці можа прыняць рынак такія кампетенцыі. Яны [выпускнікі] проста збольшага не кампетэнтныя. Ва ўмовах дэфіцыту працоўных месцаў працадаўца не будзе браць іх на працу, яны яму не патрэбныя».

Пры гэтым дадзеныя анкетнага апытання паказалі, што 9,1% маладых спецыялістаў лічаць свае месца адпрацоўкі не адпавядалым атрыманай імі прафесійнай кваліфікацыі. 36,4% рэспандэнтаў указалі, што месца размеркавання хутчэй не адпавядае іх прафесійнай кваліфікацыі. Атрыманыя дадзеныя кажуць аб тым, што ў разгляданым у артыкуле выпадку размеркаванне, на думку саміх выпускнікоў, адбываецца не па атрыманай квалі-

фікацыі (усяго 45,5% рэспандэнтаў схіліліся да такой думкі), што ў сваю чаргу, сведчыць аб парушэнні заканадаўства, якое забараняе размеркаванне выпускнікоў падобным чынам. Апрача таго, амаль палова апытаных (45,5%) лічыць, што яны адпрацоўваюць у не адпавядалай узроўню іх падрыхтоўкі ўстанове альбо арганізацыі. Разважаючы аб атрыманай адукацыі і патрабаваннях сучаснага рынку, і эксперты, і выпускнікі кажуць аб іх неадпаведнасці. У практычным рэчышчы гэта азначае, што студэнты атрымліваюць адукацыю, якая не запатрабуецца на рынку працы і, як вынік, яны мусяць "адпрацоваць" яе па іншай кваліфікацыі. Такім парадкам, можна гаварыць аб функцыянальнай дэфармацыі інструмента размеркавання, якая праяўляецца ў невыкананні ім сваіх асноўных функцый: 1) працаўладкаванне па спецыяльнасці; 2) працаўладкаванне ў адпаведалай узроўню падрыхтоўкі ўстанове.

## АДПАВЯДАННЕ ЗАРОБКУ ЎЗРОЎНЮ ПАДРЫХТОЎКІ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Адказваючы на пытанні аб адпавяданні заробку ўзроўню падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, эксперты адзначалі нізкія заробкі выпускнікоў і патлумачылі, што з пункту гледжання ўраду маладыя спецыялісты ўспрымаюцца як танная працоўная сіла. Так, ацэнка аднаго з экспертаў гучала наступным чынам: «Што адбываецца насамрэч з маладымі спецыялістамі і іх заробкамі? У нас ёсць малады спецыяліст, якога вы можаце два гады не звальняць. Ён абсалютна ў вашай уладзе. У межах законнага поля вы можаце плаціць яму колькі заўгодна. Канечне, не менш за мінімальны заробак. Ці захочаце вы плаціць яму больш?».

У межах выпадку, які мы аналізуем, 72,7% апытаных рэспандэтаў адказалі, што, на іх думку, атрыманы заработак не адпавядае іх ведам і прафесійным кампетэнцыям. У дадатак, такая ж колькасць (72,7%) рэспандэнтаў пацвердзілі наяўнасць дадатковай занятасці, што ўказывае на недастатковую аплату за працу, што прымушае шукаць сродкі на ўтрыманне сябе і сваіх сем'яў. Наяўнасць дадатковай занятасці і нізкі ўзровень заробку маладых спецыялістаў указываюць на адсутнасць гарантый і магчымасцей атрымаць пажаданы заробак пры ўмове абавязковай адпрацоўкі па размеркаванні.

## ЗАДАВОЛЕНАСЦЬ ІНСТЫТУТАМ РАЗМЕРКАВАННЯ

Некаторыя з апытаных экспертаў ахарактарызавалі стан справаў у сферы размеркавання, як адсутнасць выбару і ўказывалі на прымусовы характар інструмента. Паказальным выступае наступнае выказванне: «Гнюснасць гэтай сітуацыі палягае ў тым,

што вам кажуць: каб вызваліцца ад прымусовай працы, вы павінны выкупіць сябе з нявольніцтва. Прымусовая праца застаецца прымусовай працай, але калі вы пагаджаецеся на яе, то ў вас проста не застаецца выбару». Аднак адзін з экспертаў з дадзеным меркаваннем не пагадзіўся, указаўшы на тое, што ў размеркаванні няма элемента прымусовасці, бо, каб вызваліцца ад яго дзеяння, неабходна проста заплаціць. Ключавым момантам эксперт лічыць магчымасць адмовіцца ад размеркавання: «Мяркую, сцверджанне аб тым, што гэта прымусовая праца – перабольшванне. Тут няма элемента прымусовасці: заплаці і ты вольны. Ключавы момант – магчымасць адмовіцца ад размеркавання. Гэта не працоўнае нявольніцтва».

Згодна з экспертнай ацэнкай, інструмент размеркавання ў цэлым дэматывуе маладых людзей не толькі ў перыяд адпрацоўкі, але і ў наступныя этапы працоўнага жыцця. Дэматывуючымі чыннікамі, на думку апытаных, варта лічыць: нізкі ўзровень заробку, дрэнныя ўмовы працы і пражыцця, немагчымасць звальнення цягам тэрміну адпрацоўкі, ціск з боку працадаўцаў, адсутнасць жадання працаваць па атрыманай прафесіі і немагчымасць змяніць род сваёй дзейнасці без абавязковай адпрацоўкі. Кажучы аб размеркаванні, адзін з рэспандэнтаў указываў, што яно «дэматывуе маладога спецыяліста, бо, з аднаго боку, ён разумее, што не можа нармальна на рынку працы шукаць нармальную працу. Напрыклад, мы кажам пра бюджэтніка, бо ён будзе вымушаны ехаць туды, куды яго скіруюць, у нейкую вёску. З другога боку, калі ён ужо прыехаў у гэтую вёску, ён цудоўна разумее, што ён там знаходзіцца па размеркаванні, у яго ёсць гарантыі маладога спецыяліста, якога нельга зволіць без пэўных экстраадрынарных дзеянняў з яго боку. Пры гэтым ён хутчэй усяго цудоўна разумее, што гэта непрыстыжнае месца працы і працадаўца проста не знойдзе яму ніякай замены, адпаведна, ніякай матывацыі працаваць там у яго няма”.

У той жа час усе эксперты адзначылі існаванне адэкватных альтэрнатыўных варыянтаў у сістэме размеркавання за мяжой, напрыклад, кватаванне працоўных месцаў, стымуляванне прадпрымальніцтва сярод моладзі, спецыяльныя фонды фінансавання адукацыі, супрацоўніцтва з замежнымі фондамі і інш.

У выніку праведзенага анкетавання сярод маладых спецыялістаў думкі на пытаньне: «Ці задаволеныя вы сваім працоўным месцам, куды вы трапілі па размеркаванні?» падзяліліся практычна напалову: 54,6 % хутчэй задаволеныя сваім месцам адпрацоўкі, пры гэтым 45,5% хутчэй не задаволеныя. Прычынамі не-

задаволенасці можна лічыць размеркаванне не па атрыманай кваліфікацыі, яго адпрацоўку ў не адпаведнай ўзроўню падрыхтоўкі ўстанове, а таксама нізкі ўзровень даходу.

**Мал.2. Размеркаванне адказаў на пытанне «Ці задаволеныя вы сваім працоўным месцам, куды вы трапілі па размеркаванні?»**




Да ўсяго бальшыня апытаных у рамках кейс-стадзі (72,7%) указалі на тое, што пры наяўнасці магчымасці хутчэй усяго адмовіліся б ад размеркавання і схільныя ў далейшым змяніць месца працы.

У цэлым адмоўная ацэнка інстытута размеркавання і незадаволенасць ім праяўляецца ў імкненні выпускнікоў (па магчымасці) адмовіцца ад размеркавання і змяніць працу. Незадаволенасць выклікаюць адсутнасць выбару, нізкі заробак, адпрацоўка не па атрыманай кваліфікацыі і/ці ва ўстанове, не адпаведалай узроўню падрыхтоўкі, дрэнныя ўмовы працы і пражыцця, ціск з боку працадаўцы і інш.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

У тэарэтычным плане і ў заканадаўчым афармленні інструмент размеркавання ў Беларусі ўвасабляецца самастойным, працоўным, аднак на практыцы яго функцыянаванне дэманструе шэраг хібаў. У цэлым можна гаварыць аб тым, што дзейная ў Беларусі сістэма абавязковага прафесійнага размеркавання ўвасбаляе неэфектыўны інструмент рэгулявання рынку працы. Аб гэтым сведчаць такія індыкатары як: недастатковая колькасць працоўных месцаў для маладых спецыялістаў, неадпаведнасць атрыманай

прафесійнай кваліфікацыі патрабаванням рынку працы, неадпаведнасць заробку маладых спецыялістаў узроўню прафесійнай падрыхтоўкі, а таксама агульная незадаволенасць выпускнікоў інстытутам размеркавання.

Так, дэфіцыт працоўных месцаў з'яўляецца простым вынікам адсутнасці ўзгаднення паміж рынкам працы і рынкам адукацыі, у прыватнасці, адсутнасць сістэмы прафесійных стандартаў і кампетенцый, якая павінна распрацоўвацца працадаўцамі і, на аснове якой у далейшым павінны ствараецца адукацыйныя стандарты для будучых маладых спецыялістаў. Таксама па прычыне адсутнасці ўзгаднення адбываецца нерацыянальнае размеркаванне кадраў, калі лепшыя маладыя спецыялісты размяркоўвацца на непрэстыжныя працоўныя месцы. Да ўсяго, як наступства адсутнасці ўзгаднення  і ў выніку недахопу працоўны месцаў, не выконваецца асноўная задача інструмента – “абавязковае працаўладкаванне выпускнікоў”, у выніку чаго выпускнікі вымушаныя шукаць сабе працоўныя месцы самастойна.

Разам з тым па прычыне незапатрабавальнасці атрыманых прафесійных кваліфікацый на рынку працы, інструмент размеркавання не здатны выконваць свае асноўныя функцыі: працаўладкаванне па спецыяльнасці і ў адпаведалай ўроўню падрыхоўкі ўстанове. У такой сітуацыі ўстановы адукацыі, парушаючы заканадаўства, дапамагаць маладым спецыялістам працаўладкоўвацца не па спецыяльнасці. Прычына дадзенай сітуацыі палягае ў тым, што ўстановы адукацыі маюць на мэце шырокамаштабнае абавязковае працаўладкаванне, каб атрымаць у далейшым добрыя статыстычныя паказальнікі. Зрэшты, інстумент размеркавання не можа гарантаваць магчымасць атрымаць пажаданы заробак, бо ўзровень заробкаў для маладых спецыялістаў нізкі.

Падсумоўваючы, варта звярнуць увагу на тое, што ў цэлым маладыя спецыялісты не задаволеныя інстытутам размеркавання. Асноўнай прычынай такой незадаволенасці з'яўляецца абавязковы характар размеркавання, які ў выніку абмяжоўвае свабоду выбару і магчымасць змяніць месца працы пры з'яўленні якіх-небудзь негатыўных чыннікаў, якія не задавальняюць маладога спецыяліста. Аднак наяўнасць альтэрнатыўных праграм інструмента абавязковага размеркавання ўказываюць на магчымасць вырашыць праблему працаўладкавння іншымі, больш эфектыўнымі спосабамі, у выпадку,  калі беларускі ўрад зменіць прыярытэты ў рэгуляванні дадзенай сферы.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ І КРЫНІЦ

1. Кодекс Республики Беларусь об Образовании 243-З, Ст. 83 (2011). Доступно по ссылке: http://kodeksy-by.com/kodeks_ob_obrazovanii_rb/87.htm [Просмотрено 24 октября 2016 г. 18:00].

2. Общественный Болонский комитет (2015): Дорожная карта по проведению Беларусью реформы системы высшего образования. Доступно по ссылке: http://bolognaby.org/index.php/slider-home-ru/531-belaruskaya-dorozhnaya-karta-po-provedeniyu-belarusyu-reformy-sistemy-vysshego-obrazovaniya-2 [Просмотрено 3 октября 2016 г. 13:00]

3. Лаврухин, А. В. (2015): Высшее образование: социальное партнерство как альтернатива государственному распределению. Доступно по ссылке: http://nmnby.eu/news/analytics/5776.html [Просмотрено 30 сентября 2016 г. 14:00].

4. Лаврухин, А.В. Обязательное распределение выпускников: в поисках альтернативы. Доступно по ссылке: http://bolognaby.org/images/uploads/2015/10/Laurukhin-Obiazatelnoe-Raspredelenie-ru.pdf [Просмотрено 28 сентября 2016 г. 15:00].

5. Панчищин, С.М.; и Сахарская, О.А. (2014): Сравнительный анализ динамики уровня безработицы в постсоциалистических странах. Доступно по ссылке: http://cyberleninka.ru/article/n/sravnitelnyy-analiz-dinamiki-urovnya-bezrabotitsy-v-postsotsialisticheskih-stranah [Просмотрено 22 октября 2016 г. 13:00]

6. Постановление Совета Министров Республики Беларусь № 821 (2011): Положение о порядке распределения. Доступно по ссылке: http://www.academy.edu.by/files/Post_821.pdf [Просмотренно15 сентября 2016 г. 12:00]

7. Постановление Совета Министров Республики Беларусь № 821 (2011): Положение о возмещении средств. Доступ по ссылке: http://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C21100821 [Просмотрено 12 сентября 2016 г. 14:00]

# АНАЛІЗ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ІНСТЫТУТАЎ НА ПРЫКЛАДЗЕ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У 2006-2016 ГГ.

**Таццяна Шапуцька** – выпускніца магістарскай праграмы “Публічная палітыка” і бакалаўрскай праграмы “Паліталогія і еўрапейскія даследаванні” Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта. Навуковыя інтарэсы – палітычная гісторыя Беларусі, палітычныя інстытуты Беларусі, палітычная міфатворчасць, медыі і палітычная камунікацыя. Працуе журналістам у незалежнай газеце “Новы Час”. Сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў.

## АНАТАЦЫЯ

Беларуская партыйная сістэма сфармавалася ў выніку працяглага працэсу партыйнага будаўніцтва, якое пачалося напачатку ХХ ст. і аднавілася пасля знікнення монапартызму КПСС. У 1990 г. у Беларусі было зарэгістравана 25 партый. Наступныя некалькі гадоў партыйная структура перажывала бурныя перамены — з’яўляліся новыя партыі, некаторыя партыі знікалі, шэраг партый перанеслі ўнутраныя расколы. Праз шэсць гадоў у выніку станаўлення адзінаасобнай улады А. Лукашэнкі партыі хоць і захавалі свой юрыдычны легальны статус, аднак пачалі хутка губляць палітычны ўплыў. Аб’ект аналізу: партыйная сістэма Беларусі, партыйная ідэалогія і дзейнасць палітычных партый у 2006–2016 гг. Мэта: прааналізаваць партыйную сістэму 2006-2016 гг. і вызначыць яе асаблівасці. Асноўныя задачы: апісаць навуковыя канцэпцыі датычна функцыянавання палітычных партый у дэмакратычных і недэмакратычных сістэмах; прааналізаваць і класіфікаваць палітычныя структуры; вызначыць іх спецыфічную ролю. Выкарыстоўваючы такія метады як якасны дыскурс-аналіз, аналіз другасных дадзеных, паўструктураванае інтэрв’ю, была зроблена выснова, што вонкавыя і ўнутраныя ўмовы функцыянавання палітычных структур адмоўна ўплываюць на з’яўленне новых партый і спрыяюць паслабленню наяўных партый. Спецыфіка палітычнага поля абумоўлівае з’яўленне новых формаў дзейнасці — г. зв. “каляпартыйных суб’ектаў”, якія, не маючы фармальнага статусу партый, ажыццяўляюць функцыі, ідэнтычныя партыйным. Падабенства праграмных палажэнняў палітычных структур не дазваляе аналізаваць беларускую партыйную сістэму выключна з пазіцыі праграмных ідэалогій. Змешаны

крытэрый, які спалучае крытэрыі лаяльнага альбо нелаяльнага стаўлення да ўладнай эліты і рэальнага альбо фантомнага фармату працы, дазваляе тыпалагізаваць палітычныя структуры на структуры-апаненты і структуры-фантомы. Дзве партыі (Камуністычная партыя Беларусі і Ліберальна-дэмакратычная партыя) не адносяцца ні да адной з груп, спалучаючы ў сабе лаяльнасць да ўлады і нефантомны фармат працы.

## КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ:

Палітычная сістэма, партыйная структура; шматпартыйнасць; партагенез; палітычны плюралізм; партыйныя ідэалогіі.

## УВОДЗІНЫ

Палітычныя партыі ажыццяўляюць шэраг важных функцый — рэпрэзентатыўную, інтэгратыўную, функцыю палітычнай барацьбы, сацыялізацыі ды іншыя. Не менш значнай з'яўляецца ідэалагічная функцыя, якая рэалізуецца ў стварэнні партыйных ідэалогій і палітычных праграм. Нягледзячы на тое, што ўсё часцей выказваюцца меркаванні пра завяршэнне эпохі ідэалагічнай барацьбы і ўніфікацыю партыйных праграм, у Беларусі ідэалагічны плюралізм праяўляе сябе дастаткова яскрава і не дае падстаў казаць пра ідэалагічную ўніфікаванасць. У той жа час большасць беларускіх партый мае падобныя пазіцыі па ключавых пытаннях, што не дазваляе тыпалагізаваць іх выключна па ідэалагічным крытэрыі.

У Беларусі склалася дастаткова парадаксальная сітуацыя — слабасць палітычных партый, нізкі ўзровень прысутнасці партыйных прадстаўнікоў у парламенце (на дадзены момант — шаснаццаць са ста дзесяці дэпутатаў), нізкі аўтарытэт партый сярод насельніцтва, невысокі ўзровень палітычнай культуры спалучаюцца з наяўнасцю пятнаццаці партыйных структур (і гэта толькі зарэгістраваных Міністэрствам юстыцыі) самага рознага ідэалагічнага спектру — ад крайніх кансерватараў да камуністаў. Заўважым, нягледзячы на гэты фармальны паказнік, аналіз праграм дазваляе казаць, што ні крайніх левых, ні крайніх правых сярод беларускіх партый няма.

За гады палітычнай апатыі і незапатрабаванасці грамадствам ды дзяржаваю, партыйныя структуры значна дэградавалі як рэсурсна, так і арганізацыйна. Праграмы многіх структур даўно не аднаўляліся, даследаванні наконт мэтавых груп, іх патрэб ды інтарэсаў амаль не праводзяцца. Няведанне зацікаўленасцяў і патэнцыялу выбарцаў праводзіць да выпадковага абрання так-

тык. Такім чынам, вонкавыя неспрыяльныя ўмовы ў спалучэнні з унутраным сістэмным крызісам партый прыводзяць да існавання слабай партыйнай сістэмы са змаргіналізаванымі лідарамі і неадпаведнымі сітуацыі стратэгіямі.

Асаблівасці беларускага палітычнага поля і партагенезу абумоўліваюць перыядызацыю аналізу — 2006–2016 гг. Да 2006 г. уключна партыйная структура практычна цалкам замацавалася, новыя партыі не рэгістраваліся, расколаў сярод партый не адбывалася, толькі адна партыя — Беларуская партыя жанчын “Надзея” — была ліквідавана ў 2007 г. У 2016 г. прайшлі апошнія парламенцкія выбары, упершыню за доўгі час дэпутаткай стала прадстаўніца дэмакратычнай партыі – Аб’яднанай грамадзянскай партыі.

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА АНАЛІЗУ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ

Сярод навукоўцаў адсутнічае адзінае меркаванне датычна месца партый у палітычнай сістэме: напрыклад, сучасны амерыканскі палітолаг Томас Біркланд лічыць палітычныя партыі асобным неафіцыйным актарам публічнай палітыкі нароўні з сацыяльнымі рухамі, недзяржаўнымі аб’яднаннямі ды інш. (Birkland 2014) у той час, як класічныя аўтары Г. Алманд і Б. Паўэл адносяць палітычныя партыі да спецыфічных груп інтарэсаў, якія вядуць барацьбу за палітычную ўладу (Almond, Powell 1996). М. Дзюверcharacterжэ раздзяляе пазіцыі партый у палітычнай сістэме ў залежнасці ад іх генезісу — калі буржуазныя партыі (да якіх аўтар адносіць кансерватыўныя і ліберальныя) маюць у аснове канкурэнтныя групоўкі (камітэты), актыўнасць якіх канцэнтруецца вакол электаральных працэсаў і набліжаная да парламенцкай дзейнасці, дык новыя сацыялістычныя партыі грунтуюцца на народных масах, аб’яднаных моцнай ідэалогіяй — адпаведна, у палітычным полі такія партыі знаходзяцца бліжэй да рухаў (Дюверже 2002). Амерыканскія аўтары А. Шварц і К. Лоўсан называюць партыі “палітычным крылом арганізаваных груп інтарэсаў” (Schwartz, Lawson 2005: 270).

Працяглы час у навуковай літаратуры дамінавала пазіцыя, што асноваю палітычнай партыі з’яўляецца ідэалогія, якая атрымлівае пісьмовае ўвасабленне ў партыйнай праграме. Дзюверcharacterжэ называе аналіз ідэалагічных дактрын партый ліберальным падыходам і піша, што ён не можа даць поўнага ўяўлення пра палітычныя партыі. Сам даследчык схіляецца да структурнага аналізу партый, вывучаючы партыйную інфраструктуру (Дюверже 2002). Вядомы італьянскі даследчык Дж. Сартары з’яўляецца прыхільнікам электаральнага падыходу і называе партыяй групу людзей,

аб'яднаных удзелам у выбарах ды імкненнем заваяваць уладу праз сваіх абраннікаў (Sartori 2005). Нельга не згадаць і марксісцкую класавую тэорыю, паводле якой палітычная партыя трактуецца як палітычная арганізацыя, што складаецца з найбольш актыўных прадстаўнікоў грамадскага класа і абараняе інтарэсы пралетарыяту.

У залежнасці ад падыходу змест партыйных функцый вар'іруецца, аднак фактычна ўсе партыі ў большай альбо меншай ступені рэалізуюць наступныя функцыі: агрэгацыя і артыкуляцыя інтарэсаў; распрацоўка палітычнага курса; інтэграцыя і сацыялізацыя грамадзян; рэкрутаванне; мабілізацыя рэсурсаў; пасярэдніцтва між грамадзянамі і ўладай; фармаванне грамадскага меркавання і г. д.

У залежнасці ад пазіцый палітычных партый у краіне, тыпаў партый ды ўзаемасувязямі між імі ўтвараецца спецыфічная партыйная канфігурацыя — партыйная сістэма. Партыйныя сістэмы адрозніваюцца між сабою па колькасці партый ды іх якасных прыкметах. У вялікай ступені структура партыйнай сістэмы вызначаецца тыпам палітычнага рэжыму ў краіне.

Для большасці дэмакратычных краін характэрна функцыянаванне шматпартыйнай альбо двухпартыйнай сістэм. Дадзеную тыпалогію ў сярэдзіне XX ст. прапанаваў М. Дзюверджэ, і з таго часу яна стала класічнай. Паводле Дзюверджэ, найбольш на колькасць партый у краіне ўплывае (і адначасова трапляе пад уздзеянне партыйнай сістэмы) наяўная выбарчая сістэма. Адначасова з гэтым ён зазначае, што гэта толькі агульныя арыенціры, якія не вычэрпваюць усіх асаблівасцяў узаемаўплываў выбарчай і партыйнай сістэм (Дюверже 2002).

## БЕЛАРУСІ ПАТРЭБНАЯ СВАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ?

Ні ў Канстытуцыі, ні ў заканадаўчых актах не вызначаецца сучасны тып беларускай партыйнай сістэмы. Меркаванні беларускіх палітолагаў на гэты конт разыходзяцца — выказваюцца ідэі пра беспартыйную, квазідвухпартыйную і шматпартыйную сістэмы.

На дадзены момант у Беларусі маюцца пятнаццаць зарэгістраваных Міністэрствам юстыцыі партый розных ідэалагічных кірункаў. У аналіз уключаныя гэтыя партыі і чатыры каляпартыйныя структуры, якія найбольш актыўна праяўляць сябе ў палітычным полі — кампанія "Гавары праўду" (ГП), Рух "За Свабоду" (РЗС), Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД) і "Белая Русь". Тыпалагізаваць гэтыя 19 суб'ектаў — значная праблема, бо з-за спецыфікі беларускай палітычнай сістэмы не ўсе структуры можна ўпісаць у наяўныя класіфікацыі. Прапануем ужыць для класіфікацыі партый і каляпартыйных суб'ектаў змешаны крытэрый: лаяльнасць/нела-

яльнасць да ўлады і рэальны/фантомны фармат працы (пад фантомным фарматам працы разумеецца няўдзел некаторых структур у палітычных працэсах — акрамя як праз вылучэнне назіральнікаў і чальцоў выбарчых камісій — і практычна поўная адсутнасць імплементацыі палітычных кампаній). Такім чынам, класіфікацыя выглядае так:

**1.Партыі/структуры, што супрацьстаяць існуючай уладзе (апаненты)**

Да іх ліку адносяцца Кансерватыўна-Хрысціянская Партыя-БНФ (КХП-БНФ), Партыя БНФ; Беларуская партыя левых "Справядлівы свет" (БПЛСС), Аб'яднаная грамадзянская партыя (АГП); Партыя "Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада" (БСДГ), Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада); "Рух за Свабоду" (РЗС); "Гавары праўду" (ГП); Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД); Беларуская партыя "Зялёныя".

Нягледзячы на розныя палітычныя тактыкі і розныя ўзроўні актыўнасці, усе названыя партыі і арганізацыі знаходзяцца ў супрацьстаянні з уладамі, прадстаўляючы палітычную альтэрнатыву, перыядычна аб'ядноўваюцца ў кааліцыі.

**2.Партыі/структуры, што легітымізуюць уладу А. Лукашэнкі (фантомы)**

Да іх ліку адносяцца Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя, Сацыял-дэмакратычная партыя "Народнай Згоды", Беларуская аграрная партыя (БАП), Рэспубліканская партыя, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці, Беларуская патрыятычная партыя (БПП), рэспубліканскае аб'яднанне "Белая Русь" (БР).

Дадзеная група партый (акрамя "Белай Русі) мае выразныя асаблівасці, якія кардынальна адрозніваюць яе ад іншай групы: гэтыя партыі ствараліся ў перыядзе 1992–1997 гг., і толькі некалькі першых год свайго існавання ажыццяўлялі класічную партыйную дзейнасць (удзел у выбарах у якасці кандыдатаў, агрэгацыя і акумуляцыя інтарэсаў выбарцаў і г. д), уяўляючы сабою слабую, але альтэрнатыву дзейнаму кіраўніцтву.

З часам гэтыя партыі арганізацыйна ды ідэалагічна дэградавалі, абвясцілі лаяльнасць існай палітычнай уладзе і сталі выконваць новую функцыю — забяспечваць легітымнасць электаральных працэсаў. Нягледзячы на фармальна вялікую колькасць чальцоў у гэтых партыях, яны практычна не вылучаюць партыйцаў кандыдатамі на выбарах (акрамя БПП, кіраўнік якой М. Ула-

ховіч удзельнічаў у прэзідэнцкіх выбарах 2015 г.), не праводзяць палітычных кампаній і акцый, не камунікуюць са СМІ. Аднак падчас выбараў гэтыя партыі стабільна праяўляюць неўласцівую ім актыўнасць у якасці назіральнікаў. Аб’яднанне “Белая Русь” адрозніваецца ад гэтай групы партый фармальным статусам, паходжаннем (напачатку яе стварэння ў 2007 г. меркавалася, што яна стане партыяй улады, аднак гэтая ідэя не атрымала адназначнай падтрымкі з боку А. Лукашэнкі і на дадзены момант арганізацыйных зрухаў не адбываецца) і значна большай колькасцю чальцоў (заангажаваных пераважна праз адміністрацыйную вертыкаль), але функцыі яна выконвае аналагічныя з імі.

**Асобна ад вызначаных катэгорый знаходзяцца Камуністычная партыя і Ліберальна-дэмакратычная партыя**

Дадзеныя партыі немагчыма аднесці ні да першай, ні да другой групы партый. Іх яднае тое, што яны выконваюць функцыю легітымізацыі дзейнага прэзідэнта, але ў той жа час не з’яўляюцца фантомамі — праводзяць некаторыя акцыі (хоць і не вельмі актыўна), чальцы партый рэгулярна выступаюць у СМІ, партыйныя сайты часта абнаўляюцца і змяшчаюць інфармацыю пра актуальныя падзеі і навіны партый.

Напрыклад, восем чальцоў Камуністычнай партыі цяпер з’яўляюцца дэпутатамі ніжняй палаты парламента — Палаты Прадстаўнікоў , а 320 — дэпутатамі мясцовых Саветаў. Ліберальна-дэмакратычную партыю за яе дастаткова дэмакратычную праграму і адначасова прыязныя стасункі з уладамі часта называюць “псеўдаапазіцыяй”, хаця партыйнае кіраўніцтва гэта аспрэчвае. ЛДПБ не вылучаецца сярод іншых партый колькасцю назіральнікаў альбо вылучэнцаў у выбарчыя камісіі (нягледзячы на заяўленую колькасць чальцоў партыі — больш за 40 тыс. чалавек), аднак кіраўнік партыі Сяргей Гайдукевіч практычна заўжды (у 2010 г. зняўся з выбараў) выстаўляе сваю кандыдатуру на прэзідэнцкіх выбарах.

## ЧАМУ БЕЛАРУСКІЯ ПАРТЫІ ТАКІЯ (НЕ)СЛАБЫЯ?

Калі ў афіцыйным дыскурсе асвятляецца тэма партый і партыйнай сістэмы, то заўжды толькі ў негатыўным святле. Шмат з чым з той крытыкі, якую закідваюць дэмакратычным (і не толькі) партыям, можна пагадзіцца: партыі сапраўды практычна не працуюць з выбарцамі ў міжэлектаральны перыяд; замест палітычнай дзейнасці часта занятыя міжасобаснай барацьбой; не адбываецца ратацыі партыйных лідараў; партыі паказалі няздольнасць браць на сябе адказнасць за знакавыя для найноўшай гісторыі падзеі — напрыклад, ніводная з партый (хаця прыкладна палова кандыда-

таў былі прадстаўнікамі апазіцыйных партый / каляпартыйных структур) не ўзяла на сябе адказнасць і не прызнала сваю віну за арганізацыйны правал г. зв. “Плошчы-2010”.

У той жа час афіцыйны дыскурс апускае шэраг праблем партыйнай сістэмы, якія непасрэдна звязаныя з аўтарытарнай сутнасцю беларускага палітычнага рэжыму.

Па-першае, у Беларусі адсутнічаюць магчымасці для партыйнага развіцця — існыя партыі могуць толькі выжываць. Палітычным апанентам закрыты доступ да дзяржаўных СМІ, а доля ахопленай недзяржаўнымі газетамі, тэлебачаннем ды незалежнымі сайтамі аўдыторыі невялікая. У дзяржаўных СМІ рэгулярна праводзяцца кампаніі па дыскрэдытацыі апазіцыйных партый і іх лідараў. Дэмакратычныя партыі падвяргаюцца дыскрымінацыі і непасрэдна падчас электаральных кампаній: партыйных кандыдатаў часта не рэгіструюць кандыдатамі ў дэпутаты (розных узроўняў) па надуманых прычынах; кандыдатаў сур’ёзна абмяжоўваюць ў выбары месцаў для агітацыі і правядзенні сустрэч з выбарцамі; партыйным актывістам цяжка трапіць у склад выбарчых камісій. Дзяржава выкарыстоўвае рэпрэсіўныя метады як датычна партый — арганізацыйных структур (напрыклад, у выглядзе адмоў у дзяржаўнай рэгістрацыі, як паступаюць з “Беларускай хрысціянскай дэмакратыяй”), так і датычна асобных чальцоў партый (вынясенне пракурорскіх папярэджанняў, крымінальны пераслед за ўдзел у незарэгістраваных аб’яднаннях; ціск па месцы працы альбо вучобы; “прафілактычныя размовы” са сваякамі і інш.).

Па-другое, беларуская дзяржава стварыла надзвычай неспрыяльныя ўмовы для атрымання фінансавай падтрымкі партыямі, што прывяло да іх выцяснення ў ценявы сектар. У дэмакратычных краінах крыніц фінансавання партый звычайна некалькі: дзяржаўнае фінансаванне, прыватныя сродкі і ўласныя сродкі палітычных партый — гэта могуць быць як партыйныя ўнёскі, так і сродкі ад паслуг ці продажу партыйнай прома-прадукцыі. У Беларусі ж пашыранае меркаванне, што дзяржава не павінна ўдзельнічаць у расходах партыі (гэта замацавана заканадаўчаю нормаю), а партыйны бюджэт мусіць складацца з сяброўскіх унёскаў. Адсутнасць дзяржаўнага фінансавання тычыцца не толькі дэмакратычных партый, але і г. зв. “праўладных”, ці тых, якіх залічваюць да “сістэмнай апазіцыі” (напрыклад, Ліберальна-дэмакратычную партыю альбо Камуністычную партыю Беларусі). Аднак дадзеныя структуры атрымліваюць пэўную арганізацыйную палёгку ў выглядзе прадстаўлення памяшканняў для цэнтральнага і рэгіянальных офісаў партыі бясплатна альбо па нізкіх коштах, забяспечвання па-

мяшканнямі для правядзення з’ездаў альбо партыйных сходаў. Адначасова з гэтым дэмакратычныя партыі асабліва і не прэтэндуюць на дзяржаўнае фінансаванне, бо тады яны страцяць магчымасць апеляваць да сваёй “несістэмнасці” пры спробе атрымаць фінансаванне з замежных фондаў, што на дадзены момант з’яўляецца ключавым фінансавым рэсурсам партый. Такім чынам, утварылася замкнёнае кола: з аднаго боку, партыям неабходна мець сродкі для правядзення палітычных кампаній, выплаты заробку кіраўніцтву, для пакрыцця арганізацыйных патрэб (напрыклад, арэнда офіса), з іншага боку, атрымаць фінансаванне легальным чынам практычна немагчыма і партыі вымушаны звяртацца па дапамогу да замежных донараў у абыход усталяванага беларускім заканадаўствам фармальнага парадку. У такім выпадку акрамя небяспекі крымінальнага праследу сваіх лідараў за парушэнне заканадаўства, партыі сутыкаюцца з жорсткай крытыкай грамадскіх актывістаў, якія вінавацяць іх у скрытнасці, адсутнасці публічных справаздач па сваёй дзейнасці, нерацыянальнай траце сродкаў, дзейнасці ў інтарэсах донараў, а не ў нацыянальных.

Атрымаць фінансаванне ад бізнесоўцаў альбо іншых заможных людзей партыям таксама праблематычна, бо ананімныя ахвяраванні на дзейнасць партый у Беларусі забароненыя (арт. 24 Закона “Пра палітычныя партыі”), а публічна раскрываць свае сімпатыі да нейкай з дэмакратычных партый — гэта значыць ставіць пад пагрозу свой бізнес і сваю асабістую бяспеку. Варта зазначыць, што партыі ніякім чынам не лабіруюць развіццё механізмаў дзяржаўнага фінансавання. Прычынамі гэтаму выступаюць часткова апатыя і безыніцыятыўнасць, часткова – адсутнасць пільнай патрэбы. Таксама сярод матываў – вузкапартыйныя інтарэсы і памкненне знізіць узровень адказнасці: замежным донарам заўжды цяжэй праверыць мэтазгоднасць расходавання выдзеленых фінансаў і адпаведнасць рэальных затрат першапачаткова закладзеным у бюджэце.

Заўважым, дзяржава не толькі сур’ёзна абмяжоўвае палітычныя партыі ў магчымасцях фінансавання, аднак шляхам фінансавання спрабуе рэгуляваць тактыкі правядзення палітычных кампаній. Так, 2013 годзе напярэдадні мясцовых выбараў былі прынятыя заканадаўчыя папраўкі, паводле якіх кандыдатам не выдзяляецца дзяржаўных сродкаў на правядзенне агітацыйнай кампаніі, калі кандыдаты заклікаюць да байкоту выбараў (дагэтуль кандыдаты мусілі выплочваць дзяржаве сродкі, патрачаныя на агітацыйныя друкаваныя матэрыялы, калі яны здымалі свае кандыдатуры напярэдадні галасавання, аднак агітаваць яны маглі за любыя

формы ўдзелу альбо няўдзелу ў выбарах ).

Па-трэцяе, практычна немагчыма зарэгістраваць новую палітычную партыю. Апошняя створаная партыя — Кансерватыўна-Хрысціянская партыя-БНФ — была зарэгістраваная Міністэрствам юстыцыі ў 2000 г. Сама працэдура рэгістрацыі дастаткова складаная, працяглая, дарагая. Некаторыя палітычныя ініцыятывы — умоўна назавем іх “каляпартыйныя” — з мэтаю пазбегнуць няпростага працэсу рэгістрацыі і мінімізаваць адказнасць, атрымліваюць статус “грамадскіх аб’яднанняў”, “асветніцкіх устаноў” ды інш., нягледзячы на тое, што пастаўленыя гэтымі структарамі мэты і практычная палітычная дзейнасць носяць выразна партыйны характар. Да самых вядомых дэмакратычных каляпартыйных утварэнняў можна аднесці Рух “За Свабоду” (мае фармальны статус “праваабаронча-асветніцкае рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне”) і кампанію “Гавары праўду” (да пазбаўлення рэгістрацыі мела статус кампаніі пры даследчыцка-асветніцкай установе “Рух наперад”) — гэтыя арганізацыі з’яўляліся палітычнаю і рэсурснаю апораю экс-кандыдатаў у прэзідэнты Аляксандра Мілінкевіча і Уладзіміра Някляева адпаведна. У меншай ступені да каляпартыйнай структуры адносіцца рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне “Белая Русь”, якое абвяшчала пра магчымасць трансфармацыі ў “партыю ўлады”, аднак пакуль яшчэ застаецца ў статусе аб’яднання. Таксама існуе шэраг партый, якія альбо былі пазбаўлены дзяржаўнай рэгістрацыі (напрыклад, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя “Народная Грамада”), альбо якія яе не атрымалі, нягледзячы на шматлікія спробы — так, БХД зрабіла пяць безвыніковых спроб рэгістрацыі сваёй структуры толькі ў форме партыі, без уліку спроб зарэгістравацца як рэспубліканскае і абласное грамадскае аб’яднанне. Нягледзячы на адсутнасць фармальнага статусу, гэтыя партыі ўдзельнічаюць у палітычнай дзейнасці нароўні з іншымі, выкарыстоўваючы даступныя заканадаўчыя механізмы — напрыклад, партыйныя актывісты балатуюцца на парламенцкіх выбарах не па спісах партыі, а шляхам збору подпісаў альбо падаюць звароты ў дзяржаўныя структуры не ад імя партыі, а ад імя індывідуальных грамадзян.

Яшчэ адной прычынай, якая, паводле меркавання паліталагаў, замаруджвае партыйнае развіццё ў Беларусі, з’яўляецца мажарытарная выбарчая сістэма. М. Пліска піша, што для беларускіх умоў гэта найгоршая выбарчая сістэма: “Няма сумневу, што яна закансервуе стан палітычнага крызісу ў краіне, а для кіруючага клана з’явіцца сродкам захавання палітычнай сілы ў сваіх руках” (Плиско 2004). Цікава, што за прапарцыйную выбарчую сістэму паслядоўна

выступае старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Л. Ярмошына, якая сцвярджае, што галасаванне па партыйных спісах прывядзе да росту канкурэнтнасці і адбору самых здольных кандыдатаў. У той жа час аніякіх зрухаў у кірунку пераходу да змешанай альбо прапарцыйнай сістэмы не назіраецца.

## ВОНКАВЫЯ ПРАБЛЕМЫ ПАРТЫЙ – АГУЛЬНЫЯ, УНУТРАНЫЯ – РОЗНЫЯ

Што думаюць пра эфектыўнасць сваёй працы ўласна кіраўнікі палітычных партый? Падчас аналізу былі праведзеныя некалькі паўструктураваных інтэрв’ю з кіраўнікамі БХД (Павал Севярынец), Беларускай партыі левых “Справядлівы свет” (Сяргей Калякін), АГП (Анатоль Лябедзька) і РЗС (Юры Губарэвіч). У ходзе інтэрв’ю высветлілася, што дадзеныя палітычныя партыі і арганізацыі не лічаць сваю дзейнасць паспяховай, бо не змаглі заваяваць палітычнай улады. Для вымярэння выніковасці ды эфектыўнасці асобных кампаній структуры выкарыстоўваюць розныя інструменты: РЗС, БПЛСС і БХД карыстаюцца сацыялагічнымі дадзенымі незалежных інстытутаў (у прыватнасці, НІСЭПД і Інстытут дэмакратыі і сацыяльнага рынку). АГП, наадварот, не выкарыстоўвае вынікі сацыялагічных даследаванняў, бо “сацыялогіі ў аўтарытарнай дзяржаве быць не можа” (А. Лябедзька). Тры структуры — РЗС, БПЛСС і АГП — вымяраюць выніковасць колькасцю новых чальцоў партыі/арганізацыі. Аднак гэты крытэрый дастаткова ўмоўны, бо невялікая колькасць з тых асоб, якія далучыліся, уключаецца ў актыўную палітычную дзейнасць (А. Лябедзька). Акрамя ўжо пералічаных метадаў ацэнкі, АГП выкарыстоўвае дадатковыя: фокус-групы, унутраныя анкетаванні, экспертную ацэнку, аўдыт.

Кожнаму рэспандэнту было зададзена пытанне наконт самай грунтоўнай змены альбо падзеі, якая адбылася ў партыі/арганізацыі за 10 гадоў. Лябедзька і Калякін назвалі дасягненнем тое, што іх партыі працягваюць існаваць, нягледзячы на складаныя палітычныя ўмовы. Лябедзька зазначыў, што АГП — адзіная партыя, якая здолела ўстрымацца ад унутраных расколаў (хаця такія пагрозы існавалі). Паводле меркавання Севярынца, самым важным для БХД з’яўляецца пашырэнне колькасці чальцоў з 20 да 4500 чалавек. Паводле Губарэвіча, самую грунтоўную змену РЗС перажыў у 2010 г., структура перастала арыентавацца ў сваёй дзейнасці на прэзідэнцкія выбары і, адпаведна, змяніла стратэгію.

Рэспандэнты прызналі, што ў пэўнай ступені нізкая выніковасць дзейнасці іх структур выклікана ўнутранымі праблемамі. Для БПЛСС і РЗС асноўнай праблемай з’яўляецца кадравая. Калі

РЗС сутыкаецца з недахопам шараговых актывістаў для працы ў рэгіёнах, БПЛСС мае патрэбу ў "статусных людзях" (С. Калякін), якія б паляпшалі імідж партыі. А. Лябедзька адзначае, што партыя сутыкаецца з дэфіцытам маладых людзей ва ўзросце да 35 гадоў і тлумачыць гэта нежаданнем моладзі ісці на рызыку без атрымання дывідэнтных бонусаў. БХД сутыкаецца з праблемай неэфектыўнага менеджменту, калі "багата людзей, а арганізаваць іх не спраўляемся" (Севярынец).

Рэспандэнты аднадушна ацэньваюць стан сучаснай беларускай партыйнай сістэмы як "крызісны", прычынай чаму ёсць адсутнасць дэмакратычнага палітычнага рэжыму і, у прыватнасці, адсутнасць свабодных выбараў. Свабодныя выбары дазваляюць палітычным партыям не толькі заваяваць палітычную ўладу, пашырыць кола прыхільнікаў, папулярызаваць ідэалогію, але і адсеяць слабыя партыі (Лябедзька), ацаніць партыйныя магчымасці (Калякін). Акрамя несвабодных выбараў, на функцыянаванне партый аказваюць вырашальны ўплыў мажарытарная выбарчая сістэма (Калякін), рэпрэсіі, адсутнасць легальнай магчымасці падтрымкі партый прадпрымальнікамі (Севярынец), адсутнасць заканадаўчай рэгістрацыі (Севярынец; Губарэвіч).

Паводле Севярынца, нелегальны статус істотна замінае БХД працаваць з мэтавай групай — вернікамі, бо для кіраўнікоў царкоўных парафій важны факт наяўнасці дзяржаўнай рэгістрацыі. Акрамя гэтага, легальны статус зніжае ўзровень небяспекі для чальцоў партыі. На думку Губарэвіча, рэгістрацыя пашырае магчымасці палітычнай структуры, але ў той жа час стварае новыя перашкоды — неабходнасць наяўнасці юрыдычнага адраса і рэгіянальных філій (затраты на арэнду офісаў), папяровая валакіта, пагроза ліквідацыі структуры (Губарэвіч). Кіраўнік БПЛСС Калякін адзначае недахопы заканадаўства — у прыватнасці, неабходнасць падаваць звесткі пра новых чальцоў партыі ў Міністэрства юстыцыі (уключна з месцам працы), што адштурхоўвае патэнцыйных сяброў партыі.
У вызначэнні ўмоў для выхаду партый з палітычнага крызісу меркаванні рэспандэнтаў падзяліся: калі лідары АГП, БХД і БПЛСС не бачаць магчымасцяў рэфармаваць партыйную структуру ў межах сучаснага аўтарытарнага рэжыму ("немагчыма без рэвалюцыі" (Калякін)), то прадстаўнікі РЗС выказаліся пра верагоднасць рэалізацыі рэформаў (ці, прынамсі, першага этапу рэформаў) у межах існай палітычнай сістэмы.

Такім чынам, рэспандэнты маюць падобныя пазіцыі па большасці пытанняў датычна дыягнаставання вонкавых праблем

партыйнай сістэмы (асноўная праблема — адсутнасць свабодных выбараў), ацэнак партыйнай дзейнасці (дзейнасць неэфектыўная), аднак выдзяляюць розныя ўнутраныя партыйныя праблемы, што абумоўліваецца рознымі статусамі структур (партыі/арганізацыі; легальныя/нелегальныя) і досведам палітычнай працы (кадравая праблема, адсутнасць рэгістрацыі, адсутнасць легальных магчымасцяў фінансавання, інш.).

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Праведзены аналіз паказвае, што ўмовы функцыянавання палітычных структур, якія фармуюцца беларускім жорсткім заканадаўствам і рэпрэсіўнай тактыкай дзяржавы, не спрыяюць з'яўленню новых партый, а таксама правакуюць паслабленне ўжо існых партый. Спецыфіка беларускага палітычнага поля абумоўлівае з'яўленне новых формаў палітычнай дзейнасці — г. зв. "каляпартыйных суб'ектаў", а таксама не дазваляе аналізаваць партыйную структуру выключна з пункту гледжання праграмных ідэалогій, а вымагае новага падыходу: у дадзеным даследаванні прапанаваны змешаны крытэрый, які грунтуецца на крытэрыях лаяльнага альбо нелаяльнага стаўлення да ўладнай эліты і рэальнага альбо фантомнага фармату працы. Нягледзячы на тое, што сціслы фармат артыкула не дазволіў уключыць у напісанае аналіз партыйных праграм ды іх імплементацыі ў практычную дзейнасць, варта акрэсліць некалькі момантаў: па-першае, палітычныя праграмы структур-апанентаў распрацаваныя ў значна лепшай ступені за праграмы партый-фантомаў. Праграмныя палажэнні ў межах тэм "Эканоміка", "Сацыяльная сфера. Адукацыя. Сям'я", "Экалогія", "Нацыянальная мова і культура", "Рэлігія. Царква" часта маюць падабенства не толькі ў межах сваіх груп, аднак і між усімі структурамі ў цэлым. Істотныя разыходжанні праграмных пастулатаў як між групамі, так і ўнутры саміх груп, найбольш характэрныя для тэм "Унутраная палітыка. Дзяржава" і "Знешняя палітыка. Бяспека". Па-другое, сацыялагічныя дадзеныя паказваюць, што праграмныя палажэнні і імплементацыя кампаній слаба вядомыя звычайным грамадзянам. Па-трэцяе, некаторыя партыі (у прыватнасці, Беларуская партыя "Зялёныя") з пэўных прычын (арганізацыйных, рэсурсных, лідарскіх альбо іншых), маючы даволі высокі ўзровень падтрымкі выбарцамі праграмных палажэнняў, чамусьці не выкарыстоўваюць гэты патэнцыял у імплементацыі кампаній.

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ І КРЫНІЦ

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ КРЫНІЦЫ

1. Almond G., Powell B. (1996) Interest Groups and Interest Articulation. N.Y.: Harper Collins.

2. Дюверже М. (2002) Политические партии. Москва: Академический проект.

3. Плиско М. (2000) Партогенез в современной Беларуси. Доступно по ссылке: http://www.data.minsk.by/opensociety/2.00/4.html (дата обращения: 23 октября 2018).

4. Плиско М. (2004) Избирательная система в Беларуси: пропорциональная или мажоритарная? Доступно по ссылке: http://library.by/portalus/modules/belarus/referat_readme.php?subaction=showfull&id=1096043159&archive=&start_from=&ucat=4& (дата обращения: 23 октября 2018).

5. Birkland T. A. (2011) An Introduction to the Policy Process: Theories, Concepts and Models of Public Policy Making. Available at: https://books.google.by/books?id=qVjfBQAAQBAJ&dq=birkland+public+policy&source=gbs_navlinks_s (accessed 20 October 2018).

6. Sartori G. (2005) Parties and Party Systems: A Framework for Analysis. Available at: https://books.google.nl/books?id=ywr0CcGDNHwC&hl (accessed 20 October 2018).

7. Schwartz M. A., Lawson K. (2005) Political Parties: Social Bases, Organization, and Environment. The handbook of political sociology. Cambridge University Press, p. 266-287

## ІНШЫЯ КРЫНІЦЫ

8. Закон Республики Беларусь (1994) “О политических партиях”. Доступно по ссылке: http://pravo.levonevsky.org/bazaby/zakon/zakb1210.htm (дата обращения: 20 октября 2018).

9. Коммунистическая партия Беларуси (2018) Депутаты Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь. Доступно по ссылке: http://comparty.by/deputati (дата обращения: 19 октября 2018)

10. Минюст РБ (2018) Сведения о политических партиях, зарегистрированных в Республике Беларусь. Доступно по ссылке: https://minjust.gov.by/directions/compare_coverage/ (дата обращения: 24 октября 2018).

11. ЦИК РБ (2012) Выборы в Палату представителей Национального собрания Республики Беларусь пятого созыва. Сборник электоральной статистики. Доступно по ссылке: http://www.rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-PPNS5-Itogi.pdf (дата обращения: 19 октября 2018).

# ПАЛІТАЛАГІЧНЫЯ ПРАГРАМЫ ЕГУ

Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт (ЕГУ) з'яўляецца недзяржаўным універсітэтам у галіне «вольных мастацтваў і навук» (liberal arts and sciences) і быў заснаваны ў 1992 годзе ў Мінску. У выніку ціску на акадэмічныя свабоды ўніверсітэт быў вымушаны спыніць сваю дзейнасць у Мінску ў 2004 годзе і аднавіў працу ў Вільні (Літва). ЕГУ з'яўляецца адзіным беларускім універсітэтам, які працуе ў атмасферы сапраўдных акадэмічных свабодаў. У 2018/19 навучальным годзе прыкладна 730 беларускіх студэнтаў ЕГУ вывучаюць гуманітарныя і сацыяльныя навукі на бакалаўрскіх, магістарскіх д ы доктарскіх праграмах.

Больш за 3200 чалавек скончылі ЕГУ з моманту заснавання ўніверсітэта ў 1992 годзе ў Мінску. З іх дзве траціны сталі выпускнікамі ў віленскі перыяд. Згодна з апошнім апытаннем, 62,2% выпускнікоў пастаянна жывуць у Беларусі, куды яны вярнуліся пасля завяршэння навучання ў ЕГУ. 83,3% маюць сталую працу, якая цалкам альбо часткова звязаная з кірункам навучання ва ўніверсітэце. Большасць выпускнікоў універсітэта працаўладкаваныя ў прыватным сектары (64,6%), недзяржаўных арганізацыях (17,4%), а таксама дзяржаўных установах Беларусі (10,1%).

Паліталагічныя праграмы ЕГУ у розныя перыяды існавання ўніверсітэту рэалізоўваліся ў межах разнастайных акадэмічных дэпартаментаў і структур. У «мінскі перыяд» функцыянаваў франка-беларускі факультэт, дзе вывучаліся палітычныя навукі. Пасля пераезду ў Вільню ў адукацыі ў сферы палітычных навук у розны час прымалі ўдзел, узначальвалі і курыравалі паліталагічныя праграмы Святлана Навумава, Анатоль Круглашоў, Андрэй Казакевіч, Віктар Марціновіч і Андрэй Сцяпанаў.

У цяперашні час у межах Дэпартамента сацыяльных навук ЕГУ адкрытыя дзве паліталагічныя праграмы. На бакалаўрскім узроўні ўниверсітэт прапануе праграму «Сусветная палітыка і эканоміка» сталай і працяглай формаў навучання (якая стала пераемніцай ранейшай праграмы «Паліталогія і еўрапейскія даследаванні»). Гэта праграма міждысцыплінарнай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне палітычных і эканамічных навук. Праграма была створана і ажыццяўляецца ў супрацоўніцтве з Універсітэтам Вітаўта Вялікага ў Коўне (Літва). Яна рыхтуе палітолагаў і прафесійных аналітыкаў, здольных кам-петэнтна тлумачыць і аналізаваць, параўноўваць і ацэньваць, тэарэтычна апісваць і мадэляваць эканамічныя і па-

літычныя працэсы ў міжнародным і рэгіянальным кантэкстах. Выпускнікі праграмы «Сусветная палітыка і эканоміка» атрымліваюць ступень бакалаўра сацыяльных навук. Навучальны працэс на праграме сбалансаваны паміж паліталагічнымі і эканамічнымі дысцыплінамі.

На магістарскім узроўні мы прапануем паліталагічную праграму «Публічная палітыка». Мэта магістарскай праграмы – падрыхтоўка спецыялістаў у галіне дзяржаўнага кіравання, менеджменту ў сферы грамадзянскай супольнасці, а таксама для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці ў міжнародных і нацыянальных грамадскіх арганізацыях. Праграма была распрацавана сумесна з факультэтам публічнага адміністравання Лейдэнскага ўніверсітэта (Нідэрланды) і Нідэрландскім інстытутам дзяржаўнага кіравання ROI. Выпускнікі праграмы атрымліваюць ступень магістра сацыяльных навук.

Навучанне на бакалаўрскай сталай (дзённай) форме навучання складае 4 гады, на бакалаўрскай працяглай (дыстанцыйнай) форме – 5 гадоў. Тэрмін навучання на магістарскіх праграмах - 1,5 гады.

У асноўны педагагічны склад паліталагічных праграм ўваходзяць: прафесарка Таццяна Шчытцова; прафесар-эмерыт, кандыдат філасофскіх навук Рыгор Мінянкоў; дацэнт, PhD Андрэй Сцяпанаў; лектарка, PhD Таццяна Чуліцкая і лектар, PhD Уладзіслаў Іваноў. Сярод запрошаных выкладнікаў дэпартамента прафесар Вячаслаў Пазняк, прафесар, кандыдат эканамічных навук Аляксандр Кавалёў, экспертка SYMPA/BIPART Іна Рамашэўская.

За дзейнасцю паліталагічных праграм можна сачыць на афіцыйнай вэб-старонцы ЕГУ: http://be.ehu.lt/

# ФОНД КОНРАДА АДЭНАЎЭРА, ПРАДСТАЎНІЦТВА ПА БЕЛАРУСІ

Свабода, справядлівасць і салідарнасць з'яўляюцца галоўнымі прынцыпамі, якія ляжаць у аснове працы Фонда Конрада Адэнаўэра (ФКА). ФКА – гэта палітычны фонд, набліжаны да Хрысціянска-дэмакратычнага саюзу Германіі (ХДС). У межах еўрапейскага і міжнароднага супрацоўніцтва мы прыкладаем усе намаганні, каб людзі атрымалі магчымасць жыць і развівацца ва ўмовах свабоды і годнасці. Арыентуючыся на гэтыя каштоўнасці, мы робім свой унёсак у тое, каб Германія адпавядала сваёй адказнай ролі ў свеце. Мы заахвочваем людзей фарміраваць будучыню, абапіраючыся на гэтыя каштоўнасці. Праз больш як 80 офісаў за мяжой і праекты ў больш як 100 краінах мы робім унікальны ўнёсак у развіццё дэмакратыі, прававой дзяржавы і сацыяльнай рынкавай эканомікі. Для таго, каб садзейнічаць умацаванню міру і свабоды, мы падтрымліваем пастаянны дыялог на нацыянальным і міжнародным узроўнях, а таксама абмен паміж культурамі і рэлігіямі.

Самым галоўным у нашай працы з'яўляецца асоба чалавека, са сваімі адметнымі вартасцямі, са сваімі правамі і абавязкамі. Развіваючы ўстойлівую эканамічную дзейнасць, мы кіруемся перакананнем, што менавіта чалавек з'яўляецца пунктам адліку ў намаганнях па забеспячэнні сацыяльнай справядлівасці і дэмакратычнай волі. Аб'ядноўваючы людзей, якія прымаюць на сябе адказнасць у грамадстве, мы развіваем актыўныя сеткі кантактаў у палітычнай і эканамічнай сферах, а таксама ў самім грамадстве. Дзякуючы нашым палітычным ведам і ноу-хау, мы дапамагаем фарміраваць працэс глабалізацыі ў больш сацыяльна справядлівым, экалагічна ўстойлівым і эканамічна эфектыўным кірунку. Мы супрацоўнічаем з дзяржаўнымі ўстановамі, палітычнымі партыямі, грамадскімі арганізацыямі і выбранымі элітамі, ствараем трывалыя партнёрскія сувязі. У прыватнасці, мы імкнемся актывізаваць палітычнае супрацоўніцтва на нацыянальным і міжнародным узроўнях на аснове нашых каштоўнасцяў і мэтаў. Разам з нашымі партнёрамі мы робім унёсак у стварэнне міжнароднага парадку, які дазваляе кожнай краіне развівацца ва ўмовах свабоды і несці за гэта адказнасць.

У цяперашні час Беларускае Прадстаўніцтва Фонда Конрада Адэнаўэра знаходзіцца ў Вільні (Літва). Асноўнай задачай дзейнасці ФКА ў дачыненні да Беларусі з'яўляецца падтрымка тых сілаў, якія працуюць дзеля стварэння свабоднай, дэмакратычнай і пра-

вавой краіны, якая зойме сваё месца ў еўрапейскай супольнасці дзяржаў. З гэтай мэтай Фонд арганізуе адукацыйныя мерапрыемствы і кансультацыі, дыялогі і інфармацыйныя праграмы ў суседніх краінах, у Германіі і ў Бруселі.

Прадстаўніцтва ФКА па Беларусі ў Інтэрнэце:
http://kas.de/belarus
http://www.facebook.com/kasbelarus

ЗБОРНІК ПРАЦ

ВЫПУСКНІКОЎ-ПАЛІТОЛАГАЎ ЕГУ

# ПАЛІТЫКА І ГРАМАДСТВА Ў БЕЛАРУСІ

ГОД 2018

(ВЫПУСК 3)

**Барышнікаў Георгій**
КАРЭЛЯЦЫЯ ПАМІЖ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМІ ЗМЕННЫМІ І КОЛЬКАСЦЮ ПРАТЭСТАЎ НА БЕЛАРУСІ

**Гайдук Вольга**
РЭАЛІЗАЦЫЯ ПАЛІТЫКІ ПАМЯЦІ ПРАЗ СІСТЭМУ АДУКАЦЫІ Ў ПЕРАХОДНЫ ПЕРЫЯД У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ (1991 – 2001)

**Кацупалава Марыя**
РЭПРАДУКАВАННЕ ПРАСТОРЫ ГВАЛТУ Ў ДЫСКУРСЕ РАСЕЙСКІХ МЕДЫЯЎ ПРА ЗНЕШНЮЮ ПАЛІТЫКУ АДНОСНА УКРАІНЫ (2014-2017)

**Прыходзька Вераніка**
АНАЛІЗ СІСТЭМЫ АБАВЯЗКОВАГА ПРАФЕСІЙНАГА РАЗМЕРКАВАННЯ ЯК ІНСТРУМЕНТ РЭГУЛЯВАННЯ РЫНКУ ПРАЦЫ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

**Шапуцька Таццяна**
АНАЛІЗ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ІНСТЫТУТАЎ НА ПРЫКЛАДЗЕ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У 2006-2016 ГГ.


ЄHU
Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт

KONRAD ADENAUER STIFTUNG